—Людзьмі звацца!
Янка Купала

ЛіМ

ГАЗЕТА ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БЕЛАРУСІ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ПЯТНІЦА
9
КАСТРЫЧНІКА
1992 г.
№ 41 (3659)

ВЫХОДЗІЦЬ
з 1932 г.

КОШТ — 50 кап.
(Па падпісцы — 10 кап.)

«АДРАДЖЭННЕ — СТРАТЭГІЧНАЯ МЭТА АПАЗІЦЫІ»

Алег ТРУСАЎ: «Беларуская дзяржава застаецца антыбеларускай па стаўленні да нацыянальнай культуры і духоўнага Адраджэння беларускай нацыі».

СТАРОНКІ 5, 12

ЧАКАЕЦЦА ЎЗЛЁТ?

Яўген БЯЛАСІН: «Пытанне аб вартасцях літаратуры і літаратуразнаўства для беларусаў, на жаль, заўсёды было пытаннем палітычным».

СТАРОНКА 7

ПАЧУЦЦІ ПАД ЗАБАРОНАЙ

«Імперыя пачуццяў» на беларускім экране.

СТАРОНКІ 10—11

НОВАЯ СТАРАЯ СПРАВА

Гутарка з мастацкім кіраўніком «Белвідэацэнтра» Юрыем ЦВЯТКОВЫМ.

СТАРОНКІ 10—11

РАССТРЭЛ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

Да 100-годдзя з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры. Новыя факты і дакументы.

СТАРОНКІ 14—15

Гэты твор — мемарыяльную дошку ў гонар Францішка Скарыны — у хуткім часе пабачаць італьянцы. Яна будзе ўстаноўлена ў Падуі.
(Пра выставу «Жыве Беларусь» чытайце ў наступным нумары).

З ПОШТЫ ТЫДНЯ

Дастойна, на дзяржаўным узроўні

Днямі ў рэдакцыю прыйшоў ліст з Масквы ад сяброў Таварыства беларускай культуры імя Францішка Скарыны з копіяй звароту да Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслава Шушкевіча. Праблемы, якія ўздымаюцца ў ім, надзвычай надзённыя і тычацца не толькі «ЛіМа», але і ўсяго беларускамоўнага друку. Таму мы і вырашылі надрукаваць яго.

Шаноўны Станіслаў Станіслававіч!

Чацвёрты год існуе ў Маскве Таварыства беларускай культуры і ўвесь гэты час змагаецца за пашырэнне кола чытачоў беларускамоўнага друку, бо гэта ёсць адной са статутных мэтаў таварыства. Таму зразумела, якой непрыемнай неспадзяванкай сталася для нас сумная навіна пра немагчымасць падпіскі на галоўныя для нас выданні: «ЛіМ», «Наша слова», «Спадчына» і іншыя з гэтага шэрагу.

У звязку з тым па нашай просьбе Камісія па адукацыі, культуры і ахове гістарычнай спадчыны звярнулася да Міністэрства інфармацыі РБ з просьбай уладкаваць падпіску на беларускамоўны друк па-за межамі Беларусі. Адказ першага намесніка міністра С. А. Нічыпаровіча цытуем:

«Як і раней, беларускія выданні прадстаўлены ў цэнтральным расійскім каталозе, асобнікі якога ёсць на падпісных пунктах і ў паштовых аддзяленнях. Усе навацыі зводзяцца да таго, што зараз падпіску прымаюць не больш чым на 6 месяцаў».

Па-першае, гэта няпраўда. Калі б паважаны намеснік міністра пазірнуў бы ў каталог перад тым, як падпісаць ліст, ён мог бы пераканацца, што чыста беларускамоўныя выданні зніклі з каталога (апроч «Звязды», «Вожыка» і «Беларусі»). Гэта ўсё ж навацыя і нямалаважная.

Па-другое. Тыя беларускія (па месцы выдання, а не па мове і зместу) выданні, што трапілі ў каталог, адлюстроўваюць пераважна камуністычныя ці стараімперскія погляды. Такім чынам, можна меркаваць, што Міністэрства інфармацыі выступае ў якасці прамога нашчадка былога ідэалагічнага аддзела былога ЦК КПБ, хаця яно павінна знаёміць замежжа са ўсім спектрам жыцця і мыслі рэспублікі, а не прапагандаваць любыя яму палітычныя пазіцыі.

Па-трэцяе. Такі адказ варты не дзяржаўнага дзеяча, заклапочанага лёсам суайчыннікаў за мяжой і паўнейшым выкарыстаннем іх патэнцыялу, але хутчэй уласцівы дробнаму бюракрату самага тандэтнага ўзроўню, бо не закранае сутнасці праблемы, а выконвае адну мэту: «закрыць вопрос».

Пытаннем падпіскі заклапочаны цяпер не толькі «маскоўскія» беларусы дый увогуле не толькі беларусы. Гэта пытанне тычыцца шырокага кола людзей у краінах СНД і вырашаць яго трэба дастойна, на дзяржаўным узроўні. Таму мы ўзялі смеласць звярнуцца да Вас з просьбай спрыяць рашэнню гэтай праблемы беларускім урадам у магчыма карацейшы тэрмін.

Просім прабачэння за клопат.

З нязменнай павагай,
ад імя сходу актыву таварыства

старшыня рады таварыства
А. ДРАЯНКОЎ.

Кола Дзён

Гэтая выбарка «Кола» супадае з першым кастрычніцкім тыднем. Кастрычнік ужо надышоў, і неяк адначасна пахаладала, пасумнела — як знадворку, гэтак і ў душы... Але гэта толькі сезонныя настроі — ім «усе ўзросты падуладны». Не зважаючы на восеньскія, тужлівыя матывы канечнасці ўсяго зямнога, мы ўсё-ткі стойваем надзею на нейкую невядомую нам вышэйшую праўду зямнога быцця, на душэўны прытулак наперадзе—і гэткая надзея адпрэчвае апакаліпсічныя настроі, дапамагае зразумець іх адноснасць.

Цяперашняя восень як ніводная, бадай, з апошніх павольная і спакойная. Сышла памятная палітычная напружанасць, а заведзены ў беларусаў гаспадарчы лад не змяніўся — тыя ж бульбачка, капуста, яблыкі патрапляюць у засекі і сховы, ад клопатаў пра заўтрашні дзень нас не выслабаняе ніякая душэўная настальгія. І мы па-ранейшаму верым, што кудысь дойдзем.

1 КАСТРЫЧНІКА

Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь Яніна-Альжбета Смулэк уручыла даверчыя граматы Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. Шушкевічу. У 1991 годзе сп. Смулэк была назначана Генеральным консулам Рэспублікі Польшча ў Мінску, з чэрвеня г.г. выконвала функцыі Часовага Паверанага ў справах Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь.

Па распараджэнні Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага Банка ў прыгранічных з Літоўскай Рэспублікай і Украінай раёнах Беларусі зняты з абароту савецкі рубель. Усе віды плацяжоў у гэтых раёнах будуць ажыццяўляцца толькі разліковымі білетамі Беларускага Нацыянальнага Банка.

Пачала дзейнічаць пастанова ўрада аб новай — павышанай — аплаце камандзіровачных расходаў.

2 КАСТРЫЧНІКА

У Беларускім акадэмічным тэатры імя Я. Купалы адбылася святочная вечарына ўшанавання беларускіх спартсменаў — удзельнікаў Алімпійскіх гульняў у Барселоне. Алімпійцаў павіншаваў Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. Шушкевіч, які ўручыў таксама падарункі. Артысты паказалі спартсменам спектакль «Паўлінка». Цікава, аднак, колькі будзе доўжыцца ўшаноўванне нашых алімпійцаў, — ці слушней было зрабіць адну вечарыну, але павіншаваць сапраўды шчыра і салідна, уручыць дзяржаўныя ўзнагароды Рэспублікі Беларусь і да т.п. Медалёў і ордэнаў мы пакуль не маем, а без іх як дзяржава можа адзначыць подзвігі сваіх грамадзян?

У Гародні адбыўся мітынг, арганізаваны гарадской радай БНФ «Адраджэнне». Удзельнікі мітынгу выказаліся на карысць усенароднага рэферэндуму па пытанні адстаўкі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь цяперашняга складу.

Прэм'ер-міністр Украіны В. Фокін падаў у адстаўку.

3 КАСТРЫЧНІКА

Лідэры БНФ пабывалі ў Лідзе, дзе сустракаліся з жыхарамі горада, працоўнымі, інтэлігенцыяй, — выкладаючы палітычную праграму фронту, агітуючы за правядзенне рэферэндуму.

Стала вядома аб адмове кіраўніцтва Белдзяржтэлерадыёкампаніі і Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь у прадастаўленні гадзін тэле- і радыёэфіру парламенцкай апазіцыі і супольным з ёю палітычным партыям.

4 КАСТРЫЧНІКА

Адбылася канферэнцыя Лігі правоў чалавека Беларусі, на якой разглядаўся стан дэмакратыі, ушанавання правоў чалавека ў рэспубліцы.

5 КАСТРЫЧНІКА

Даверчыя граматы Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. Шушкевічу ўручыў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Каралеўства Швецыя ў Рэспубліцы Беларусь Карл-Ота Эр'ян Бернер. Швецыя, нагадаем, адной з першых заходніх краін прызнала незалежнасць Беларусі.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. Шушкевіч прыняў Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла ЗША ў Рэспубліцы Беларусь Дэвіда Суорца. Абмяркоўвалася развіццё беларуска-амерыканскіх сувязей.

6 КАСТРЫЧНІКА

Прафсаюзы рэспублікі правялі Дзень абароны беспрацоўных людзей. Раней, як вядома, праводзіўся дзень пажылых людзей. Прапагандысцкая функцыя гэтых «дзён» відавочная.

7 КАСТРЫЧНІКА

Пачаліся дні Швецыі ў Беларусі. Дні праводзяць сумесна Гандлёва-прамысловая палата Рэспублікі Беларусь і гандлёвы аддзел пасольства Швецыі ў Маскве і стакгольмскі банк «Нордбанкен». У праграме дзён выстаўкі шведскіх тавараў, экспазіцыя, прысвечаная А. Нобелю, дэманстрацыя шведскіх кінафільмаў.

P. S. На працягу мінулага тыдня ў рэспубліцы адбыліся дзве аварыі. Адна — на Віцебскім станкабудаўнічым заводзе імя Камінтэрна, дзе расплавілася абалонка кантэйнера з радыеактыўным матэрыялам. (Пра забруджванне прадпрыемства і апраменьванне рабочых звесткі супярэчлівыя). Другая аварыя ці, дакладней сказаць, дыверсія адбылася ў Мастах, на аб'яднанні «Мастадрэў». Яе здзейсніў былы рабочы прадпрыемства, які прабраўся да ёмістасцей і выпусціў у Нёман каля 180 тон мазуту. Выпадак беспрэцэдэнтны. Чарговае экалагічнае бедства?

ЗА АКІЯНАМ, СЯРОД СВАІХ

5—7 верасня ў Нью-Брансвіку (штат Нью-Джэрсі) адбылася 20-я штодвухгадовая сустрэча беларусаў Паўночнай Амерыкі. На ёй было больш як 300 чалавек. Былі сёлета на сустрэчы і госці з Рэспублікі Беларусь. Афіцыйная дэлегацыя БНФ «Адраджэнне» мела запросіны ад Беларуска-Амерыканскага Задзіночання (БАЗА). У складзе дэлегацыі былі В. Трыгубовіч, старшыня камісіі БНФ па знешніх сувязях і народны дэпутат Беларусі В. Голубеў. Усе выдаткі дэлегацыі БНФ (авіябілеты, гатэлі і г. д.) былі аплачаны арганізатарамі сустрэчы. Прывітанне амерыканскім беларусам даслаў Прэзідэнт ЗША Джордж Буш і губернатар штата Нью-Джэрсі Джым Флёрыё.

З просьбай расказаць аб сустрэчы наш карэспандэнт звярнуўся да Валянціны ТРЫГУБОВІЧ.

— Валянціна Андрэеўна, якія вашы ўражанні ад Амерыкі пасля Беларусі і ад Беларусі пасля Амерыкі?

— У Злучаных Штатах і Канадзе асабіста я не адчувала псіхалагічнага дыскамфорту, бо мы былі ў беларускім асяроддзі. Што ж датычыць сустрэч з афіцыйнымі асобамі, дык і там гаворка ішла пра беларускія справы, і побач з намі былі людзі з беларускай дыяспары, дзякуючы якім гэтыя сустрэчы і перамовы мелі адбыцца. Коратка кажучы, мы былі сярод сваіх і рабілі тую ж справу, што робім у Менску. Ну, а калі гаварыць пра іншае... Зразумела, што пасля нашай побытавай неўладкаванасці Амерыка ўражвае. Але толькі ў першы дзень. Да добрага прызвычайваешся вельмі хутка і пачынаеш успрымаць як норму. З Менска да Нью-Йорка мы ляцелі самалётам «Люфтгензы». Білет узялі без усялякіх праблем, без чаргі, без папярэдняга запісу. У самалёце спачатку нас віталі панямецку, а потым па-беларуску. Прыемна было чуць з дынаміка запіс голасу Ларысы Верас з радыё «Свабода». Чаму такога няма ў самалётах «Аэрафлота»?

Цяпер наконт вяртання на радзіму... Натое мы і людзі, каб усё разумець. Амерыканскі лад жыцця прунтуецца на рацыянальнай эканоміцы, на здаровым сэнсе. Пра нашу дзяржаву пакуль гэтага сказаць нельга. Таму мы і маем тое, што ёсць.

Выступае Генадзь БУРАЎКІН.

Сустрэча ў аэрапорце.

— Чым у шэрагу традыцыйных сустрэч беларусаў Паўночнай Амерыкі была адметная селетняя, 20-я?

— Тэмаю «Шляхі да незалежнасці Беларусі». Папярэдняя мела, скажам так, культурна-асветніцкі ўхіл. Сёлета ж было востра пастаўлена менавіта палітычнае пытанне. На сутнасці, у цэнтры сустрэчы была трохбаковая дыскусія. Акрамя беларусаў ЗША і Канады, у ёй браў удзел афіцыйныя прадстаўнікі урада Рэспублікі Беларусь спадар міністр Краўчанка і суправаджаючыя яго асобы і дэлегацыя Беларускага народнага фронту, улада і апазіцыя.

— Ці стала 20-я сустрэча з гэтай прычыны падобнаю на пасяджэнне Вярхоўнага Савета Беларусі?

— Дыскусія ўрада і апазіцыі на гэтай сустрэчы давала магчымасць не толькі беларусам Амерыкі, але амерыканцам увогуле, у тым ліку і асобам, адказным за знешнюю палітыку краіны, убачыць на свае вочы, што адбываецца зараз на Беларусі. Скажам, прадстаўнік урада сцвярджае, нібыта ў Рэспубліцы Беларусь сямімільнымі крокамі ідзе дэмакратызацыя, што два гады назад Беларусь была пусткай — а цяпер яна квітнеючы сад, і ўсё гэта заслуга сённяшняга парламента і ўрада. Услед за ім выступае прадстаўнік БНФ і прыводзіць неабвержныя факты адваротнага характару (мы ж ведаем, якая ў нас дэмакратыя і як квітнее Беларусь...) Прычым, інфармацыя апошняга супадае з той, якую Дзяржаўны дэпартамент атрымлівае па дыпламатычных каналах.

— Ці не ўзнікала на сустрэчы пытанне аб рэферэндуме?

— Гэта пытанне ўздымалася не толькі на сустрэчы. Дзе б мы ні з'яўляліся, гаворка адразу заходзіла аб рэферэндуме. Дзярждэпартамент ЗША, міністэрства замежных спраў Канады, дабрачынныя фонды гэтых краін, чыя дзейнасць можа быць скіравана на Беларусь — усе нібыта ў адзін голас: «У якім стане пытанне з рэферэндумам?» Для іх гэта свайго роду лакмусавая папера дэмакратызацыі на Беларусі. Некаторыя рэаліі нашага палітычнага жыцця, у прыватнасці тое, што ў гэты напружаны час Вярхоўны Савет РБ зрабіў сабе канікулы на паўгода, у ЗША і Канадзе проста' не разумеюць. Ці, дакладней кажучы,

ПАМЯРКУЕМ

СУМНА, АЛЕ ФАКТ...

Давайце ўявім наступную сітуацыю: мы як народ пажадалі культурна і моўна ізалявацца. Гэта значыць — спяваць толькі свае песні, глядзець выключна беларускія перадачы, спектаклі, чытаць творы і газеты адно на беларускай мове... Цяжка ўявіць, ці не праўда? Між тым ёсць народы-інтраверты, якія задавальняюцца ў асноўным уласнай культурнай і мастацкай прадукцыяй і нікольскі ад гэтага не церпяць і не камплексуюць. Для нас жа такое немагчыма — з прычыны гістарычна абумоўленай інтэграванасці рускай культуры ў наша жыццё, а таксама ў сілу адноснай маладосці нашага этнасу.

Аднак жа і куток займаць ва ўласнай хаце таксама нягожа. Рэальным крокам для аднаўлення самапавагі беларусаў сталася тое, што праграма Беларускага радыё цалкам заняла асноўны, «кропачны» канал. Праз нейкі час і тэлебачанне пацясніла з больш магутнага ды прэстыжнага канала Астанкінскую праграму. Здавалася б, справядлівасць перамагла і можна радавацца. Вось толькі ШТО нашаму БТ паказваць, каб мець сваё аблічча і заваяваць прыхільнасць тутэйшых людзей?

Пакуль што яно ідзе па лініі найменшага супраціўлення: пры адсутнасці нацыянальнага кінематографа і такой неабходнай анімацыі, штодзень на экранах — два, тры, а то і чатыры мастацкія фільмы. Часцей, чым у расійскіх праграмах, дэманструецца прадукцыя дакументальная, якой у студыях былога СССР накляпана, мабыць, на сто гадоў наперад. Разам з паўторамі, ды пры той акалічнасці, што нашы тэлевізійнікі позна спяць, на рэдакцыі ўнушальнага гмаха на Макаёнка прыпадае не так многа эфірнага часу. Ужо ж яго грэх было б не выкарыстаць з толкам. І што ж мы бачым, уключаючы нацыянальны канал (акрамя кіно, зразумела)? Самы значны, інфармацыйны блок — з выразным душком афіцыёзу (спроба іншадумства паспяхова падаўлена), з пільнай увагай да насельнікаў былога будынка ЦК. Што ж да іншых перадач, то мушу канстатаваць неабавязковасць зместу і невыразнасць формы большасці з іх. Лепш з публіцыстыкай, асабліва адраджэнскага плана, затое горш з мастацкасцю. Мала цэняцца натуральнасць, жывая дэталь, імправізацыя. Не хапае гутарак з цікавымі людзьмі, выяўляцца ў поўную меру дазволена толькі палітыкам. Запомнілася інтэрв'ю перадачы «Тры кіты» — з былым партбосам Гродзеншчыны Сямёнавым. Поўнае ўражанне, што таварыш нядаўна выйшаў з анабіёзу або дваццаць год праспаў летаргічным сном: «Партыя... партыя... партыя...». А на выгляд — нармальны чалавек. Каментарыя стваральнікаў мы, аднак, не дачакаліся. Вось і думай, якую мэту ставіла перад сабой журналістка: ці то паказаць, якія яны ёсць (як быццам мы не ведаем), ці то спагаду выклікаць да бедненькіх і няшчасненькіх, ці то проста для экзотыкі, ці

Прывітанне Прэзідэнта ЗША

Я рады вітаць усіх, што з'ехаліся ў Нью-Брансвік на 20-ю штодвухгадовую Сустрэчу беларусаў Паўночнай Амерыкі. Асабліва вітаю вашых гасцей з-за мяжы.

За два гады ад часу вашае апошняе сустрэчы карта свету была дослоўна перарысаваная ў выніку таго, што свет перажывае адраджэнне свабоды й дэмакратыі. У снежні летась Злучаныя Штаты з пачуццём гонару прызналі незалежнасць нававызваленай Беларусі ды заклалі базу для пашырэння двухбаковага і шматбаковага супрацоўніцтва. У часе, калі ваша ўвага засяроджаная на светлай будучыні, што чакае вашых сяброў і сваякоў у Беларусі, я ўрачыста абяцаю маё поўнае й працяглае падтрыманне ў іхніх намаганнях устанавіць стабільны, дэмакратычны ўрад ды арыентаваную на вольны рынак эканоміку, і я далучаю свой голас да вашых малітваў за мір у цэлым рэгіёне.

Як я сказаў Прэзідэнту Шушкевічу, амерыканцы падзяляюць адданасць свабодзе і справядлівасці, якую прадэманстраваў мужны народ Беларусі. Мы таксама разумеем тыя шматлікія цяжкасці, што стаяць перад ім і якія трэба перамагчы, каб выйсці з цыкла стагнацыі й заняпаду як выніку дзесяцігоддзяў камуністычнага панавання. Цешачыся дабротамі свабоды разам з даробытам, што стаўся вынікам прыватнага прадпрымальніцтва і вольнага рынку, мы гатовыя падтрымваць нашых беларускіх сяброў і дапамагаць ім у іхнім гістарычным заданні. Я вітаю гатовасць Прэзідэнта Шушкевіча супрацоўнічаць у намаганні выканаць міжнародныя пагадненні аб зніжэнні ўзроўню ядзерных узораенняў і тэхнічнай дапамозе Беларусі.

Барбара далучаецца да маіх найлепшых пажаданняў вам пленнай і прыемнай сустрэчы.

Джордж БУШ.

3 верасня 1992 г.
Белы дом.

добра разумеюць і робяць з гэтага свае высновы адносна кантактаў з гэтым урадам і гэтым Вярхоўным Саветам. З боку блізкіх да урада Беларусі колаў выказваліся пажаданні, каб урад БНР на чужыне афіцыйна перадаў свае паўнамоцтвы сённяшняму ўраду Беларусі, прызнаўшы такім чынам ягоную легітымнасць. (Як прызналі легітымнасць урадаў Польшчы і Украіны эміграцкія арганізацыі палякаў і украінцаў). Але на сустрэчы было заяўлена, што гэта можна будзе абмяркоўваць толькі пасля рэферэндуму і новых выбараў.

— Сустрэча доўжылася 3 дні, вы ж былі ў Амерыцы два тыдні. Чым быў заняты астатні час?

— Я ўжо гаварыла пра кантакты з афіцыйнымі ўстановамі і дабрачыннымі арганізацыямі. Гэтыя два тыдні былі вельмі напружанымі. Культурная праграма была зведзена да мінімуму. Злучаныя Штаты і Канаду мы, дэлегацыя БНФ, бачылі ў асноўным з акна цягніка ці машыны.

— Што вы рабілі 8 верасня, калі на плошчы Незалежнасці праходзіла Свята беларускай вайсковай славы?

— У той дзень мы былі ў Атаве, у гасцінным доме Іванкі і Янкі Сурвілаў, мелі гутаркі ў міністэрстве замежных спраў Канады. Нашы субяседнікі ўжо ведалі аб тым, што мае адбыцца, фактычна адбываецца ў Менску (на Захадзе пільна сочаць за палітычным жыццём на Усходзе Еўропы), па іх просьбе мы толькі дэталізавалі іх веды аб ваенна-палітычнай сітуацыі, што склалася на Беларусі, аб Беларускім згуртаванні вайскоўцаў, аб значэнні сімвалічнай прысягі на плошчы Незалежнасці, шмат аб чым іншым. Але ў гэты дзень нам вельмі хацелася быць у Менску. Уяўна мы і былі на плошчы Незалежнасці, па сваіх гадзінніках адзначалі, што там адбываецца. Бо сцэнарый нам быў вядомы.

— Ці можна гаварыць пра нейкія канкрэтныя вынікі вашай паездкі ў Амерыку?

— Амерыканцы людзі звышдзелавыя. Дзве дабрачынныя арганізацыі, якія мы наведалі ў Нью-Йорку і Вашынгтоне, прыслалі ўжо сваіх прадстаўнікоў у Менск для працягу перамоваў.

— І апошняе: што найболей уразіла вас у Амерыцы?

— Мабыць, тое, што, хай не падасца каму-небудзь гэта дзіўным, амерыканцы нам зайздросцяць. Мы сустракаліся з людзьмі палітычна актыўнымі, і менавіта яны абсалютна шчыра гаварылі нам: «Як цудоўна, што сёння вы мяняеце жыццё, вы робіце гісторыю — вы жывяце!» Можа, у гэтым ёсць пэўная рамантызацыя нашай штодзённай працы, але ў прынцыпе я падзяляю такую думку.

Гутарыў В. БОГУШ.

У Кітаі ёсць усё

Упершыню ў нашай рэспубліцы адкрылася выстаўка-продаж тавараў народнага ўжытку з Кітая. На ёй у шырокім асартыменце прадстаўлены прадукты харчавання, цацкі, бытавая электроніка, вырабы з футра і скуры.

Пазнаёміцца з экспазіцыяй можна ў выставачнай зале Беларускага навукова-даследчага інстытута тэхнічнай інфармацыі.

Урачыстае адкрыццё. Фота БЕЛІНФАРМ.

БСДГ РЫХТУЕЦЦА ДА ВЫБАРАЎ

Як вядома, Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада цалкам падтрымлівае ідэю рэфэрэндуму аб роспуску цяперашняга складу Вярхоўнага Савета Беларусі і выбарах новага.

Як любая палітычная партыя, БСДГ не можа, натуральна, не думаць аб тым, як найбольш прадуктыўна ўдзельнічаць у будучай выбарчай кампаніі, каб заваяваць галасы выбаршчыкаў, правесці сваіх прадстаўнікоў у парламент.

Гэтыя пытанні абмяркоўваліся на тэарэтычна-практычным семінары «Сацыял-дэмакраты ў выбарчай кампаніі», які прайшоў у Мінску на мінулым тыдні. Запеўку зрабіў ва ўступным слове старшыня праўлення рады БСДГ Міхась Ткачоў, які даў разгорнуты аналіз дзейнасці партыі ў сучасны момант, акрэсліў яе стратэгію і тактыку ў выбарчай кампаніі.

У ажыўленым абмене думкамі аб удзеле БСДГ у будучых выбарах у Вярхоўны Савет рэспублікі прыняў удзел шэраг членаў Грамады з розных рэгіёнаў рэспублікі, якія падзяліліся вопытам правядзення папярэдніх выбараў у Саветы розных узроўняў, выказалі шэраг заўваг і прапаноў.

З цікавасцю ўдзельнікі семінара выслухалі выступленні гасцей — адказнага сакратара праўлення германскай сацыял-дэмакратычнай партыі зямлі Брандэнбург Марціна Горхайльта і прадстаўніка незалежнага фонду Эберта Іны Кірш, якія расказалі пра вопыт правядзення выбарчых кампаній нямецкімі сацыял-дэмакратамі.

М. З.

ДАСЯГНУТА ДАМОЎЛЕНАСЦЬ

30 верасня адбылася сустрэча Выканаўчых рад Беларускага згуртавання вайскоўцаў і Партыі народнай згоды. Падчас сустрэчы дасягнута дамоўленасць аб супрацоўніцтве паміж БЗВ і ПНЗ у распрацоўцы канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, заканадаўчай дзейнасці ў вайсковай галіне, барацьбе супраць карупцыі ў грамадстве і ў войску. Прадстаўнікі ПНЗ увайшлі ў створаны па ініцыятыве БЗВ камітэт «Вяртанне». На сустрэчы быў прыняты сумесны зварот да грамадскасці ў падтрымку дзяржаўнасці беларускай мовы, зацверджанай законам, а таксама супраць выкарыстання моўнага пытання ў палітычных мэтах.

А. КУЛЕШ,
старшыня прэс-цэнтра БЗВ,
падпалкоўнік.

З НАДЗЕЯЙ НА ПАРАЗУМЕННЕ

З 28 верасня па 1 кастрычніка ў старажытнай Гародні адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя «Царква і культура народаў Вялікага княства Літоўскага і Беларусі XIII—пачатку XX ст.» Зладзілі яе сумеснымі намаганнямі беларускі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі, аддзел культуры гарадзенскага гарвыканкама ды кафедра ўсеагульнай гісторыі універсітэта імя Янкі Купалы. На адкрыцці гасцей і удзельнікаў віталі афіцыйныя асобы, старшыні нацыянальна-культурных суполак і згуртаванняў. Усяго ж на ўдзел у канферэнцыі падалі заявы навукоўцы з васьмі краін свету: Беларусі, Летувы, Украіны, Швейцарыі, Вялікабрытаніі, Польшчы, Расіі, Японіі. Такое шырокае прадстаўніцтва робіцца прыемнай традыцыяй. Нагадаю, што сёлетняя канферэнцыя — ужо трэцяя па ліку ў горадзе над Нёманам. Так, у 1990 г. тут ладзіліся чытанні на тэму «Вітаўт Вялікі і яго эпоха», у 1991 г. — «Культура народаў ВКЛ і Беларусі». І вось чарговыя, адметнасцю якіх стала запрашэнне даследчыкаў з багаслоўскіх колаў. Канферэнцыя прайшла пад знакам навукова-культурнага дыялога, замірэння розных канфесій. У першы дзень прадаваліся зборнікі матэрыялаў выступаў з серыі «Наш радавод». На жаль, выдадзены яны даволі абмежаваным накладам (250 асобнікаў), таму адразу зрабіліся сапраўднай бібліяграфічнай рэдкасцю. Прыемная акалічнасць: асноўнымі фундатарамі мерапрыемства сталіся новыя камерцыйныя структуры.

Шлях у будучае ляжыць праз асэнсаванне гістарычнага мінулага — бадай, галоўная выснова чатырохдзённых абмеркаванняў. У ім, гэтым будучым, павінна знайсціся месца для кожнага чалавека. Застаецца спадзявацца, што паразуменне паміж людзьмі розных нацыянальнасцей і веравызнанняў будзе паглыбляцца і надалей.

У. ХІЛЬМАНОВІЧ.
г. Гародня.

яшчэ для чаго... Такая неакрэсленасць пазіцыі — з-за немагчымасці выказацца напрамую, ведаючы сімпатыі ўласнага начальства, ці з-за адсутнасці гэтай пазіцыі?

Доўга яшчэ будзе адгукацца і ранейшая нацэленасць на так званы Цэнтр. Пяцідзесяцімільённая Украіна, разам з іншымі дзяржавамі-суседкамі, застаецца для нас неадкрытым культурным мацерыком. Творчыя сувязі з далёкім замежжам увогуле пакуль праблематычныя, што не можа не адбівацца на папулярнасці БТ. Яму з яго сродкамі і яго кадрамі толькі і застаецца быць пасіўным спажыўцом ды пераймальнікам створанага недзе. І галоўнае, відаць, не тэхнічнае забеспячэнне (хоць і гэта фактар істотны), а прафесійны ўзровень рэдактараў і рэжысёраў, іх інтэлектуальны і духоўны патэнцыял. Што да першых, то журфак БДУ ужо дваццаць год топчацца на месцы і кадры куе выключна для эпохі развітога сацыялізму.

У Беларускага радыё свае праблемы і свае штампы. Саладжава-задушэўны тон чытальнікаў. Пісклявыя галасы травесці ў дзіцячых перадачах (дзе яны бачылі такіх экзальтаваных дзяцей?!). Няшчадная эксплуатацыя колісь знойдзенай формы — як у выпадку з «Жадаю вам...», дзе ад выпуска да выпуска, а іх мо семсот, мяняюцца адно прозвішчы юбіляраў. І самае сумнае: нават не кансерватыўнасць — закансерваванасць светапогляду ветэранаў дома на Чырвонай. Апошняе, да прыкладу, яскрава адчуваецца ў правінцыйна-тэндэнцыйных перадачах радыёстанцыі з гучнай назвай «Сталіца».

Ёсць, аддадзім належнае, і зрухі да лепшага. Апошнім часам наладжана цесная зваротная сувязь са слухачамі. Звыклымі сталі прамыя лініі, тэлефонныя апытванні і інш., паболела нестандартных каментарыяў, цікава працуе маладзёжнае вяшчанне.

Адно са слабых месцаў як радыё, так і тэлебачання — эстрада. Свая, як вядома, у недаразвітым стане. Пры ўсіх намаганнях музычных службаў цяжка і пакутліва прабіваецца моладзь на беларускую эстраду. Здаецца, некаторым даюцца званні ўжо за тое, што прабіліся. Выяўляцца ім няма на чым, ці што? Не лічыць жа «зоркай» тую самую Ліку, у якой самарэкламы на рубель, а самабытнасці на капейку. Ды яшчэ і мову беларускую крыўляе на замежны лад. І тут пажынаем плады застою, і ў эстрадзе. Бо калі твая кар'ера і нават лёс залежаць ад таго, спяваеш ты ці не песні Самага Уплывовага Кампазітара, то не да спеваў становіцца... Вось і круцяць нястомна старыя запісы «Песняроў» ды новыя — Еўдакімава. Добра яшчэ, што фальклорныя калектывы выручаюць!

Сярод рэдакцый радыё ўсё гэтак жа не мае сабе роўных мая «любімая» літаратурная. Падобна, што там паўштата не навучылася карыстацца магнітафонам — запісы найчасцей студыйныя, дыктарскія. А ўжо якія «пярліны» вылятаюць у эфір! «Яшчэ колькі прайшоўшы, сосны расступіліся перад ім». Альбо: «Схаваўшыся за цягнікам, фашысты былі знішчаны». Апошні сказ, між іншым, належыць пяру галоўнага рэдактара літдрамы М. Пацёмкіна (эфір 5.06. г. г.).

«Не па гэтаму шляху мы ідзём»,— вучыць нас нейкі невядомы аўтар. Другі ўсур'ёз даводзіць, што «Гарбачоў разбураў вёску, як мог». Трэці, штатны супрацоўнік, публічна зводзіць рахункі з ананімамі — «даносчыкамі і пасквілянтамі». А то збяруць пісьменнікаў, удзельнікаў мінулай вайны,— мабыць, для рэанімацыі ваенна-патрыятычнай тэмы, якая загадала доўга жыць. Прапаную новую форму аплаты: плаціць не за выхад у эфір, а за тое, каб хаця не выходзілі...

Заўважу, што кіраўнік радыёкампаніі народны дэпутат Б. Сушкевіч у жніўеньскім дыялогу чамусьці доўга разважаў пра непрафесійнасць былой тэлевізійнай «НІКІ» (дэманструючы пры тым ветлівае хамства ў адносінах да суразмоўніка). Усе крытычныя заўвагі ў адрас уласнага падраздзялення ён адмятаў, як кажуць, з парога. Хай бы лепей расказаў, як адбылася атэстацыя пры пераходзе з Дзяржтэлерадыё ў Тэлерадыёкампанію. Як вядома, супрацоўнікі паспяхова атэставалі саміх сябе, так што новае найменне пераходу ў новую якасць не азначае.

Не ведаю, мо і ёсць у прыродзе звышпатрыёты, якія, сцяўшы зубы, будуць спажываць бяздарную, затое беларускамоўную перадачу. Я асабіста да такіх не належу, таму даводзіцца пераключацца на іншыя каналы тэлебачання, а радыё проста выключаць. Такой, скажуць, бяды! Не хочаш — не глядзі і не слухай. Абыдземся. Аднак жа прызнаем той факт, што кнопкамі нашых «скрыняў» мы галасуем не проста за тую ці іншую праграму — за культуру галасуем, за мову. Абедзве культуры, наша і руская, дзейнічаюць на адной ментальнай прасторы. Пацясніць расейшчыну можна толькі ўзроўнем і якасцю, новымі ідэямі і новымі формамі, а не простай зменай каналаў ці абмежаваннем. Сродкі масавай інфармацыі так моцна ўплываюць на свядомасць, так прыкметна фарміруюць яе, што дзесятая, здавалася б, задача — заваяваць сэрца дзядзькі на канапе і цёткі ля пліты — выходзіць сёння ці не на першы план.

Донарамі назваў сваіх суайчыннікаў адзін з вядомых паэтаў Беларусі. Яно і слушна: колькі талентаў, розумаў, майстэрства аддалі найперш «старэйшаму брату». Затое па вялікім рахунку самі сталі рэцыпіентамі: без папіткі чужой духоўнасцю ўжо не можам уявіць свайго існавання. Сумна, але факт...

Г. К.

ЧАСОПІСЫ Ў 1993 ГОДЗЕ

З вераю ў Адраджэнне

На пытанні нашага карэспандэнта адказвае галоўны рэдактар часопіса «Полымя» Сяргей ЗАКОННІКАЎ

— Сяргей Іванавіч, калі ласка, пра асноўныя публікацыі будучага года...

— Як і заўсёды, «Полымя» будзе знаёміць чытачоў з лепшымі набыткамі сучаснае айчыннае літаратуры. Гэта новыя аповесці і раманы Васіля Быкава, Янкі Брыля, Віктара Казько, Анатоля Кудраўца, Віктара Карамазава. Свае паэтычныя творы часопісу прапануюць Максім Танк, Пімен Панчанка, Сяргей Грахоўскі, Алесь Звонак, Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Ніл Гілевіч, Васіль Зуёнак, Пятрусь Макаль, Данута Бічэль - Загнетава, Раіса Баравікова і многія маладзейшыя паэты. У палымянскай прозе і паэзіі выразна бачыцца ўдумлівае, глыбокае асэнсаванне гісторыі Бацькаўшчыны і народа, рэалій сённяшняга, надзвычай супярэчлівага, складанага і непрадказальнага ў сваім развіцці жыцця. Аднак, нягледзячы на цяперашні эканамічны, сацыяльны і духоўны рэзрух, старонкі твораў поўняцца веравю ў сапраўднае адраджэнне нашае незалежнае і суверэннае дзяржавы — Рэспублікі Беларусь.

— «Полымя» — гэта заўсёды спалучэнне сучаснага літаратурнага працэсу з адначасным позіркам у дзень учарашні. Наколькі ў гэтых адносінах будзе задаволена цікаўнасць чытачоў?

— Хачу зазначыць, што «Полымя» за апошнія гады зрабіла многае, каб далучыць нашых чытачоў да багатай духоўнай спадчыны беларускага народа. Пра тое, якую ўвагу мы надаём гэтай надзвычай важнай справе, сведчыць стварэнне ў рэдакцыі часопіса новага аддзела — гісторыі літаратуры і культуры. Ён рыхтуе да друку «Хроніку Быхаўца», нататкі Уладзіміра Арлова пра Полаччыну ад XVI стагоддзя і да нашых дзён. Шырока будзе прадстаўлена рубрыка «З літаратурнай спадчыны». Назаву толькі адно імя — Максім Гарэцкі. Невядомыя творы гэтага выдатнага пісьменніка, 100-годдзе з дня нараджэння якога адзначаецца ў 1993 годзе, «Скарбы жыцця», «Лявоніус Задумекус», «Кіпарысы», «Ашуканы палітрэдактар» з каментарыямі яго дачкі Галіны Максімаўны Гарэцкай змесцім у другім нумары «Полымя». Падпісчыкі і тыя, хто набудзе гэты нумар, змогуць прачытаць сапраўды таленавітую прозу, створаную рукою Майстра, насалодзяцца ягонаю непаўторнаю, жывою, сакавітаю моваю.

Спадзяёмся, што чытачы зацікавяцца дзённікамі вядомай дзяячкі нашае культуры Паўліны Мядзёлкі, а таксама пісьменнікаў Івана Шамякіна і Вячаслава Адамчыка.

У раздзеле крытыкі і літаратуразнаўства мяркуем не толькі аналізаваць сучасны літаратурны працэс, але і змяшчаць публікацыі, прысвечаныя праблемам адраджэння роднае мовы і культуры, матэрыялы ў дапамогу настаўнікам школ, гімназій і ліцэяў, выкладчыкам і студэнтам ВНУ. Гэта артыкулы Віктара Каваленкі — пра сучасную беларускую прозу, Уладзіміра Калесніка — аб беларускай літаратуры пра Вялікую Айчынную вайну, Уладзіміра Конана — «Кроў людская — не вадзіца» (філасофія, дзяржава, гістарычны працэс, літаратура), Ірыны Багдановіч — «На суровых крыжавых дарогах» (серыя публікацый пра трагічны лёс беларускіх пісьменнікаў у гады сталінскага тэрору), Алеся Яскевіча — «Хрысціянская мараль і працэсы развіцця беларускай літаратуры», Лідзіі Савік — пра літаратуру беларускага замежжа.

— Паколькі часопіс не толькі літаратурна - мастацкі, а і грамадска - палітычны, відаць, і ў далейшым мяркуецца друкаваць самыя розныя матэрыялы?

— «Полымя» заўсёды выходзіць на самыя балючыя праблемы нашага жыцця. Не выключэнне і наступны год. Апублікуем даследаванне «Дзяржаўнасць Беларусі і мова народа», цыкл матэрыялаў «Эканоміка Беларусі сёння і заўтра». Змесцім серыю публікацый пра экалагічную сітуацыю ў рэспубліцы, адна з якіх называецца так: «Ці ўратуе лес ад радыяцыі?» Усе матэрыялы такога накірунку пералічыць цяжка.

У заключэнне хачу сказаць, што той, хто выпіша часопіс на наступны год, не памыліцца ў сваім выбары. Хоць ведаю, што падпісацца на «Полымя», як гэта было і ў мінулым годзе, няпроста. Зноў па віне зрусіфікаваных чыноўнікаў высокага і ніжэйшага рангу, якія не зацікаўлены ў падтрымцы беларускамоўных выданняў і займаюцца ўвесь час сабатажам, часопіс не трапіў у каталог для дзяржаў СНД, згубілі мы і сотні падпісчыкаў у далёкім замежжы. Нават тут — у сваёй рэспубліцы — ставяцца перашкоды: у каталогах, якія дасылаліся аддзяленням сувязі, не была пастаўлена цана падпіскі. Пасля настойлівых патрабаванняў рэдакцыі ва ўсе аддзяленні сувязі пайшла дэпеша з папраўкаю. А таму, шаноўныя сябры, патрабуйце, каб паштовыя работнікі без усялякай цяганіны афармлялі падпіску на «Полымя». Цана яе на паўгоддзе — 60 рублёў. Такую суму можа вытрымаць любы сямейны бюджэт.

Інтэрв'ю браў
Алесь МАРЦІНОВІЧ.

ПАРАДОКС ПАД ЗНАКАМ АПТЫМІЗМУ

Агляд чытацкай пошты

Як жа лёгка зразумець іншым часам, што такое парадокс! Вось, для прыкладу, пошта «ЛіМа». Сотні лістоў, сотні людзей — як вынік, сотні пытанняў, спадзяванняў, падстаў для хваляванняў. Кожны ліст — новы свет, новыя тэмы і новыя жыццёвыя сітуацыі. І адначасова наша пошта — адзіны, так бы мовіць, калектыўны твор нашых чытачоў, аб'яднаны адной ідэяй, адной тэмай, адным сюжэтам. Пра што б ні пісалі нашыя карэспандэнты — яны пішуць пра Беларусь, пра яе турботы і боль, пра яе хваробы і недарэчнасці.

Папраўдзе, парадокс лімаўскай пошты — самы натуральны з парадоксаў. Бо ці знойдзеш яшчэ дзе-небудзь настолькі парадаксальную дзяржаву — беларускую па назве і небеларускую па духу, суверэнную згодна з дэкларацыяй і паслухмяную суседзям у сваёй палітыцы, з дзяржаўнай мовай, якую не паважае дзяржаўны чыноўнік?..

Ёсць такі анекдот.

Ехаў аднойчы на «Пантыяку» амерыканец. Не справіўся з кіраваннем, ды на павароце — бац! — у сасну. Сядзіць, бедалага, плача. Збегліся людзі:

— Чаго плачаш?

— Як жа мне не плакаць? Два месяцы на машыну збіраў — і на табе!..

Паспачувалі яму людзі.

Ехаў аднойчы на «Вольве» швед. Не справіўся з кіраваннем, ды на павароце — бац! — у сасну. Сядзіць, небарака, плача. Збегліся людзі:

— Чаго плачаш?

— Як жа мне не плакаць? Амаль год на машыну збіраў — і на табе!..

Шчыра паспачувалі яму людзі.

Ехаў аднойчы на «Запарожцы» саветыкус. Не справіўся з кіраваннем, ды на павароце — бац! — у сасну. Сядзіць, нябога, горкімі слязамі заліваецца. Збегліся людзі:

— Чаго плачаш?

— Як жа не плакаць? Усё жыццё на машыну збіраў — і на табе!..

— А навошта ты яе, такую дарагую, купляў?!

Ёсць у гэтым анекдоце горкая праўда — занадта цяжка нам усё даецца, каб потым штонебудзь страчваць. Занадта доўга мы ішлі да вяртання сваёй незалежнасці, сваёй дзяржаўнасці, занадта вялікай кроўю яна нам далася, занадта доўга жылі мы жаданнем «людзьмі звацца», каб сёння спакойна і з пакорлівасцю ўспрымаць тыя абразы, якія даводзіцца цярпець Беларусі і яе народу. І менавіта пра лёс нашай краіны і распавядае большая частка лімаўскай пошты.

Не могуць, для прыкладу, нашыя суайчыннікі за блізкімі і далёкімі межамі зразумець, з якой нагоды суверэнная рэспубліка пазбавіла іх магчымасці чытаць свой друк на роднай мове. Толькі «Звяздзе» з ласкі чыноўнікаў дазволена несці беларускае слова ў Маскву і Данецк, Сыктыўкар і Санкт-Пецярбург.

«ЛіМ» для мяне — адзіная сувязь з Радзімай, з роднай мовай. Але падпісацца на яго немагчыма, — скардзіцца навуковы супрацоўнік з Санкт-Пецярбурга Уладзімір Кернажыцкі. І пытаецца: — Як не страціць гэты адзіны сродак сувязі?»

«Як жа падпісацца на вас, калі ў каталозе гэтае выданне не значыцца?» (Мірон Радзівонаў, г. Сыктыўкар).

«На жаль, у каталозе выданняў, на якія можна падпісацца ў Расійскай Федэрацыі, «Літаратуры і мастацтва» я не знайшоў. Паспрабую падпісацца праз Беларускае таварыства, а як быць тым беларусам, якія жывуць у іншых гарадах Расіі?» (Ф. Іванцоў, г. Масква).

«Не ведаю, колькі беларусаў жыве на Украіне, але добра памятаю, што згодна з апошнім перапісам у Данбасе больш за 80 тысяч маіх землякоў, беларусаў. Гэта не так і мала. Але выпісаць на наступны год «ЛіМ» не зможа ніхто — у каталозе беларускамоўных газет (акрамя «Звязды») не аказалася», — радкі з ліста нашага чытача з Данецка Фёдара Севярына.

Такія допісы прыходзяць у рэдакцыю ці не штодзённа, а шмат хто з нашых чытачоў не лянуецца набраць па міжгародняй і нумар нашага тэлефона. Пытанне адно: як падобнае магло здарыцца? Што ж, мы пераадрасоўваем яго складальнікам каталогу беларускага друку. Няўжо і праўда на Беларусі так блага з друкам, што, акрамя «Мы и время» ды «Славянских ведомостей», нашым землякам за мяжой і прапанаваць няма чаго? Можа, досыць, урэшце, гуляць у звышінтэрнацыяналістаў?

Каб крыху заспакоіць нашых замежных землякоў, паведамім, што не ўсё выдатна з беларускім друкам і на самой Беларусі. Мноства пісьмаў дасылаюць у рэдакцыю нашы чытачы. Здзіўляе іх мода на двухмоўныя газеты і часопісы, абурае стаўленне да працэсаў беларусізацыі і самой сутнасці беларушчыны органаў афіцыйнай улады.

«Двухмоўя ў газетах быць не павінна, — піша чытач з г. Камянца І. Жытко. — А сёння многія газеты толькі і шукаюць шчыліны ў законах, абы не карыстацца беларускай мовай».

«У кожнай газеце можна спаткаць прапановы, як прадоўжыць тэрмін пачатку ўжывання беларускай мовы», — сцвярджае мінчук Анатоль Шыла.

Аб праблемах беларускай інфармацыйнай прасторы піша настаўнік з Мінска Кастусь Карнялюк.

І сапраўды, насцярожвае апошнім часам кампанія за наданне рускай мове статуса дзяржаўнай, якая ці не ў адкрытую вядзецца некаторымі сродкамі масавай інфармацыі. Ды і не дзіва. Праз дзесяць месяцаў некаторыя артыкулы Закона аб мовах павінны запрацаваць. Так, з 1 верасня 1993 года валоданне беларускай мовай стане абавязковай для адказных асоб дзяржаўных, партыйных і грамадскіх органаў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый (артыкул 4), беларускай стане мова актаў органаў дзяржаўнай улады і кіравання (артыкул 7). Павінен пачаць дзейнічаць і артыкул 29, згодна з якім «мовай афіцыйных сродкаў масавай інфармацыі з'яўляецца беларуская мова».

А сёння вуліцы Мінска ўпрыгожваюць лозунгі: «Звязда» — адзіная беларускамоўная штодзённая газета». Дзякуй Богу, што хоць юбіляр наш не здрадзіў яшчэ роднай мове. Але, акрамя «Звязды», у таго ж Саўміна ёсць «Советская Белоруссия», «Белорусская нива», «Знамя юности», «Республика» (хоць і мае назву «Рэспубліка»)...

Праблемы мовы, яе функцыяніравання і ўжывання, а таксама культуры і нацыянальнай спадчыны займаюць, як звычайна, ці не першае месца сярод іншых тэм, якія ўзнімаюцца ў чытацкіх лістах.

Так, спадар Сяргей Ш. з Наваполацка даслаў надзвычай эмацыянальны водгук на артыкул В. Піліпчыка «Вярніце нарабаванае!», у якім з маладым максімалізмам і шчырай горыччу ўсклікае: «Што ж гэта за нацыя такая — беларусы, калі яна нават не можа пастаяць за сябе, за свой гонар, сваю радзіму?!» Праблема ўласнасці на гістарычныя і мастацкія каштоўнасці, лічыць аўтар, яшчэ, па сутнасці, і не пачынала вырашацца, нягледзячы на ўвесь аптымізм С. Шушкевіча. Беларусь павінна больш рашуча і патрабавальна выказаць сваё права на валоданне сваімі нацыянальнымі скарбамі.

М. Бусел з вёскі Дуброва Светлагорскага раёна піша пра паводзіны прадстаўнікоў розных канфесій на Беларусі, у прыватнасці, лічыць, што служкі Божыя ўсходняга і заходняга абрадаў літаральна захопліваюць усе магчымыя будынкі, не пакідаючы шанцаў вернікам іншых канфесій. «Да статуса калі не дзяржаўнай, то першай царквы ў дзяржаве рукой падаць, — піша аўтар пра праваслаўную царкву. — Небяспечныя амбіцыі ў поліканфесійнай краіне. А Беларусь жа — свецкая дзяржава». Застаецца толькі дадаць, што пагроза зрастання царквы і дзяржавы, прыватызацыя вернікамі агульнанацыянальных скарбаў (дзяржаўных музеяў і канцэртных залаў, у прыватнасці) становяцца ўсё больш рэальнымі і патрабуюць асобнай сур'ёзнай гаворкі.

Звяртаюцца нашы чытачы і да пытанняў нарматыўнасці беларускай мовы. Так, Аляксандр Шустоўскі з Барысава лічыць, што менавіта «травень» — беларуская назва веснавога месяца, прапануе раз і назаўсёды зацвердзіць гэтую форму.

Мінчук Аляксей Анціповіч заклікае да найхутчэйшага прыняцця спрадвечнай назвы сталіцы, якая павінна гучаць як «Менск». Ён прыводзіць даволі слушныя доказы таго, што не такія вялікія фінансавыя страты патрэбны на гэтае перайменаванне, узгадвае прыклады нядаўніх перайменаванняў у Балтыі, Расіі, Сярэдняй Азіі. «Час возьме сваё!» — аптымістычна зазначае аўтар.

Вялікую цікавасць сярод чытачоў выклікала і прапанова Пётры Васілеўскага наконт «восьмага варыянта гімна» — «Развітанне з Радзімай» Міхала Агінскага. Праўда, спектр думак тут дыяметральна супрацьлеглы. В. Забайловіч з горада Дуброўна Віцебскай вобласці, напрыклад, лічыць, што «нам не трэба гімн на развітанне. Патрабуецца гімн-заклік да стваральнай працы». А Мікалай Радзівановіч (г. Жлобін) упэўнены, што лепшага варыянта і не прыдумаць. «Але трэба пераканаць большасць жыхароў Рэспублікі Беларусь, што гэтая музыка беларуская, — адзначае аўтар. — Трэба напісаць біяграфію Міхала Агінскага, расказаць пра яго светапогляд, палітычныя погляды — словам, падвесці добры падмурак, тэарэтычна абгрунтаваць верагоднасць прыняцця такога гімна».

Радуе, што пры ўсіх нягодах і бядотах нашага жыцця характар пошты застаецца аптымістычным. Гэта нармальна, гэта добра, бо інакш у нашай парадаксальнай краіне не пражыць. Без надзеі на лепшае, без змагання за лепшае, без веры ў будучыню нашай адноўленай дзяржаўнасці застанецца толькі ці з'ехаць у Аўстралію, ці сесці і горка-горка заплакаць, як той уладальнік «Запарожца». Другога жыцця, каб накапіць на новую «бляшанку» Бог нам не дасць. Другога шанца — на чацвёртае Адраджэнне — у нас не будзе таксама.

Аддзел пісьмаў і грамадскай думкі.

Апошнія пяць год мы, беларусы, жывём пад знакам Адраджэння. І гэта не рытарычнае паняцце — такім яно з'яўляецца хіба для аматараў пагаварыць, паскуголіць на руінах... Гэта— семантычны знак нашай цяпершчыны і нашай будучыні, у якую скіроўвае нас лёс. І мы мусім сцвердзіць сваю будучыню, спраўдзіць свой лёс.

Адраджэнне беларусаў напрыканцы XX стагоддзя ўвабрала ў сябе самыя разнастайныя памкненні народнага духу, якія ўрэшце-такі змаглі рэалізавацца, вольна замовіць сваё права. Адраджэнне стаіць на падмурку гісторыі, мінулага, культурны патэнцыял якога толькі і змог ажывіць нас, сучаснікаў. І мы напачатку зачароўваліся мінулым, каб вытрымаць супроцьстаянне з сучаснасцю. Але мінулае падахвочвала нас гаварыць, прамаўляць да сучаснага — і мы бралі з мінулага бацькоўскую мову, успаміналі словы, што гучалі ў вёсцы, у роднай хаце, і ўступалі ў дыялог з жыццём. Праз гісторыю і мову мы дужалі, а дыялог з сучаснасцю гартаваў наша цярпенне...

Першую выяву герба «Пагоня» Алег Трусаў змайстраваў у 1977 годзе, калі пасля заканчэння універсітэта працаваў са студатрадам на Лідчыне. Месца працы —рэстаўрацыйныя майстэрні — ён змяніў адзін толькі раз, калі стаў працаваць у Вярхоўным Савеце. Цяжка знайсці ў Беларусі помнік культуры, дзе б не праводзіў рэстаўрацыйных работ археолаг Алег Трусаў. У 1979 годзе ён, бацькі каго паходжаннем з беларускай шляхты-аднадворцаў і расейскіх сялян, загаварыў на беларускай мове... Мінула больш за дзесятак год, цяпер палітык Алег Трусаў — намеснік старшыні Камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны, намеснік старшыні Беларускай сацыял - дэмакратычнай грамады, намеснік старшыні парламенцкай апазіцыі. Асноўную работу ў нас, як вядома, заўсёды праводзяць намеснікі, ім лепш бачыцца сутнасць падзей, што адбываюцца ў палітычным і духоўным жыцці. Гутарка нашага карэспандэнта з Алегам ТРУСАВЫМ — пра характар беларускай дзяржаўнасці, расклад палітычных сіл у рэспубліцы, пра далейшае ўсталяванне нашай незалежнасці.

Ю. З.

БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Алег ТРУСАЎ: «АДРАДЖЭННЕ— СТРАТЭГІЧНАЯ МЭТА АПАЗІЦЫІ»

Гутарку вядзе Юрась ЗАЛОСКА

— Алег Анатольевіч, на канферэнцыі па самасвядомасці беларусаў, што ў жніўні г. г. прайшла ў Маладзечне, вядомы дзеяч эміграцыі Янка Запруднік назваў нашу незалежнасць, дзяржаўны суверэнітэт «байструком гісторыі». Ці пагадзіліся б вы з такім вызначэннем нашай постсавецкай дзяржаўнасці?

— Я цалкам не згодзен з Янкам Запруднікам. Наша цяперашняя дзяржаўнасць — гэта не байструк, але ФЕНОМЕН гісторыі. У нас зараз моцная парламенцкая рэспубліка, прычым нашмат мацнейшая, чым у іншых краінах СНД. Напрыклад, у Таджыкістане дзяржаўнасць імгненна разбурылася, нягледзячы на моцны нацыянальны менталітэт таджыкаў (захаванне мовы, мусульманства і г. д.). Там пачалі ваяваць кланы, разгарэлася сапраўдная грамадзянская вайна... Таджыкі не дасягнулі яшчэ еўрапейскага нацыёўсведамлення, там яшчэ захоўваецца сярэднявечча, закансерваванае бальшавікамі. А ў нас, беларусаў, ёсць моцная беларуская дзяржава.

— Што значыць «моцная дзяржава»? Таталітарная дзяржава была таксама моцнай, але мы памятаем пра яе псеўдадэмакратычны і антынацыянальны характар. Дарэчы, як бы вы ацанілі цяперашні характар беларускай дзяржаўнасці — гэта посттаталітарызм ці што іншае?

— У нас цяпер неа-таталітарны лад. Посттаталітарызм ужо мінуўся, ён быў з 27 ліпеня 1990 года да 25 жніўня 1991 года, усяго толькі год. На працягу таго года існавала кампартыя, але ўжо не была накіроўваючай і вырашальнай сілай у грамадстве. Існаваў таксама СССР як адзіная дзяржава, але ў нас была адначасова і фармальная незалежнасць. Вельмі добра, што мы хутка прайшлі посттаталітарны перыяд сваёй палітычнай гісторыі.

Пасля паражэння путчу рэфармаванне таталітарнага ладу ў дэмакратычны адбываецца асабліва хуткімі тэмпамі, бо зніклі перашкоды ў асобе КПСС-КПБ, дзяржбяспекі, палітызаванай ваеншчыны. Але разам з тым захавана і штодзённа ўзмацняецца парламенцка-рэспубліканская форма дзяржаўнага ўладкавання, і ў гэтым — галоўная прычына сацыяльна-палітычнай стабільнасці Беларусі. Гэтая акалічнасць паспрыяла набыццю Беларуссю міжнароднага аўтарытэту. Зусім невыпадкова ў нас, у Менску, адкрыта першае паўнамоцнае прадстаўніцтва Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у краінах СНД.

У той жа час беларуская дзяржава застаецца антыбеларускай па стаўленні да нацыянальнай культуры і духоўнага Адраджэння беларускай нацыі. Вазьміце дзеля прыкладу пазіцыю ўрада Рэспублікі Беларусь па шэрагу пытанняў: вайсковай справе, выкананні Закона аб мовах і іншых. Таму апазіцыя (БНФ) і ставіць пытанне аб адстаўцы ўрада, і раней ці пазней мы адправім яго ў адстаўку. Сфарміраваны ценявы кабінет міністраў, ценявым прэм'ерам з'яўляецца Уладзімір Заблоцкі — цяперашні намеснік старшыні Камісіі Вярхоўнага Савета па навукова-тэхнічным прагрэсе. І калі б Заблоцкі стаў кіраўніком урада рэспублікі, — беларусізацыя пайшла б у дзесяць разоў хутчэй...

— Такім чынам, галоўнае для апазіцыі зараз — выйграць магчымы рэферэндум?

— Рэферэндум для апазіцыі не з'яўляецца самамэтай. Гэта толькі актыўны сродак уздзеяння на ўрад. Каб не было пагрозы рэферэндуму, наш урад працаваў бы нашмат горш, чым працуе цяпер. Ураду дзеля нармальнай работы, як паказвае практыка, патрэбны пастаянныя штуршкі з боку апазіцыі. Напрыклад, як было з арганізацыяй дапамогі пагарэльцам улетку? Калі БНФ заявіў аб зборы сродкаў пацярпелым жыхарам рэспублікі, урад імгненна зрэагаваў, у Магілёўскую вобласць паехаў сам прэм'ер В. Кебіч, які загаварыў з сялянамі па-беларуску; знайшліся і грошы, іншыя сродкі дапамогі.

Магчымы два варыянты далейшага развіцця падзей у Беларусі. Калі апазіцыя ў выніку рэферэндуму прыходзіць да ўлады, у апазіцыю ператворацца тыя, хто знаходзіцца пры ўладзе зараз. Мы спадзяёмся на гэты варыянт, бо мяркуем, што возьмем на новых выбарах больш паловы галасоў. У такім разе мы сфарміруем кааліцыйны ўрад, у якім будуць прадстаўлены розныя партыі і рухі. Калі ж такі варыянт не з'дзейсніцца — апазіцыя не набярэ больш паловы галасоў, — тады мы застаёмся апазіцыяй і надалей, але апазіцыяй больш моцнай. Гэта таксама някепска, бо цяпер мы маем у Вярхоўным Савеце толькі каля дзесяці працэнтаў галасоў, а такім лікам прадстаўніцтва вельмі цяжка заблакіраваць які-небудзь непажаданы для апазіцыі закон.

Асноўнае спадзяванне апазіцыі Беларускага народнага фронту, Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады, Беларускай сялянскай партыі, іншых партый і рухаў нацыянал-адраджэнскай і дэмакратычнай накіраванасці— усё-такі не на рэферэндум. Рэферэндум можа быць, а можа й не быць, гэта адзін з дробных этапаў палітычнай барацьбы. Асноўнае наша спадзяванне палягае на нацыянальнае, духоўнае Адраджэнне Беларусі. Яно, Адраджэнне, з'яўляецца стратэгічнай мэтай апазіцыі.

— Вы кажаце «апазіцыя», падразумяваючы, пэўна, яе нацыянал-дэмакратычны фланг. Аднак жа ёсць і іншы, супроцьлеглы фланг — камуністычны. Наколькі сур'ёзным вам уяўляецца процістаянне гэтых флангаў апазіцыі?

— Суполкі, што збіраліся 17 верасня г. г. на пляцы Незалежнасці ў Менску,— гэта не апазіцыя, як іх імкнуцца распрапагандаваць і прадстаўляюць урадавыя сродкі масавай інфармацыі. Гэта чарговы міф нашага ўрада, якому выгадна ўкараніць у грамадскую свядомасць уяўленне пра левую апазіцыю. Народны фронт, маўляў, знаходзіцца на правым фланзе палітычнага спектру, а мы, урад, — акурат па цэнтры. Вось які ў нас памяркоўны, спакойны ўрад, не тое, што два экстрэмісцкія флангі.

Але такое ўяўленне пра расклад палітычных сіл — гэта, паўтараю, чарговы міф урада, які апошнім часам актыўна прапагандуецца і на які, на жаль, паддаюцца некаторыя сродкі масавай інфармацыі. Напрыклад, так адбылося з тэлеперадачай «Крок», якая пракаментавала жнівеньскія мітынгі БНФ і камуністаў як супроцьстаянне дзвюх экстрэмісцкіх сіл. На самай справе камуністычная групоўка з'яўляецца правым флангам кіруючай сістэмы, яе сапраўдным экстрэмісцкім крылом. Гэта кішэнная групоўка ўрада, з ім яна ўзгадняе ўсе свае дзеянні і акцыі.

Наша, дэмакратычная апазіцыя ў Вярхоўным Савеце — апазіцыя канструктыўная. Урад Кебіча лічыцца з апазіцыяй больш, чым урад Гайдара з уяўнай апазіцыяй у Расіі. Хоць мы ўрад крытыкуем і ставім пытанне аб яго адстаўцы, але мы з урадам супрацоўнічаем там, дзе лічым патрэбным. Крытэрый для супрцоўніцтва апазіцыі з урадам адзін — умацаванне беларускай дзяржаўнасці. У гэтым канструктывізм апазіцыі. Я, напрыклад, свядома дапамагаю некаторым міністрам вырашыць тое ці іншае пытанне, калі гэта, на мой погляд, паспрыяе ўмацаванню міністэрства. Калі б я быў класічным апазіцыянерам, дык я зрабіў бы ўсё магчымае, каб разбурыць гэта міністэрства і прыйсці на месца міністра. Але задача нашай апазіцыі—не разбурэнне існуючых структур, а іх рэфармаванне да кшталту дэмакратычнай беларускай дзяржавы. Нас больш цешаць не ўласныя акцыі, мітынгі БНФ, а рэальныя змены структур дзяржавы. Напрыклад, галоўным дасягненнем апазіцыі ў вайсковай справе было не свята беларускай вайсковай славы 8 верасня, а прыняцце рэальнай прысягі 6 верасня курсантамі менскіх ваенных вучылішч — каманднага і інжынернага.

— Атрымоўваецца, што нацыянальны змест дзяржаўнасці прадукуецца апазіцыяй БНФ, а не афіцыйнай уладай, якая па ідэі прадстаўляе БЕЛАРУСКУЮ дзяржаву, выступае ад імя БЕЛАРУСКАГА народа, але не з'яўляецца беларускай сутнасна?

— Так. Апазіцыя выконвае вядучую ролю ў сферы гуманітарнага заканадаўства, у якую «большасць» у Вярхоўным Савеце амаль не ўмешваецца, а толькі пасіўна супраціўляецца беларусізацыі культуры. Законы аб культуры, адукацыі, прамадзянстве ў Беларусі выкананы на высокім прафесійным узроўні, такіх законаў не здолелі распрацаваць у іншых рэспубліках. Напрыклад, Расія нядаўна прыняла закон аб адукацыі, цалкам узяўшы за аснову адпаведны наш закон, і гэта не адзіны прыклад юрыдычнага пераймальніцтва. Нашыя гуманітарныя законы зандзіравалі заходнія эксперты, яны даюць ім высокія, станоўчыя ацэнкі. А вось законы аб прыватызацыі ў нас слабыя, заганныя, бо прымаліся на ўгоду «большасці».

Што тычыцца небеларускасці афіцыйнай кіруючай сістэмы ў Беларусі, дык прычыны гэтага карэняцца ў нашай гісторыі. Вядомая статыстыка нацыянальнага складу дзяржаўных служачых— беларусы сярод іх складаюць адносную меншасць. У гэтым няма нічога дзіўнага. КПБ сярод кампартый рэспублік былога Саюза была самай горшай. Калі ў 30-я гады з яе кіраўнікоў адстралялі апошняга беларуса, у ЦК прыйшоў Панамарэнка. Вядомыя дакументы, паводле якіх Панамарэнка прасіў (!) Маскву павялічыць колькасць расстраляных на Беларусі... Панамарэнка пачаў дамагацца, каб на кіруючых пасадах было як найменей беларусаў, вылучаў да кіраўніцтва пасланцоў з Расіі альбо рускамоўных, перарадзіўшыхся беларусаў. Калі літоўцы, казахі, таджыкі і інш. вылучалі нацыянальныя кадры, тым самым блакіруючы ўплывы цэнтральных, саюзных органаў, у Беларусі рабілася наадварот. Горш таго: Панамарэнка выхаваў тутэйшых янычараў — К. Мазурава, П. Машэрава, якія палітыку русіфікацыі праводзілі больш жорстка, чым гэта рабілі б выхадцы з Расіі. Мне згадваецца, напрыклад, 1973 год, калі Машэраў выдаў загад па партыі змагацца з нацыяналізмам. Быў складзены «чорны» спіс, куды патрапілі г. зв. «нацыяналістычныя» арганізацыі, сярод іх акадэмічныя інстытуты гісторыі, мастацтвазнаўства, літаратуры, рэстаўрацыйныя майстэрні, дзе я потым працаваў. Многія людзі тады пацярпелі, назаву хіба прозвішчы З. Пазняка, М. Чарняўскага, С. Друшчыца, Л. Ліпеня...

— Дарэчы, якім чынам з таго зрусіфікаванага інтэлігенцкага масіву змаглі вылузацца дзеячы цяперашняй апазіцыі? У суседняй Летуве, як вядома па публікацыях, актыўна дзейнічала заходняя рэзідэнтура, звязаная з летувіскай эміграцыяй у ЗША, ідэі незалежнасці і Адраджэння без перашкод прапагандаваліся ў нацыянальных літаратурна-мастацкіх выданнях..

— Літоўцы, у адрозненне ад беларусаў, ніколі не сумняваліся, што Літва стане незалежнай. Я не ведаю ніводнага літоўца-гісторыка, археолага альбо пісьменніка, якія б у 70-я гады сумняваліся ў гэтым. Верылі ў незалежнасць Літвы і камуністы. Невыпадкова выходзілі такія летувіскія газеты і часопісы, пра якія вы нагадалі. ЦК КПЛ і літоўскі КДБ **рабілі выгляд,** што іх не чыталі. КДБ працаваў актыўна, і кіраўніцтва КПЛ цудоўна ведала, што гаворыць і піша нацыянальная інтэлігенцыя. Таго, аднак, не маглі ведаць маскоўскія агенты ў структурах улады Літвы, бо яны не валодалі літоўскай мовай. ЦК КПЛ умацаваў рэспубліканскую дзяржбяспеку мясцовымі кадрамі, і фактычна не КДБ кантраляваў партыю, але летувіская кампартыя кантралявала дзяржбяспеку. Часта здаралася так, што тайныя агенты КДБ з'яўляліся г. зв. «двайнымі» агентамі, і больш працавалі на Бацькаўшчыну, чым на Маскву. Цяпер у Вільні пачалося актыўнае выкрывальніцтва такіх агентаў сярод дэпутатаў парламента, лідэраў партый...

Літоўцы выступалі за незалежнасць адзіным фронтам: і літоўцы-камуністы, і літоўцы-эмігранты. Дзесь на нейтральнай тэрыторыі яны знаходзілі агульную мову, бо разумелі, што толькі супольнымі намаганнямі могуць дабіцца незалежнасці Літвы. Працуючы на незалежнасць, літоўцы выкарыстоўвалі ўсё, што собіла. Была кіруючай партыя — выкарыстоўвалі і партыю. Літоўскія камуністы, дзяржаўныя кіраўнікі былі больш літоўцамі, чым камуністамі. Доўгі час КПЛ кіраваў Антанас Снечкус. Гэтаму літоўцу Літва яшчэ паставіць помнік. У часы хрушчоўскага наступу на культуру і рэлігію А. Снечкус не дазволіў знесці ў Літве аніводнага храма, больш таго: ніводзін храм не быў закрыты для багаслужбаў. У той час, як на Беларусі сотнямі ўзрываліся храмы і помнікі гісторыі, у тым ліку была ўзарвана Благавешчанская царква ў Віцебску, у Літве, за дзяржаўныя, савецкія грошы(!) будаваўся Тракайскі замак, супраць чаго катэгарычна выступаў М. Хрушчоў, разумеючы, што тым самым у Літве адраджаецца адзін з самых галоўных сімвалаў незалежнасці. Хоць кіраўнікі КПЛ Снечкус, а па ім Грышкявічус і даводзілі ў Маскве, што будаўніцтва спынена, яно тым часам ніколі не перапынялася...

(Працяг на стар. 12).

ЧАСОПІСЫ Ў 1993 ГОДЗЕ

ПРАГА СУЧАСНАСЦІ

Гутарка з галоўным рэдактарам часопіса «Маладосць» Генрыхам ДАЛІДОВІЧАМ

— Генрых Вацлававіч, у новы год маладосцеўцы ідуць не толькі з новымі планамі і творамі, але з новым фарматам, які змяніўся з сёлетняга сёмага нумара. Многія пастаянныя чытачы падкрэсліваюць, што быццам усё стала зручней, але ж, здаецца, «Маладосць» страціла ранейшы аб'ем.

— Пачнём з апошняга. Вясной гэтага года «Маладосць», літаратурны дадатак да яе апынуліся ледзь не пад пагрозай закрыцця. ЦК Саюза моладзі Беларусі даволі нечакана адмовіўся ад правоў і абавязкаў заснавальніцтва. «Тоўсты», з саліднай літаратурнай рэпутацыяй часопіс і дадатак да яго сталі яму непатрэбныя, як заадно і значны атрад маладых творцаў, чытачоў, а ў некаторай ступені і моладзі рэспублікі. У гэтай сітуацыі мы пачалі шукаць таго, хто падтрымаў бы выданне. Плячук нам падставіла выдавецтва «Полымя», але паколькі паперай мы былі забяспечаныя толькі да сёмага нумара, то ў новай сітуацыі Міністэрства інфармацыі змагло нам выдзеліць толькі паперу іншага, чым раней, фармату. У сувязі з гэтым мы былі змушаны ў сярэдзіне года мяняць фармат нашых выданняў. Што да аб'ёму ўлікова-выдавецкіх аркушаў, то тут амаль нічога не страцілася (у папярэдніх нумарах быў крыху большы аб'ём за кошт дробных шрыфтоў). Так што ні аўтары, ні чытачы ў гэтым сэнсе інфармацыйных страт не панясуць.

Цяпер — трывога, клопат пра падпіску, бо ад яе залежыць далейшы лёс «Маладосці» (дарэчы, ёй налета 40 гадоў, а «Бібліятэцы» — 5). Мы, аднак, верым, што сур'ёзны чытач, які і зараз арыентуецца ў кніжным і газетным моры, асабліва не «дзяўбе» багата высыпаную дзялкамі-выдаўцамі масавую халтуру на рускай мове, аддае перавагу не кідкім жахлівым загалоўкам ды малюнкавай разбэшчанасці, а сур'ёзным рэчам і да ўсяго на беларускай мове, не можа абысціся без «Маладосці».

— Звычайна асноўны цяжар у кожным часопісе нясе проза. Што мяркуеце ў 1993 годзе надрукаваць у гэтым жанры вы?

— Як вядома, асноўная наша задача — друкаваць маладых. Гэта і клопатна, але гэта і цікава: маладым дадзена магчымасць зірнуць на свет, сказаць сваё слова пра яго і пра сябе па-свойму, па-новаму. Такія творы, апавяданні і невялікія аповесці будуць у кожным нумары. Думаю, Наварыч, Казлоў, Федарэнка, Пятровіч, Крэйдзіч і іншыя — аўтары першых кніжак і першых празаічных падборак — павінны, абавязаны падаць свой голас ужо гучней і больш важка. Безумоўна, мы не можам не супрацоўнічаць з нашымі аксакаламі. Новыя аповесці нам прапанавалі вядомыя нашы празаікі Іван Шамякін і Уладзімір Дамашэвіч, якія цяпер набылі другое дыханне. Многіх зацікавіць публікацыя невядомай аповесці Уладзіміра Караткевіча. Тое ж можна сказаць і пра паэтаў: увага — і моладзі, і майстрам.

— У «Маладосці», на мой погляд, заўсёды быў моцны публіцыстычны раздзел (адношу сюды і літаратурна-крытычныя публікацыі)...

— Скажу шчыра, вельмі хацелася б своечасова, глыбока асэнсоўваць тое, што адбываецца цяпер у нашай рэспубліцы. Без перабольшвання ў нас прага сучаснасці. Трэба ж разважаць, што адбываецца ў нашай навуцы, эканоміцы, культуры, якія працягваюцца былыя і якія ўзнікаюць новыя тэндэнцыі, да чаго яны вядуць. Ёсць ужо некалькі аўтараў, якія прапанавалі на гэтую тэму свае развагі. Калі іх будзе больш, мы толькі будзем радавацца і рабіць усё, каб іхняя публіцыстыка трапіла найхутчэй на старонкі, як, скажам, дзённікспаведзь юнака, які па-маладому неабачліва трапіў у калонію.

Па-ранейшаму будзе пільная ўвага да нашай гісторыі. Вядомы наш літаратар і даследчык Мікола Ермаловіч прапануе працяг знакамітай кнігі «Старажытная Беларусь», а гісторык Міхась Чарняўскі — працяг цыкла гістарычных нарысаў «Гісторыя Беларусі ў ілюстрацыях». Працягнем публікацыю матэрыялаў з серыі «З архіваў КДБ». Думаецца, павінны быць цікавымі выступленні ўдзельнікаў «круглага стала» пры абмеркаванні ўдач і пралікаў цяперашняй маладой літаратуры, а таксама слова пра нашых маладых мастакоў, дзеячаў кіно і тэатра, кампазітараў і спевакоў, спартсменаў. Так што раздзел, што займае адносна невялікую плошчу ў часопісе, павінен быць напоўнены змястоўнымі публікацыямі, якія пашыраць кругагляд нашага чытача.

— Некалькі слоў пра «Бібліятэку часопіса «Маладосць».

— На сённяшні дзень каля пятнаццаці аўтараў, якія выдалі свае першыя кнігі ў маладосцеўскай серыі, сталі ўжо членамі Саюза пісьменнікаў. Не менш і на падыходзе да гэтага. І ў 1993 годзе асноўная ўвага будзе ўдзелена якраз моладзі, каб ёй у наш нялёгкі для іх час даць магчымасць хутчэй творча заявіць пра сябе, выйсці да чытача з першай кнігай. Іхнімі аўтарамі будуць В. Праўдзін, В. Мудроў, У. Міхно і інш. Прыемна, што творы ў гэтых кнігах будуць на самыя розныя тэмы — пра наш дзень і пра нашу гісторыю, дэтэктыўнага і фантастычнага напрамку. Па мастацкіх якасцях і духоўных набытках яны будуць значна вышэй за многія з тых, што, як казалася ўжо, цяпер абвальна выдаюцца нашымі кааператарамі дзеля вытрасання грошай з кішэнь нашых даверлівых рускамоўных чытачоў.

— Што да кошту падпіскі...

— Ён у параўнанні з іншымі выданнямі даволі цярпімы. Спадзяёмся, што нашы прыхільнікі знойдуць наступныя сумы:

Часопіс «Маладосць». На месяц — 8 руб., на паўгода — 48 руб. Індэкс 74957.

«Бібліятэчка часопіса «Маладосць». На месяц — 6 руб., на паўгода — 36 руб. Індэкс 74821.

Гутарыў Алесь МАРЦІНОВІЧ.

ПА СТАРОНКАХ ПЕРЫЁДЫКІ

У ПОШУКАХ ДУХОЎНАГА ІДЭАЛУ

І душы жыццё ўжо не дакажа,
нагнятаючы то гнеў, то злосць,
што даўно пара ёй стаць інакшай,
чым яна на самай справе ёсць.

Соф'я ШАХ.

Памятаецца даўняя размова з адным вядомым літаратарам, які вучыў мяне, пачаткоўца, як трэба складаць рукапіс кнігі: маўляў, тры-чатыры «паравозікі», — а ўжо пасля ўсё тое, што хочаш сказаць, каб лягчэй прайсці праз рэдактуру і Галоўліт. Што ж, так жылі, так тварылі, і ў тым ліку тыя, хто і сёння працягвае запускаць «паравозікі», дзе замест слоў «партыя», «Ленін», «Аўрора» — «Пагоня», «белчырвона-белы сцяг», «незалежнасць». Але гэта так, для прыказкі, бо рамяство рамяством, але ж літаратура была, ёсць, і, спадзяюся, будзе ва ўсе часы. Літаратура, якая куды вышэй і глыбей за нас, творцаў, якая заўсёды — вынік і працяг духоўных пошукаў нацыі, маяк і апірышча для тых, хто не забыўся, што, акрамя страўніка і іншых патрэбных органаў, у чалавека яшчэ ёсць душа.

У прыродзе не бывае пустаты, і пакуль жыве чалавецтва, яно заўсёды будзе шукаць ідэалы, будзе пэўніць веру, будзе ставіць балючыя пытанні аб месцы і ролі сябе ў свеце. І чытаючы сённяшнюю перыёдыку, бачу, як балюча, няпроста ідзе ачышчэнне душы, ідзе пошук ідэалаў, не, не новых, а, я б сказаў, вечных, бо не можа быць старой ці новай маралі — яна заўсёды адна.

І я, пакуль на свет гляджу
І на дарогах Беларусі
Не жабраком сляпым хаджу,
На шчасце й Волю спадзяюся.

(В. Шніп, «Полымя»).

Край, воля, Храм, Бог — вось сёння паняцці і словы, якія можна знайсці амаль у кожнай часопіснай ці газетнай публікацыі. Добра гэта ці дрэнна? Безумоўна, добра, бо, нарэшце, нібы каштоўны вечны метал, скінуўшы бруд і твань, зазіхацелі яны сваёй сапраўднасцю і магутнай веліччу.

Але... чаму раптам роспачна і горка вырываецца ў Леаніда Галубовіча?

Хоць пад акном і снег ляжыць,
І сонца ў небе коціцца,
І смех гучыць, і кроў бяжыць,
А жыць — ужо не хочацца.

(«Беларусь»).

А за ім — Людміла Рублеўская:

Тут, дзе ніжэюць і вышэюць лёсы,
Дзе толькі сорам і п'яныя слёзы,
Не збудаваць нам Храму цішыні.

(«Родник»).

Не менш песімізму ў вершах маладой паэткі Іны Снарскай:

Якая вера? Бачыш, бездань ззяе,
І грае, і смяецца, і трымціць,
І гругання раз'юшаная зграя
Твае сляпыя вочы будзе сніць.

(«Маладосць»).

Думаецца, што паэты тут не проста шчымліва шчырыя ў сваіх настроях, іх радкі якраз і сведчаць пра той балючы працэс, які перажываем усе мы, бо не проста ідзе змена дэкарацый, ідзе ломка. Тут і страта, і туга па нечым незваротным, і ачышчэнне душы праз пакуты, змаганне з самім сабой, праз слёзы, роспач і бязвер'е — да надзеі, да поклічу, да здзяйснення. А як жа інакш, бо было б усё занадта проста, калі можна было б прачнуцца назаўтра зусім іншым і зажыць адразу па-новаму.

Ды так не бывае ні ў чалавека, ні ў народа, ні ў краіны.

І стаіць — як бяздомны народ,
І пытае як тысячу год:
— Дзе наш новы начлег,
Дзе наш Ноеў каўчэг?

(В. Зуёнак, «Полымя»).

У палітыкаў прасцей: вызначана задача, намечаны шляхі, абазначаны арыенціры. Канешне, гэта таксама прастата ўяўная, за якой — самаахвярнасць, гарэнне, мужнасць. Тым не менш, настроіць душу, запаліць у ёй нязгасны агонь веры, упэўненасці і аптымізму — працэс куды больш складаны і пакутлівы.

Вяртанне да існасці, да Айчыны, да Бога — з'ява глыбока інтымная, індывідуальная, якая таксама не церпіць паказухі ці кампанейшчыны. І тут недастаткова проста прадэкларацыі, як гэта робіць Хв. Гурыновіч:

Ці вера прачнулася ў нас,
Ці загаварыла сумленне?
І хочацца ў гэты вось час
Прад Госпадам стаць на калені.

(«Полымя»).

Усё куды больш складана. Нездарма ж шлях да веры сапраўднай ідзе праз пакаянне, праз выпрабаванне і ахвярнасць. А вось менавіта гэтага часам і не відаць у шмат якіх вершах, і імя Бога ў іх гучыць калі не кашчунна, то, па крайняй меры, легкаважна і павярхоўна. Як высокі абраз побач з таннай падробкай свецяцца ў памяці цудоўныя радкі Н. Арсенневай з верша «Магутны Божа», якія павінны ўсё ж стаць нашым нацыянальным гімнам.

Літаратура, як і ўсе мы, зараз перажывае вельмі складаны час. У сферы духоўнай як ні ў якой іншай відаць, што мы страцілі за мінулыя сем дзесяцігоддзяў, якімі страшнымі цянётамі духоўнага жабрацтва аблыталі нас, як здратавалі нашыя душы, атруцілі іх няўпэўненасцю і бязвер'ем.

Нам трэба вяртацца нанава да разумення сапраўднай годнасці і праўды, да чысціні і глыбіні пачуццяў, да пошуку і спасціжэння вечных ісцін. Каб выгукнуць, як В. Зуёнак:

А я — да магілы схілюся —
І чую дыханне Бога.
І ў небе — душа Беларусі.
І болей — няма нікога.

(«Полымя»).

Духоўнасць заключаецца не толькі ў адносінах да Радзімы, да мовы, да сваіх каранёў. Гэта і лад жыцця, гэта і пачуцці паміж людзьмі. На жаль, у сённяшняй перыёдыцы амаль не сустрэнеш вершы «пра гэта» (я наўмысна не хачу ўжываць слова «каханне», бо, як і многія іншыя, яно ад частага і дэкларатыўнага ўжытку дэвальвавалася, ператварылася ў пэўны стэрэатып). Ды сёння нібыта ў шэрагу іншых пераацэнак існуе і «новы погляд» на гэтае пачуццё, хаця, я думаю, і ў Еўропе, і ў Штатах чыста механічны секс усё ж не выцесніў дарэшты гэтага пачуцця, якое хто-хто, а літаратура заўсёды ўзносіла ў шэраг самых высокіх і чыстых чалавечых рыс. Ды якое там каханне, калі раней такі папулярны наш маладзёжны часопіс «Крыніца», што раптам стаў «Родником», пачынаецца з артыкула «Мой муж гомасексуаліст», а канчаецца не менш «лірычным» — «Я лесбіянка, ну і што?».

Дарэчы, ні гомасексуалісты, ні лесбіянкі, ні славутае двухмоўе не дапамаглі «Роднику» падвысіць наклад, які імкліва падае — разам з аўтарытэтам часопіса, на які было столькі спадзяванняў.

А што так званая «альтэрнатыўная» прэса — самвыдат, які зараз атрымаў усе правы? Пра гэта — у наступным аглядзе.

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ.

Віншуем!

Алене КОБЕЦ-ФІЛІМОНАВАЙ — 60

13 кастрычніка спаўняецца 60 гадоў Алене **Кобец-Філімонавай**. Віншуем Алену Рыгораўну з юбілеем, зычым ёй новых творчых поспехаў, доўгіх год жыцця!

НАШ КАЛЯНДАР

25 кастрычніка спаўняецца 120 гадоў з дня нараджэння Аляксандра РАЗЕНФЕЛЬДА, беларускага фалькларыста і этнографа (год смерці невядомы). У 1912—1916 гадах кіраваў Беларускім навукова-літаратурным гуртком студэнтаў Пецярбургскага універсітэта. У 1904 годзе апублікаваў «Беларускія народныя песні», запісаныя ў ваколіцах Радашкавіч, у Сёмкавым Гарадку, Рубяжэвічах, Астрашыцкім Гарадку, а таксама ў Барысаўскім і Рэчыцкім паветах. Аўтар фальклорна-этнаграфічнага эцюда «З жыцця беларуса», у якім разглядаюцца зажынкавы і дажынкавы абрад, песні.

●

80 гадоў назад у Вільні выйшаў сатырычны часопіс «Крапіва». Пабачыў свет пад рэдакцыяй Змітрака Бядулі ў выдавецтве газеты «Наша Ніва». Змешчаны гумарэскі, анекдоты, прадстаўлена палітычная сатыра.

●

60 гадоў (9 кастрычніка) з дня нараджэння паэта Івана КАЛЕСНІКА (памёр 10 чэрвеня 1979 года). Аўтар кніг «Белыя каштаны», «Пяць сузор'яў», «Калі разам мы» і іншых. Займаўся перакладамі.

ЗГАДКІ МАЛАДОСЦІ СВЕТЛАЙ

ЛЯ КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

У «Мастацкай літаратуры» пабачыла свет яшчэ адно факсімільнае выданне. Выйшла зноў першая кніжка Наталлі Арсенневай «Пад сінім небам», выпушчаная яшчэ ў 1927 годзе ў «Віленскім выдавецтве» Б. Клецкіна (выпуск ажыццёўлены па асобніку, які захоўваецца ў асабістай бібліятэцы Барыса Сачанкі).

З сённяшнім чытачом гаворыць колішняя, зусім яшчэ маладая паэтэса, якой на час выхаду зборніка было ўсяго дваццаць чатыры гады. У вершах яе толькі яшчэ прабіваўся паэтычны голас, яны пазначаны светлым, а ў нечым і рамантычным успрыманнем жыцця.

Дэбют Н. Арсенневай заўважыў М. Гарэцкі. У 1928 годзе ён пісаў: «...У беларусаў пад Польшчаю з'явілася цмат маладых паэтаў, пісьменнікаў і публіцыстаў, але з выдатных імёнаў можна тым часам назваць хіба толькі адно — гэта імя Наталлі Арсенневай Аляксееўны — расіянкі па нацыянальнасці, а беларускі толькі па жыхарстве і культуры».

Словы гэтыя прыводзяцца на супервокладцы цяперашняга выдання. Расказваецца пра жыццёвы і творчы шлях паэтэсы.

З ПОШТЫ АДДЗЕЛА КРЫТЫКІ

ЧАКАЕЦЦА ЎЗЛЁТ?

Не маючы жадання надзяваць канькі літаратуразнаўцы ды браць разгон па гэтым коўзкім лёдзе, хачу зрабіць некалькі заўваг факталагічнага характару да нядаўняй дыскусіі пра стан беларускага літаратуразнаўства.

Гэтым летам даўнія замежныя перакладчыкі нашай літаратуры на чале з Н. Рандау ды шматлікія еўрапейскія беларусісты сказалі свае першыя словы па-беларуску, прайшоўшы інтэнсіўны курс беларускай мовы. А да гэтай пары, спытаеце вы? А да гэтага часу спасцігалі нас паруску.

Калі браць замежнага чытача, то наша слова дайшло, у асноўным, толькі да грамадзян былой ГДР і іншых краін «сацыялістычнага лагера». Можна здагадацца, дзякуючы якім абставінам. Зноў-такі, у ГДР інструментам перадачы быў у асноўным рупар савецкай літаратуры часопіс «Sowjetliteratur».

Якая літаратура, такое і літаратуразнаўства. Не ўяўляю літаратуру па-за кантактамі і ўплывамі. Як беларуская літаратура выглядае ў кантэксце сусветнай, павінна быць бачна з фактаў, якія пазначаны вышэй.

А як сусветная літаратура даходзіць да беларусаў наогул і да беларускіх пісьменнікаў у прыватнасці?

Бясспрэчна, што нашыя перакладчыкі вучыліся свайму мастацтву ў перакладчыкаў рускіх. Хаця б таму бясспрэчна, што беларускай школы з бесперапыннай адукацыяй у нас проста не было. Гісторыя беларускай школы — гэта тэмпературны графік ліхаманкі, спрычыненай барацьбой то з паланізацыяй, то з русіфікацыяй. Пагэтаму замежныя мовы вывучаліся, як правіла, ва ўвязцы з народнай мовай.

Канешне, можна, навучыўшыся, пераўзысці настаўніка. М. Багдановіч абяцаў вырасці ў маштабнага перакладчыка, ды век яму выпаў кароткі. Ю. Гаўрук, Я. Барычэўскі, Ю. Таўбін, яшчэ колькі імён... Гэтага было замала, каб запоўніць паліцу сусветнай літаратуры ў бібліятэцы шкаляра.

Да ўсяго дадалося выраджэнне сістэмы адукацыі ў савецкі перыяд. Калі выпускнікі Віленскай гімназіі валодалі (падкрэслю яшчэ раз — валодалі) трыма ці чатырма замежнымі мовамі, то ў нас крыху вышэйшы ўзровень з меншай колькасцю моў гарантуе адзіная ўстанова—інстытут замежных моў. Але і там пануе «вялікі і магутны», і нават у фанетычных курсах (!) не бярэцца ў разлік тое, што навучэнцы ў асноўным беларусы. У такіх умовах устаць з каленяў могуць адзінкі. І яны ёсць: С. Дорскі, сп. Шатон, В. Сёмуха, Л. Баршчэўскі, У. Папковіч...

Найбольш прыкметны ўздым у апошнія гады. З'явілася серыя «Скарбы сусветнай літаратуры».

Я разумею і падзяляю думку Г. Праневіча, што можна, пішучы пра свае карані, падняцца да агульначалавечых вышынь, і лічу, што купалаўская «Спадчына» якраз з'яўляецца такой вяршыняй. Ці легенды пра папараць-кветку — яны зусім годна чытаюцца, як гофманіяда, але і маюць сваю адметнасць. Але ж вось: Гофмана — пачулі, а нас? Дастаеўскага з яго чартаўшчынаю прачыталі па-нямецку, а нашыя легенды бяруць за аснову для твораў пісьменнікі другіх моў.

Каб цябе пачулі, трэба мець голас. Каб зразумелі, трэба мець талмача.

Калі ўзаемапранікненне літаратур (а толькі так можна ўвайсці ў сусветную літаратуру) адбываецца дзякуючы адзінкам, якія дзейнічаюць насуперак сістэме культуры, то гэта цяжка дасягальна. Што пацвярджае ўся гісторыя беларускай літаратуры.

Калі ж гэты працэс набывае масавы характар — то тады адпадае патрэба ў дыскусіі пра старэйшага брата і пра ўдзячнасць. Ці можа ісці гаворка пра літаратуру штата Арэгон? Пра літаратуру зямлі Бадэн-Вюртэмберг?

Прыведзеныя вышэй факты і разважанні (пакоўзаўсятакі!) сведчаць пра наступнае. Пытанне аб вартасцях літаратуры і літаратуразнаўства для беларусаў, на жаль, заўсёды было пытаннем палітычным. Цяпер, пасля перапынку ў некалькі стагоддзяў, мы зноў на старце. Думаю, чакаецца ўзлёт.

Яўген БЯЛАСІН.

г. Брэст.

На вышаградскай сцежцы Іва Андрыча

Да 100-годдзя з дня нараджэння

Шмат каго прыводзіць у Вышаград да блакітна-зялёнай Дрыні, што ў камяністым атачэнні пругка імкне па суровай баснійскай зямлі, вялікі пісьменнік Іва Андрыч. На 33 мовах гучыць яго раман «Мост на Дрыні», за які (і «Траўніцкую хроніку») у 1961 годзе І. Андрычу была прысуджана Нобелеўская прэмія.

Мае вочы, звыклыя да раўнінных, атуленых зялёнымі мурагамі рэк, адразу з любасцю пазналі і Дрыню, і славуты Мост, і ваколіцы славяна-мусульманскага Вышаграда. Як было не пазнаць, калі ўпершыню думкі, памкненні яшчэ студэнткі-філалагіні скіраваліся сюды, у балканскую глыбінку, за паўтара дзесятка год таму (з ласкі выкладчыцы сербскахарвацкай мовы шаноўнай В. Лумбіной). Склалася так, што кніга пра мост на Дрыні стала амаль што чытанкаю для мяне на доўгі час ды абудзіла ўстойлівую цікавасць не толькі да творчасці І. Андрыча, а да літаратуры, гісторыі яго радзімы, увогуле паўднёвых славян. Урэшце лёс у асобе бялградскага Фонду Іва Андрыча падараваў мне хвалюючую сустрэчу з даўнішняй марай.

У траўні 1990 года на Балканах яшчэ не стралялі, а толькі горача мітынгавалі, і можна было спакойна набыць у Сараеве білет на аўтобус да Вышаграда і Траўніка, а што халадзіла душу, дык гэта нязвыклая для мяне пакручастая горная дарога, на якой вялізны «Ікарус» пачуваўся момантамі надта няўтульным месцам.

Нарадзіўся І. Андрыч 9 кастрычніка 1892 года ў Траўніку, аднак вельмі рана трапіў да сваякоў бацькі ў Вышаград, дзе і праклаў сваю першую сцежачку: «Тут я вымраіў сваю думу пра багацце і прыгажосць свету. Тут я. невук, хілы і з пустымі рукамі, быў шчаслівы п'янкім шчасцем да самазабыцця, шчаслівы ад усяго, чаго тут няма, не можа быць і ніколі не будзе» (Андрыч І. Трывожны год. Аповесці. апавяданні. Мн., 1978. Пер. Б. Сачанкі).

Тады, увесну, сцішыўшыся пад прыземістым моцным каштанам і старым стракатым платанам, я мела магчымасць адчуць, колькі шчырага пачуцця ўкладзена ў гэтыя словы дарагога мне пісьменніка. Скрозь, куды ні глянь тут, зялёныя горы з шэрымі праталінамі старога шурпатага каменя, адыходзячы, пасоўваючыся вышэй, набываюць ужо сіняватыя абрысы, імгляцца, сышоўшыся з нябёсамі. Знешнія далягляды абыякава запінаюцца ў гэтай замкнёнай прасторы, быццам па-за ёю няма ўжо нічога.

Аднак праз шмат гадоў пасля свайго вышаградскага маленства І. Андрыч пісаў: «І на ўсіх шляхах і дарогах, якія я потым у жыцці прайшоў, я жыў толькі тым убогім шчасцем, сваёю вышаградскаю думаю пра багацце і прыгажосць навакольнага свету. Бо пад усімі дарогамі зямлі заўсёды слалася толькі аднаму мне бачная і адчутая глыбока вышаградская сцежачка, з дня. калі я расстаўся з ёю. і па сёння. Увесь век яна мяне не пакідала».

На той сцежачцы, пазбаўленай агромністых даляў, уражанняў вялікага яркага свету, абудзілася нястомная, ненатольная прага юнай душы —дапытлівая, устойлівая мэтанакіраванасць унутранага руху чалавечага лёсу. Пра несупыннасць гэтага руху сведчыць увесь жыццёвы шлях І. Андрыча: спачатку вучня Сараеўскай вялікай гімназіі, пасля студэнта еўрапейскіх універсітэтаў — у Заграбе, Вене, Кракаве і Грацу, урэшце дыпламата Каралеўства сербаў, харватаў, славенцаў — у Рыме, Бухарэсце, Мадрыдзе, Трыесце, Грацу, Бруселі, Жэневе, Берліне, знаўцы нямецкай, французскай, італьянскай, іспанскай, рускай, англійскай, польскай, лацінскай і грэцкай моў.

Стрэлі на гэтым шляху маладога Андрыча і вялікія нягоды, цяжкасці. На пачатку веку (з Берлінскага кангрэса 1878 года пасля вызвалення ад турэцкай экспансіі) Боснія і Герцагавіна — аўстрыйская правінцыя; моладзь, інтэлігенцыя пранікнуты ідэяй адзінства паўднёвых славян. У Сараеве малады Андрыч арганізуе і ўзначальвае суполку, якая разам з падобнымі іншымі распаўсюджвае ідэі вызвалення і аб'яднання з Сербіяй. Сёння здаля, калі Балканы ўспрымаюцца «парахавым склепам» Еўропы, расповяд пра такую патрыятычную дзейнасць можа падацца нават ненатуральным. Гінуць людзі. руйнуюцца гарады, селішчы, бурыцца спаконная роднасць паўднёвых славянскіх народаў. Але факт — упартая рэч: І. Андрыч нарадзіўся ў каталіцкай харвацкай сям'і і вырас у Босніі, з 1919 года з'яўляўся грамадзянінам Бялграда, а гаварыў. пісаў на адзінай для сербаў, харватаў, баснійцаў сербскахарвацкай мове. зразумелай, роднай усім ім. Лёс І. Андрыча ў пэўным сэнсе тыповы для гэтага рэгіёна. Мая бялградская прыяцелька Стана Рысціч, малады доктар мовазнаўства АН Сербіі, праводзячы мяне ў Боснію, нагадала, каб я прывітала горы па левы бок ад Дрыні: там, у камяністай глыбінцы, схавалася яе родная вёсачка, дзе і зараз жывуць старэнькія бацькі. Сама Стана —гарачая прыхільніца творчасці свайго славутага земляка, а закончыла тую ж асноўную вышаградскую школу. што і юны Іва. Не, не мог тады, на пачатку нашага трывожнага веку, І. Андрыч застацца ўбаку ад вызваленчага славянскага руху.

Ля грунтоўнага вышаградскага моста з яго адзінаццаццю аркамі і каронай варот пасярэдзіне міжволі прыгадваўся ў той дзень яшчэ адзін мост, таксама цесна звязаны з лёсам як І. Андрыча, так і ўвогуле яго сучаснікаў. Шукаючы аўтастанцыю, я выйшла на трагічнае для ўсяго чалавецтва месца: мост сялянскага сына Гаўрылы Прынцыпа. Свежым сонечным раннам гараджане звыкла спяшаліся па сваіх справах. быццам бы нікому і не было справы да пліты з адбіткамі следу няшчаснага юнака. Тут. над рэкою Мляцкай у Сараеве. прагучаў стрэл, стаўшы штуршком, стартам сусветнай вайны. У гэтым горадзе кантрастаў. дзе хрысціянства мусіла ў XV стагоддзі саступіць ісламу, ваяўнічай сіле асманскіх заваёўнікаў, заўсёды віравалі страсці, гучна то сцішана, як у любым месцы, дзе супрацьстаяць адна другой розныя сілы. Згодна псіхалогіі неафітаў, патурчаныя славяне энергічна сцвярджалі сваю адданасць новаму шляху. Славянская кроў цячэ ў жылах баснійскіх мусульман, той этнічнай групы, што насуперак логіцы вызначае сваю нацыянальную належнасць па веравызнанню. Так, жахлівая сённяшняя рэальнасць Балканаў шмат у чым — ахвяра далёкай гісторыі.

Ракавы стрэл у Сараеве стаў падставаю для арышту многіх людзей. Удзельніку маладзёжнага нацыянальнага руху І. Андрычу давялося адбываць зняволенне ў Спліце, Шыбеніку, Марыбору. Безумоўна, падзеі, абставіны тых гадоў аказалі моцны ўплыў на ўражлівую натуру маладога чалавека, абмежаванага ад свету ўжо не вышаградскімі гарамі, а суровымі турэмнымі сценамі. Вынікі самотных блуканняў па сутарэннях уласнай душы, пакутлівых роздумаў, асэнсавання самога жыцця ўвасобіліся ў двух зборніках лірычнай прозы (Ex ponto» і «Немири»), а таксама ў гістарычным апавяданні «Шлях Алія Джаргалеза», што пабачылі свет неўзабаве пасля вайны. Праз шмат гадоў стане ясна, што гэтыя вельмі розныя творы ўтрымлівалі ў сабе своеасаблівую праграму ўсяго творчага шляху пісьменніка. Праўда, пазней І. Андрыч будзе асцерагацца надта шчырых, узнёслых праяў пачуццяў, унутранага жыцця, што выявіцца ў пэўным ігнараванні ім сваіх ранніх паэтычных кніг (не ўключыць іх у збор твораў). У гэтай стрыманасці месціцца парадаксальнасць лёсу кожнага пісьменніка, творцы, які, з аднаго боку, стараецца ахінуць сутоннем асабістае жыццё, а з другога — абавязкова, непазбежна ўкладае ў творы сябе самога, творыць, адухоўлівае новыя мастацкія мадэлі сваёй непаўторнасцю, індывідуальнасцю.

Усе сілы душы, вялікі талент творцы І. Андрыч скіруе на эпічнае асэнсаванне лёсу роднага баснійскага краю, яго насельнікаў. У чым яму надта паможа карпатлівае вывучэнне гісторыі (у 1924 годзе адбылася абарона доктарскай дысертацыі на тэму: «Развіццё духоўнага жыцця ў Босніі пад турэцкім панаваннем»). Ісідора Секуліч, вядомая сербская пісьменніца, пранікліва заўважыць: «Цікавая адлегласць ад Андрыча, які напісаў «Ex ponto» і «Немири» да Андрыча эпіка Босніі. Там ён — чуйны, мяккі, бліскучы і элегантны празаік і стыліст. А тут — з якой сілай і майстэрствам згушчае гэтую пачуццёвую апантаную масу ў гарачыя і жывапісныя фігуры! На якую вышыню ўздымае ён аповяд пра пустых гвалтоўнікаў і змрочныя цёмныя душы, пішучы іх з вялікім майстэрствам, як нейкі першы выбух індывідуалізма і волі». З эпічнай маштабнасцю І. Андрыч здолее спалучыць тонкі псіхалагізм, а там, дзе запатрабуе матэрыял, і рамантызм, кранальную паэтычнасць. Пісьменнік пакіне і шматлікія тонкія, мудрыя назіранні — запісы аб'яднаныя назваю «Знакі ля дарогі».

Сталася так, што кнігі, за якія І. Андрычу была прысуджана Нобелеўская прэмія, ён напісаў у акупіраваным фашыстамі Бялградзе, куды вярнуўся з Берліна, з свае апошняе дыпламатычнае службы. Пісьменнік катэгарычна, у якой бы там ні было форме, адмовіўся супрацоўнічаць з акупацыйнымі ўладамі. Каб утрымацца, трэ было зноў шукаць сілы толькі ў сабе. І зноў, як у час першай сусветнай вайны, сродкам выратавання сярод агульнага бязладдзя стала творчасць. У трагічнай гісторыі роднага краю, адвечных трывучасці, працалюбстве простых людзей знаходзіў пісьменнік жыватворную падтрымку сваім кволым надзеям, абарону ад таго нялюдскага, што дзеялася навокал, ад злавеснага ценю шыбеніц на Калемягдане, Тэразіі — чароўных бялградскіх мясцінах, ператвораных у жахлівае месца пакарання. Над прыніжаным змрочным Бялградам вольна лунала натхненне вялікага майстра слова. Гэтая супярэчнасць між знешнімі ўмовамі і свабодным духоўным рухам пісьменніка таксама — адна з таямніц псіхалогіі творчасці.

У Вышаградзе мяне не пакідала адчуванне, што славуты пясняр моста недзе вельмі блізка. І не таму, што два мармуровыя слупкі трымалі побач на беразе аблічча І. Андрыча. Мабыць, стыхія слова, энергія ўкладзенага ў яго пачуцця валодаюць нязнанай намі яшчэ сілай. І. Андрыч сваім таленавітым расповядам зрабіў бачнымі так званыя ментальныя абрысы моста, што набываліся вякамі праз далучанасць белага каменя да чалавечых лёсаў.

Мост на Дрыні быў пабудаваны ў XVI стагоддзі па загадзе турэцкага візіра Мехмедпашы Сокалі, хлопчыка, вывезенага ў палон з баснійскага сяла Сакаловічы, узнесенага на высокую пасаду і захаваўшага праз усе неўзгоднасці жыцця ў Асманскай імперыі памяць пра родную зямлю. Мостам праз наравістую Дрыню ён бы праклаў сцежку дадому, на адабраную гэтак рана радзіму. Імя І. Андрыча таксама ўжо звязалася ўдзячна з мостам на Дрыні, злілося з лёсам яго землякоў.

Вышаградская сцежка І. Андрыча абарвалася 13 сакавіка 1975 года ў Бялградзе. Знікла там, «дзе канчаюцца ўсе сцежкі, дзе губляюцца дарогі і бездарожжа, дзе няма больш куды ісці і змогі няма, дзе ўсе зямныя шляхі заблытваюцца ў неразборлівы клубок і згараюць, як іскра паратунку, у нашых вачах, якія і самі гаснуць. давёўшы нас да апошняй мэты».

Сцежка знікла. Сцежка ёсць, сцежка будзе, пакуль творам вялікага пісьменніка гучаць над светам і прыводзіць у Вышаград мары, памкненні новых прыхільнікаў яго таленту.

Галіна ТВАРАНОВІЧ.

Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК

Пра тое, як я ў Ізраіль ездзіў

Апавяданне

Галіне БУЛЫКА

НЕЯК УВЕЧАРЫ, зусім позна ўжо, у сваім пакоі цёплым дужа марнаваўся я, каля дзвярэй балконных стоячы. Не пра што-небудзь — пра Ізраіль думаў.

Марнаваўся я, маркоціўся — сябра свайго ўруцкага спадара Акудовіча ўспамінаў.

Спадар Акудовіч за дзень да гэтага ліст мне ізраільскі прачытаў, з Ашдода сектарагазаўскага, што Хаім Калін яму напісаў, начальнік яго былы.

Не ліст — цукерка на пяці старонках!

Пазайздросціў я спадару Акудовічу — яму, можна сказаць, землякі з Ізраіля пішуць, а мне? Хіба ж няма іх там, давыд-гарадчукоў цемнавокіх? Ну, хоць бы ў Ашдодзе тым сектарагазаўскім?

Паглядзеў я ў бок Давыд-Гарадка роднага, дзеда Мікалая ў тумане гарынскім убачыў і пра нашых цемнавокіх, ці ёсць яны ў Ізраілі, спытаўся.

Дзед шклянку віна чырвонага, самаробнага выпіў і на пытанне трывожнае проста ў дзверы мае балконныя даў адказ вясёлы:

— А як жа ж, ёсць! Паедзь, унучак, ды пашукай там Боруха Фрэдмана! Ён жа дружбак мой польскі!

«Ну, калі так,— усцешыўся я са слоў дзедавых,— то няма чаго тут спадару Акудовічу зайздросціць».

Падахвочаны весткаю радаснай, з самага ранку не марудзіў я — Незалежнай у ножкі так і бухнуўся:

— Выпусці, Незалежная, у Ізраіль! Землякоў пашукаць трэба ды падштурхнуць іх, каб і мне пісалі!

— Едзь! — коратка адказала Незалежная, і я паехаў.

У дарозе не забавіўся.

Прыязджаю гэта і, натуральна, што, інтэрас пільны маючы, не з сенцаў—з ганка ізраільскага шукаць пачынаю.

Дзень першы ў Тэль-Авіў — Яфе пабыў, Іоппе колішняй. Ну само па сабе, што ў небе тую з'яву з абрусам вялікім пашукаў, якую на вочы свае, у Сымона-гарбара жывучы, святы апостал Пётра бачыў. Не знайшоў яе, тую з'яву з абрусам палатняным, і, пешкі, як той апостал, вандруючы, у Бат-Яме апынуўся. У Бат-Яме апынуўся і землякоў напаткаў. Праўда, землякі цемнавокія не з Давыд-Гарадка трапіліся, а пакуль што з Калінкавічаў, ад сэрца майго крыху аддаленых.

— У Бат-Яме няма тваіх,—сказалі мне землякі з Калінкавічаў,— раней жылі, ды ўсе чыста паўміралі.

— Мне б гэта як да Боруха Фрэдмана дабіцца.

— Боруха Фрэдмана ў Нетаніі папытай, Нетанія тут недалёка...

Падзякаваў я зямлякам з Калінкавічаў, што ад сэрца майго крыху аддаленыя. адпачыў у Бат-Яме пад галінаю апельсінавай, каўбасы мінскае паеўшы, і па даліне шаронскай на поўнач палесцінскую маханўў — у Нетанію жаданую беручыся. Не пешкі — на колы ўзбіўся і ехаў, шчаслівы, пад цырату абдзёртую ногі падагнуўшы. У вуха субтрапічнае шафёру-арабу паглядваў і думаў-думаў з нейкім шкадаваннем замілаваным. Пра Боруха Фрэдмана думаў. Што й казаць, ваяка стары! Мусіць, пры ўнуках ды праўнуках таўчэцца, краявіды гарынскія ўспамінаючы.

У Нетанію жаданую хутка прыехаў, дарога паўз ваду міжземнаморскую бегла, у ямы не заскоквала. З шафёрам-арабам расплаціўся я талонамі на віно азербайджанскае. З неспадзяванкі такое той нават падзякаваць забыўся.

Шанцавала мне крута, бо й тут на адным месцы доўга не тупаў. Нетанійку адну сімпатурную сустрэў і ад яе даведаўся, дзе гэта жыве Фрэдаман дзевяностагадовы...

Убачыў мужчыну я, хоць і дзевяностагадовага, але ж пры памяці пэўнай ды голасе бадзёрым. Узрадаваўся Фрэдман стары, калі пачуў, адкуль я — не перадаць як узрадаваўся! А калі даведаўся, чый унук я, то абдымаць мяне стаў, ды цалаваць-прыцалоўваць кінуўся. Праўнучку Махалафу паклікаў, загадаў курачку засмажыць і частаваў мяне, як госця самага лепшага, у вінаградніку сваім прахалодным. Перш наперш, як той Ісак старазапаветны, пажадаў мне шмат хлеба мець заўсёды і віна шмат, а пасля...

А пасля нагаварыў-нарасказваў усяго пра жыццё маладое сваё, жыццё давыд-гарадоцкае, панамі варшаўскімі густа абстаўленае. Столькі гісторыек усялякіх насыпаў, што яны, гісторыйкі тыя, у кош самы вялізны не патоўпіліся б! Нічога не хаваў Фрэдман стары, дзевяностагадовы. Нічога, нічога. Не гроша беднага, ні злота хлебнага...

Не проста жыццё — эпапея цэлая перада мной разгарнулася. Ды не буду ўслед за Фрэдманам старым жыццё ягонае пераказваць. Баюся: прытамлю чытача свайго рэдкага, чырванакніжнага, а падзеямі лішнімі сапсую форму гэтага апавяданнейка празрыстага. Скажу адно дзеля ходу сюжэтнага — пару сваю давыд-гарадоцкую ўспамінаючы, Фрэдман стары з цеплынёй найбольшаю пра тое распавядаў, як гэта ён рэстаранчык пад назвай кідкаю «Варшавянка» здабыў, калі ажаніўся з Ханай гаспадарлівай.

Ах, што гэта за рэстаранчык быў! На цэнтральнай вуліцы Касцюшкавай акардэонна дзвярыма парыпваў. А якія абеды ў ім былі! Якія абеды! Парай залатою да столі даставалі! Абеды тыя гладка-плыўныя па 1 зл. ды 10 гр. Хана з усмешкай бальзаміннаю падавала...

Аднак вада ў рацэ мяняецца, і жыццё на месцы не стаіць — давялося Боруху Фрэдману «Варшавянку» любую напавер брату Ханінаму ў годзе трыццаць сёмым пакінуць, а самому з Ханай бальзаміннаю ў Палесціну выбрацца...

— Так яно тады ўжо склалася,— растлумачыў і ўздыхнуў глыбока-глыбока, напроці мяне ў вінаградніку прахалодным седзячы.

Махалафа пасля курачкі смажанае пітво бананавае падала, гутарка нашая сама па сабе змянілася. Фрэдман стары, бананаўкі тлынуўшы, мяне па другое-першае распытваць пачаў.

Распытваць пачаў і:

— Ну, а як цяпер Давідгрудэк мой любы пажывае? — настальгікнуў светла.

— А так,— сарамліва выдыхнуў я, — знепадае патрохі...

— Брат Ханін знік у вайну... Ад «Варшавянкі» маёй, мусіць, і следу не засталося?

— Чайная там зараз,—успомніў я.

— У мяне на «Варшавянку» ўсе паперы польскія на руках. Як думаеш, зямляча юны, адсуджу я «Варшавянку» сваю, калі спатрэбіцца?

— А вы... што... вяртацца будзеце?

— Я ўжо не. На магіле Ханы застануся. А Махалафа з сям'ёю, можа, й вернецца.

Я паглядзеў на Фрэдмана старога вачыма зялёнымі, малахольнымі.

— Не глядзі на мяне гэтак, зямляча юны, — загадаў Фрэдман стары,— у нас тут неспакойна вельмі. Я за Махалафу баюся.

— А, разумею... сектар Газа... арабскае акружэнне... і ўсё такое, — паспачуваў я.

— Наадварот усё. Арабскае акружэнне якраз і мацуе Ізраіль. А знікне яно, адразу ж вырабіцца тое, што ў былым Саюзе вашым.

— Эйлат суверэнітэт абвесціць! Даліна шаронская таксама! І пустыня Негеў туды ж! — засмяяўся я.

— Не смейся! — пачуў я водпаведзь строгую.— Праедзь ад Кір'ят-Шмоны да Эйлату, якога сам успамянуў, ды Махалафу паслухай. А я пасплю пайду, бо гаварыць стаміўся...

І паехаў я з Махалафаю на кадзілаку яе, каб гэта й папраўдзе ўсё на свае вочы ўбачыць, каб гэта пераканацца геаграфічна ў тым, што й на Ізраіль хутка насунецца раскідніцтва страшэннае.

І, забягаючы наперад крыху, спытаеце вы, ці пераканаўся я?

Яшчэ як пераканаўся!

Махалафа — кабетка маладая. дасведчаная, у кадзілаку сваім не маўчала, хутчэй за прадзеда гаварыла. Руль з ручак белых не выпускаючы, паміж Нетаніяй ды Хадэраю пра ўсе дванаццаць кален і пра дванаццаць удзелаў усё расказвала. А калі з Хадэры ды Хайфы паехалі, пра царствы пачала — пра Іудзейскае ды Ізраільскае...

У Хайфе пастаялі, кавы папілі гарачае і, на затоку Хайфскую гледзячы, паветрам галілейскім глыбока задыхалі. І, вядома ж, Махалафа Ісуса Хрыста ўспомніла, часы ягоныя, калі землі ўсе самастойныя былі — і Галілея, і Самарыя, Іудзея таксама і яшчэ нешта, што за вадою іарданскаю ляжала...

У Кір'ят-Шмону, як таго Фрэдману старому хацелася, не паехалі мы. Там Ліван блізка, растлумачыла Махалафа і, кібуцы розныя мінаючы, у Кфар-Нахум кадзілак свой пагнала.

У Кфар-Нахуме пад пальмамі шпацырнулі мы, элегічна па-над вадою генісарэцкаю пахадзілі.

Махалафа пра Галілею распавядала, пра Галілею сённяшнюю, якая ніяк не можа дараваць Іудзеі фанабэрлівай яе выбрыкі колішнія, яе кепікі даўнія. Так, было яно, было: іудзеі з галілейцаў гігікалі, здзекліва зубы вышчэрвалі. І з мовы галілейскай смяяліся, і з адзення, і з усяго астатняга. І па ўсім відаць, што дарма яны тады смяяліся, бо цяпер галілейцы пакрыўджаныя мараць пра рэспубліку Галілею вольную. І не толькі мараць — свабоды патрабуюць, на вуліцы Назарэта выходзяць з лозунгамі антыерусалімскімі!

— Ды што тут асабліва гаварыць пра варажнечу ўкаранелую паміж Іудзеяй ды Галілеяй. Царствы ж розныя,— Махалафа ўдыхнула ветрык свежы, што прыляцеў з вышыняў галанскіх.— Тут калатнеча можа выбухнуць у сваім, як кажуць, хляве родным — паміж Галілеяй Верхняю ды Галілеяй Ніжняю.

Нават не верыў я, чуючы такое. Ад хвалявання каменьчыкі базальтавыя ў ваду генісарэцкую падфутбольваць пачаў.

А Махалафа скардзілася, што Галілея Верхняя на беразе самаханіцкім аўтаноміі прагне, сцягі нефалімавы ды асіравы ўздымае, лёдам ермонскім палохае! А Ніжняя на ўсё на гэта моўчкі не глядзіць, з Назарэта на гару Фавораву радамі шчыльнымі выходзіць і гэтыя сцягі здрадніцкія сцягамі завулонавымі пакрывае.

Во як!

З Кфар-Нахума праз Тверыю і Кафр-Кану ў Назарэт паабедаць прыехалі.

— Па абедзе ў Шамрон рызыкнём, — сказала Махалафа ўстрывожана.

І сапраўды пасля абеду смачнага ў Шамрон, нідзе не прыпыняючыся, паехалі.

Дарога яркая паўз дрэвы фігавыя бегла, цяньку шукаючы. А я ўсё слухаў і слухаў, не стамляўся,— пра плямёны ханаанскія слухаў, пра легіёны рымскія і яшчэ пра нешта на саранчу ненаежную падобнае. Апавядаючы, непакоілася Махалафа, каб гэта да ўсяго яшчэ не абвясціліся нашчадкі якія ханаанскія! А то прысунуцца на Ізраіль свой падзел чыніць.

— А калі рымляне прачнуцца?! — і я занепакоіўся.

— О, гэтыя абавязкова сварку паміж іудзеямі скарыстаюць, як ужо было не раз, і зноў Ерусалім захопяць! — усклікнула Махалафа.

Пра туркаў я напамінаць пабаяўся, бо й тыя ж могуць з поўначы наперці. Таго й глядзі — з усімі сваймі саджакамі чатырма на Ізраіль прысвішчуць. Таксама ж маюць права гістарычнае.

Дык гэта значыць везла мяне Махалафа паўз дрэвы фігавыя, страх наганяла, пра Самарыю, Шамрон цяперашні, расказвала. Тлумачыла, што й тут на веніку голым усё трымаецца. Можа, нават болей чым дзе. Самараны ж цяперашнія — распуснікі вядомыя, ад колішніх цароў сваіх распусты набраліся. Пра адасобленасць ды незалежнасць дбаюць, тую самую волю не забываюць, ад якое адно камяні біблейскія засталіся.

Можа, з суткі пажылі мы ў Шамроне вірлівым, у Сабасціі местачковай начавалі, вачэй не стульваючы. І пра ўсё я начуўся тут ад люду мясцовага. Пра ўсё. А найбольш дык вядома ж пра тое, што яны, нашчадкі годныя самаранаў мужных, суверэннае царства Ізраільскае аднавіць хочуць і, натуральна, што сваю сённяшнюю Сабасцію местачковую прагнуць ператварыць у сталіцу прыгожую над назовам пракаветным Самарыя. Ну, гэта як і было некалі (так і сказалі мне) у часы незабыўныя цара-спадара Амурыя цудоўнага... А яшчэ сказалі-пажаліліся, што ў продкаў іхніх вучэнне самаранскае адбіралі, жыць вольна не давалі, але яны, нашчадкі, добра памятаюць пра ўсе пакуты народа свайго і на манускрыпты самарытанскія не забываюцца.

На бензаналіўцы, непадалёк ад Шхема-Наблуса, мне з таксістам пагаварыць удалося, пагаварыць па-свойму, па-беларуску. Ён жа ў Гомелі нашым у пару застойную гісторыі сусветнай дзетак навучаў. Дык гамяльчук гэты, дзіва дзіўнае, такім зацятым самаранам удаваць сябе стаў! Жах дый годзе! Кажа: мы, самараны, ад усіх адрозніваемся; мы, самараны, яшчэ цару персідскаму сведчылі пра варожасць сваю да іудзеяў; мы нават у Ліван паўночны лезлі, за сідонцаў выдаючы сябе, каб толькі не быць падобнымі на іудзеяў... І так раскрычаўся самаранін гомельскі, што ледзьве расшчапіліся з ім. І, дзякуй богу, ён некуды ў бок Шуфы пакіраваў, а мы з Махалафай да гары авечай, Гарызімскае паехалі.

Але ж паблізу гары авечае, Гарызімскае тое ж...

Кібуцнік адзін яры, таксама родны мне, бо з Віцебска, ізноў жа на «мы, сараны...» націскаючы, як па пісаным растрыбуніў нам — маўляў, мы тут Хрыста не прынялі, не прывецілі, калі ён да Ерусаліма валокся. І толькі за тое Хрыста не прывецілі, вадой не напаілі, што іудзей ён!

Кібуцнік яры прызнаўся мне, што яшчэ не зусім ён з сябе сацыялізм віцебскі абтрос, але вучэнне новае, самаранскае, у якое толькі што ўнік, ужо не страціць ніколі.

— Ніколі! — горача запэўніў мяне і пабег бегма ў кібуц свой буракі палоць.

Пасля кібуцніка віцебскага нейкая самаранка нарваная ўспёрлася на гару Гарызімскую і закрычала ў бок мора Міжземнага: «Мы будзем вольныя ад дыктату Тэль-Авіў — Яфскага! Мы будзем вольныя!»

Паехалі далей мы, ушчэнт напалоханыя, з Шамрона да Іудзеі кіруючыся...

Адчуваю ж, аднак, што зноў мне скарачацца трэба, шануючы жанр апавядання сціслага. Так-так, скарачацца трэба, бо не толькі чытача свайго чырванакніжнага прытамлю,—на гэты раз і сам замонаюся, у раманіста палітычнага ператвару́ся. Чарніла ж маё чорнае пабялее адразу, калі апісаць усё, што ў Ерусаліме газетным начытаўся, у Беер-Шэве мікрафоннай начуўся ды ў Эйлаце пляжным наслухаўся.

— Не дай ты, божа!

Таму перад тым, як тры кропкі паставіць, выдыхну толькі: о, радасць вялікая назад у Нетанію курортную вярнуцца, у вінаградник прахалодны ўвайсці, да бананаўкі недапітае прыпасці...

— Ну, што? — сустрэў мяне Фрэдман стары ў вінаградніку прахалодным.

— Жах,— адказаў я, цяжка дыхаючы.

— А ты, зямляча юны, смяяўся.

— Як вярнуся на Беларусь, адразу ж выклікі вам афармлю!

— На мяне не афармляй. На Махалафу з сям'ёю зрабі і годзе. А гэта дзеду свайму перадай,— Фрэдман стары падаў мне дакумент юрыдычны, згодна якому права карыстання былой гасцініцай «Варшавянка» да прыезду ў Давыд-Гарадок Махалафы дзеду майму перадавалася...

Вярнуўся я дадому хутка, таксама ж у дарозе не забавіўся.

Спадара Акудовіча навінамі страшнымі напалохаў і да Незалежнай адразу, тлумачыць стаў — так і так, кажу, на Ізраіль раскідніцтва жахлівае насоўваецца, людзей сваіх ратаваць трэба, выклікі рабіць.

— Выклікай, — адказала Незалежная,— толькі бланкі выклікальныя прыдумай, бо ў мяне няма пакуль.

Бланкі?

Ці ж праблема гэта?!

Сеў я і бланкі выклікальныя прыдумаў.

На паперыне бел-чырвона-белай на фоне Пагоні рашучай, пакідаючы злева месца вольнае для граматы іўрыцкае, справа тэлеграфна вывеў: Міністэрства спраў замежных, аддзел консульскі, Менск, Рэспубліка Беларусь. Выклік. А далей тэксцічак такі падпусціў: гэтым выклікам Міністэрства спраў замежных Беларусі нашае запрашэнне пацвярджае на жыхарства заўсёднае ў Рэспубліку Беларусь асобаў ніжэйпералічаных (тут, вядома, Махалафу з усёй радзінай пералічыў). А ніжэй графку намаляваў «хто выклікае» і ў яе, у графку гэтую, сябе са сваім адрасам упісаў. Ну, а яшчэ ніжэй месцейка афіцыйшчыку пакінуў — гэта каб ён, афіцыйшчык, дазвол на ўезд пазначыў, нумар паставіў, чысло чарнільнуў ды шляхетным сябе паказаў: «Паважаны спадар (або паважаная спадарыня)! У адказ на просьбу Вашу маю гонар паведаміць ад імя Міністра спраў замежных, што асобам вышэйпералічаным будзе дазволены ўезд на Беларусь у якасці імігрантаў. Візы будуць выдадзены прадстаўнікамі ўпаўнаважанымі Рэспублікі Беларусь».

А пасля кропкі гэтае яшчэ адно месцейка дзеля афіцыйшчыка пакінуў,— каб ён падпісаўся ды пячатку сінюю з «пагонькай» імкліваю прыляпіў.

Дык вось, усё гэта на паперыне бел-чырвона-белай я справа тэлеграфна вывеў, а тое ж самае на іўрыце з левага боку напісаць — іўрытчыка знаёмага паклікаў.

Іўрытчык напісаў.

Незалежная ўхваліла работу маю іміграцыйную і нават параіла, каб не валаводзіў я — хутчэй выклік у Нетанію пасылаў.

І спадару Акудовічу мае паперы выклікальныя спадабаліся. Болей таго — бланк адзін ён пры мне на імя Хаіма Каліна запоўніў і ў гэты ж дзень адаслаў у Ашдод сектарагазаўскі.

Леанід ГАЛУБОВІЧ

МЕЛАНХОЛІЯ

●

На выгоду ёсць нагода —
І ў любові да народа
Мы клянёмся мёдам слоў,
Не спытаўшы нават згоды
На ўзаемную любоў.

Сам з кагорты той, мажліва,
І, магчыма, тым грашу,
Што пакутна, сіратліва
Пра душу яго пішу.

Веру грэшнаму й святому
Чалавеку без прыкрас,
Што да смерці падсвядома
Злых і добрых любіць нас.

Не пытае: хто і што мы
І адкуль мы і куды!
Нешчаслівы, невядомы,
Ён нас выбавіць з бяды.

Кулаком яго і матам
Не падкосіш, бы касой,—
Толькі смехам, толькі жартам,
Ды жальбою, ды слязой...

Партакратаў пашкадуе,
Дэмакратам дасць прытул.
Перацерпіць, адбудуе,
Адпрацуе наш загул.

І яшчэ паставіць помнік —
Ну, вядома, не сабе —
Дзе да мармуру законнік
Дошку з надпісам прыб'е:

«Найвялікшаму з вялікіх,
Змагару за край і люд...»
Чалавек ты мой бязлікі —
То не твой, табе — прысуд.

Ды люблю цябе без меры,
Хоць і сам — а хто я ёсць!! —
Распінаю на паперы
Тваю людскасць, ягамосць.

●

Руды дубовы доўгі стол —
Прытул сірочых спавяданняў.
На ім — папера, кніжак стос...
І час — ад вечара да ра́ння...

І, вось,— апоўнач... Цішыня...
Змагліся людзі, вецер, здані...
Алтар. Таемнасць... Пачынай
Свае малебны і казанні.

Уздых — і долу галаву,
І — пальцы шчэплены да болю...
Гатовы есці ты траву
І праклінаць жыццё і долю.

За што! Па кім ты і над чым
Смуткуеш, сыты і няшчасны,
Прарок абложнае начы
І страсці раб пад сонцам ясным!

Бо слова — што!! — бязмоўны гук
Пусты... Не ты іх вынаходнік.
Ты — імітатар слёз і мук,
Зямны, а не святы угодні́к.

О, лёс — бярозамі шумець,
Слязой ірдзець, разжаліць камень...
І, як лістотай, абляцець
Пажоўклымі чарнавікамі...

Проза паэзіі

Наіўна: вершыкі пісаць
І прапаноўваць іх для друку,
Бы вечны рухавік ствараць,
Увасабляючы навуку...

А лепш: спякотнаю парой
Разлегчыся на дзікім пляжы
З пажоўклай кніжкаю старой
Сярод браслаўскага пейзажу;

Чытаць ставедамы сюжэт,
Гартаць пацёртыя старонкі,
Адзначыць стыль даволі тонкі,
Пабыць з героем «тэт-а-тэт»...

Разморана забыцца сном
На нейкай думцы сакавітай,
І сніць даўжэзны гастраном
Ці флірт з жанчынай знакамітай...

Прачнуцца... Бегчы да вады,
І задыхацца ад свабоды,
Якую не спазнаў тады,
Калі пісаў рандо і оды...

Успамін з 70-х

Прышчэпа П. П.

У згубным доме чорны «вермут» п'ю,
Закусваю цыбуляй вялай з соллю,
І белы свет, як ёсць, люблю, люблю
Жывёльнай неспатольнаю любоўю...

Схілю чало і «Прыму» запалю,
І німбам дыму едкага абвіты,
Нутром крычу пра тое, як люблю
Вось гэты свет, дзе ўсімі я забыты:
Прыпухлай бабай і гаспадаром,
Стаптаным службай вулічнай, сяржантам,
І смерцю, што прыйшла за мною
ў дом —
Змаглася і заснула пад сервантам...

Сыду адсюль. І выйду на райкам,
Што бачыцца з вакон любога дома,
Дзе ленінская мудрая рука
Паказвае на шыльду гастранома...

Цудоўны свет! Жыві, браток, жыві,
Гайдай зямлю вясёлымі нагамі,
Шчаслівы міг жыцця свайго лаві!
І помні: Ленін — з намі, Ленін — з намі!

●

Так урэшце і жывём:
П'ю ваду, а нехта — ром,
Я пішу, а гэты крэсліць,
Я саджу, а нехта рве,
Я хвалю, а гэты бэсціць,
Я шапчу, а ён раве,
Я люблю, яна раўнуе,
Я — пра шчасце, ён — пра быт
Я будую, ён руйнуе...
Хоць і гэтак можа быць:
Я — дурны, а ён — разумны...
І таму яно, відаць,
На зямлі зусім не сумна
Жыць
і сумна паміраць...

Лета 1992

А лета ногі загаліла,
Перабягае з ценю ў цень...
І млоснае спякоты мліва
Вартуе пыльны авадзень...

Адно ратуе: рухам звыклым
Лавіць скразняк рукой, бы ў сне...
І тапаліны пух наліплы
Збіваць з кашулі, быццам снег...

Не пачуваць сябе няшчасным,
Забыўшы дом, сяброў, сябе,
А ўсё змагацца з сонцам ясным,
І спальваць час у барацьбе...

Пасля, ўначы, інстынктам воўчым
Абнюхваць змрок скразны дарма...
І сонца ў небе не знайшоўшы,
Паверыць — што яго няма.

●

Калі пагляд, як прыцемак, схіляецца
Ніжэй, ніжэй да холаду травы,
І ўся душа міжволі прачынаецца,
Нібы істота выспанай савы,
Калі і блізь і далеч пакрыёма
Зліваюцца ў адно, і можаш ты
Адчуць, як подых ветру, невядомасць —
Тугі струмень касмічнай глухаты,
Калі сябе не болей за быліну
Уразумееш ты, за крохкі крок
Нагой уросшы ў векавую гліну,
Нутром спасцігшы беспрасветны змрок,
Адкуль табе, як будучасць былога,
Уявіцца бязвоблічны Гасподзь,
Усведамленнем добрага і злога.
Пацьвельваючы гібельную плоць...

Калі табе за сорак...

Калі табе за сорак і нялёгка
Знайсці ўжо рыфму свежую, нібыта
Кашулю, перавешаную жонкай,
То мусіш дзеясловамі грымець...

Калі табе за сорак, то садзіся
За стол пісьмовы з кавай, з цыгарэтай—
Пішы самотна-бытавую прозу,
Клубамі дым пускаючы пад столь...

Калі табе за сорак, то міжволі
Ты будзеш мітусліва пагаджацца
З усякай драбязою недарэчнай
І настальгічна лаяцца пад нос...

Калі табе за сорак, то ўжо лічбы
Душу гвалтуюць і цяжараць розум,
А словы нараджаюцца без болю,
Сухімі, як абвесткі на слупах...

Калі табе за сорак — адрачыся
Ад літары апошняй алфавіта.
Сляпы Гамер прадбачыў гэту долю...
Вяслуй далей ад вострава сірэн!..

Кеша

«А ты, змарнелы чалавек,
Нікчэмны пасынак былога,
Сваю пушчаеш песню ў здзек,
Чужою славіш нават Бога».
(Я. Купала).

Што, самотнік-папугай,
Б'ешся ты ў сталёвай клетцы —
Колькі крыллем не махай,
А турма твая — на месцы...

Гаспадар табе на грош
Корм дае і мару песціць,
Што на мове яго ўсё ж
Загаворыш ты нарэшце.

І, вядома, што затым
Ён гасцей пакліча спешна
Паказаць, якім ручным
І згаворлівым стаў Кеша.

Ты ж упарта на сваёй
Па-птушынаму лапочаш...

«Хочаш быць самім сабой!
Хочаш мець уласны пошчак!!» —
Гаспадар гудзе, як гляк.
А турма ў стальной акове...
Што ж, крычы яму: «Дур-р-рак!!!»
На яго савецкай мове.

Хай пацешыцца,
пакуль
Зразумее вырак долі:
Дурнем быць яму датуль,
Покуль жыць табе ў няволі.

НОВАЯ СТАРАЯ СПРАВА

«Белвідэацэнтр» — адзінае на Беларусі прадпрыемства, якое, падхапіўшы найноўшы сусветны кірунак у мастацтве кіно, здымае не для самага масавага гледача. Пакуль, праўда, не буйныя мастацкія палотны, бо ад пачатку стварэння мае на ўвазе вытворчасць стужак дакументальных, навукова-папулярных, рэкламных.

— Што ўяўляе сабою цэнтр сёння? — пытанне да вядомага рэжысёра Юрыя ЦВЯТКОВА, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі рэспублікі, які ледзь не ад самага першага года ўзначаліў «Белвідэацэнтр» як мастацкі кіраўнік. — Менавіта сёння, бо колісь, Юрый Мікалаевіч, вы наважыліся ладзіць надта неспакойную гаспадарку, што вымагае процьмы грошай, мастакоўскіх высілкаў ды, як ні дзіўна, усвядомленых нацыянальных арыенціраў...

— Натрапіў я на гаспадарку адметную (гэта здарылася напрыканцы 1989 года). На галерэю помнікаў, напрыклад, тагачасным старшыням калгасаў, альбо таннай малапрафесійнай рэкламы... З тэхнічнага абсталявання я заспеў адну (!) напалову прафесійную кінакамеру ды спісаную студыю тэлебачання. Патрабавалася між тым зусім няшмат: прыдбаць апаратуру і... выпрацаваць канцэпцыю прадпрыемства. Самі разумееце, што набыццё разам з выпрацоўкаю маглі б сур'ёзна запрэтэндаваць на справу паловы майго жыцця... «Белвідэацэнтр» быў створаны па прапанове Міністэрства культуры Беларусі, таму само па сабе зразумела, што галоўным кірункам ягонай дзейнасці магло стацца стварэнне відэафільмаў, якія б, па першым часе, спрыялі б, садзейнічалі адраджэнню нацыянальнай культуры, перадусім, магчыма, беларускай мовы.

— Зацікавіць гледача тутэйшымі тэмамі — як?! Мяркую, пытанню пра характар, кірунак вашай дзейнасці мусіць папярэднічаць больш дакладнае: хто вашыя заказчыкі?

— У асноўным — Міністэрства культуры ды Міністэрства адукацыі рэспублікі. Гэта не значыць, што мы адмаўляем іншым, — надараецца, выгодным заказчыкам. Свежы прыклад — фільм «Кадыш» (яўрэйская памінальная малітва), зняты па заказе сумеснага прадпрыемства «Канкор», фільм, які апавядае пра знішчэнне мінскага гета падчас акупацыі. Перадусім гэта было знішчэнне носьбітаў культуры, мовы, традыцый, і менавіта на гэта здымачную групаю быў зроблены акцэнт. Шмат здымаем для патрэб навучальных устаноў, засяроджваемся на праявах мастацтва, на творчасці і асобах беларускіх літаратараў, дзеячаў мастацтва. Маем цыкл «Лепшыя спектаклі і канцэртныя праграмы», які склалі, напрыклад, амаль усе балеты В. Елізар'ева, «Тутэйшыя» Янкі Купалы ў пастаноўцы М. Пінігіна (рэжысёр В. Шавялевіч),«Страсці па Аўдзею» У. Бутрамеева (на мой погляд, фільм рэжысёра А. Мацюшэўскага не дужа ўдаўся з-за недасканалага прадмета экранізацыі, — спектакля). Нашы стужкі паслядоўна натуюць або ўзнаўляюць уражанні ад канцэрта Дзяржаўнага эстраднага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам М. Фінберга (рэжысёр В. Цяслюк), ці распавядаюць пра Дзяржаўны хор Беларусі імя Г. Цітовіча (рэжысёр Л. Гедравічус)...

— Выдае на тое, што ледзь не ў кожным сваім тварэнні «Белвідэацэнтр» трымаецца свайго вызначальнага: прапагандуе, засяроджвае ўвагу, дапамагае зразумець альбо разгледзець з'яву культуры, з'яву мастацтва... Я паўтару сваё пытанне пра нацыянальныя арыенціры: з паняццем «відэа» ў большасці гледачоў атаясамляюцца бойкі, пагоні, эротыка і да т. п. у замежных пакаванках, але ж не лірычны расповяд пра мясціны, звязаныя з імем Адама Міцкевіча на Беларусі (аўтар — У. Халіп), альбо спроба доследу аднаўлення традыцыйных рамёстваў на Беларусі...

— Ва ўсім цывілізаваным свеце пачуццё нацыянальнай годнасці, клопат пра захаванне роду, паважлівае стаўленне да звычаяў і традыцый — натуральная ўласцівасць асобы. Бяда, што ў нас на працягу вядомых гадоў гэтую асобу амаль зліквідавалі. І таму змест стужак, — гэта, хутчэй, не столькі сведчанне перакананняў мастакоў, колькі спакойны зварот да аўдыторыі, намаганне мастацкімі сродкамі падтрымаць яе годнасць.

— Вы можаце пахваліцца, што ўяўляеце аўдыторыю, для якой працуеце?

— Мы можам арыентавацца на яе паводле заказаў.

— А чым кіруюцца тыя, хто канчаткова выпускае стужку да гледача? Дарэчы, хто гэта?

— Карыстаемся пакуль адпрацаванаю формай — мастацкім саветам. Туды (не буду хаваць, маімі намаганнямі таксама) уваходзяць вядомыя беларускія літаратары, рэжысёры (кшталту Вольгі Іпатавай, Адама Мальдзіса, Рыгора Барадуліна, Віктара Шавялевіча). Праўда, ніяк не залучым да сябе каго з мастакоў — мо таму, што наш мастацкі савет працуе, як казалі за колішнім часам, на грамадскіх пачатках?

— Сярод пералічаных прозвішчаў — тыя, хто, па маіх назіраннях, дапамагае пісаць сцэнарыі, здымае і нават здымаецца ў стужках «Белвідэацэнтра». Але ж хто, як не шаноўны спадар Цвяткоў, колькі разоў даводзіў у сваіх інтэрв'ю, што адметнасць, непаўторнасць, адрознасць відэа ад братніх кіно ды тэлебачання вымагае відэаспецыялістаў! (Заўважу таксама, што ў краінах, якія спарадзілі і развілі відэа, ёсць агульная плынь — «аўдыёвізуальнага мастацтва». З усіх спецыяльнасцяў, звязаных з відэа, на Беларусі мне вядомы толькі... відэаінжынеры.

— Відэа ў традыцыйным разуменні прызначаецца для гледача-індывідуала. З распаўсюджваннем тэхнікі ды асвойтаннем з відэа нашага індывідуала кінастадолы кшталту «Кастрычніка» ці «Партызана» трэба будзе перарабляць... Але здымаць, пацвярджаю ва-

ПАЧУЦЦІ ПАД ЗАБАРОНАЙ

«Імперыя пачуццяў» на беларускіх экранах

Усцешна, калі «найважнейшае з усіх мастацтваў» вымагае пільнае ўвагі сродкаў масавай інфармацыі. Горай, калі падставаю гэткай пільнасці робіцца прафесійная непераборлівасць ды жахлівае (а, можа, і знарочыстае!) невуцтва.

Колькі выняткаў з публікацый у прэсе. «Нядаўна па БТ прагучала інфармацыя пра тое, што нейкая камісія зняла з экрана японскі фільм 1976 года «Імперыя пачуццяў» знакамітага рэжысёра Нагіса Осіма як яўна «парнаграфічную» карціну», — так пачала свой артыкул Вольга Мядзведзева ў «Народнай газеце» («Страсці вакол «Імперыі страсці», 21 мая 1992 г.). Далей аўтар прадаўжае: «Аднак у Міністэрстве культуры знайсці «камісію» не ўдалося».

Аглядальнік «Рэспублікі» Святлана Герасімава ў сваім матэрыяле «Час — абпаленыя нервы» больш дакладная: «Зараз, праўда, пры Міністэрстве культуры задумалі стварыць экспертны савет з прадстаўнікоў культуры, педагогаў, псіхолагаў. Але, на жаль, разлічваць на яго не варта. Чаму? А дзе гарантыя, што пад забарону зноў не будуць трапляць спрэчныя фільмы, такія, напрыклад, як «Імперыя пачуццяў?» (9 чэрвеня 1992 г.).

І, нарэшце, 18 чэрвеня гэтага года газета «Звязда» інфармавала сваіх чытачоў аб тым, што: «Спецыяльная камісія пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь рэкамендавала часова прыпыніць пракат копіі сусветна вядомага японскага фільма «Імперыя пачуццяў» («Карыда кахання») з-за наяўнасці ў ім значнай колькасці «парнаграфічна - натуралістычных» сцэн», іранічна заўважыўшы ў канцы паведамлення, «што няма нічога больш пастаяннага, чым менавіта «часовае».

Ці ж не парадаксальная сітуацыя, у якой апынулася і «нейкая камісія», і фільм «Імперыя пачуццяў», а галоўнае, глядач, які «пазбавіўся» (а ці так гэта?) магчымасці паглядзець тое, «што ў Мінкультуры лічаць парнаграфіяй», а «многія кіназнаўцы-спецыялісты называюць шэдэўрам сусветнага эратычнага кінематографа» («Звязда», 18 чэрвеня)?

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь 12 мая 1992 г. зацвердзіў статус Рэспубліканскай экспертнай камісіі па ацэнцы твораў літаратуры, мастацтва і публіцыстыкі, сродкаў масавай інфармацыі і прадметаў на наяўнасць у іх адзнакаў парнаграфіі, культу гвалту і жорсткасці, а таксама «Часовае палажэнне аб парадку публічнай дэманстрацыі і распаўсюджвання прадукцыі эратычнага зместу і якая прапагандуе культ гвалту і жорсткасці» (пісьмо СМ РБ 14 мая, №11/19). (Распрацаваны гэты дакумент рэспубліканскім Міністэрствам культуры ў адпаведнасці з пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 21 студзеня 1992 г.).

Перапрашаю за «казённы штыль», але дакладныя выхадныя дадзеныя дакументаў падаю дзеля таго, каб чытач мог сам ацаніць прафесійную кампетэнтнасць аўтараў памянёных вышэй публікацый, а таксама іх добрасумленнасць у падрыхтоўцы матэрыялаў для друку.

Перада мной пратаколы Рэспубліканскай экспертнай камісіі. Яны сведчаць, што ёю праведзена ўжо пяць пасяджэнняў, на адным з якіх (29 мая) і была разгледжана копія кінаверсіі фільма Нагісы Ошымы «Імперыя пачуццяў» (арыгінальная назва «Карыда кахання»), прадстаўленая незалежнай відэакінастудыяй «Арцель Ф».

У суправаджальным дзесяцівхвілінным роліку вядомы кінакрытык К. Разлогаў коратка расказаў пра гісторыю скандальнага з'яўлення фільма японскага рэжысёра на экране, пра рэакцыю міністэрства культуры Францыі на шакіруючы матэрыял, закончыўшы сваё прадстаўленне кінакарціны аўтарытэтнай думкай пра стужку Н. Ошымы як пра «шэдэўр сусветнага кінамастацтва».

Усё так. І тут я цалкам згодны з думкай і шаноўнага кінакрытыка, і С. Герасімавай, і В. Мядзведзевай, якая расказала чытачам пра «сапраўдны фурор», які выклікаў у 1976 годзе гэты фільм «на пазаконкурсных напалову закрытых праглядах» у Кане. «Сёння ўжо ніхто, акрамя мясцовых пракатчыкаў і кіназнаўцаў, не спрачаецца, што «Карыда кахання» — лепшая эратычная карціна апошніх гадоў», — абвяшчае В. Мядзведзева.

Упэўнены, што, як і мне, так і шаноўным аўтарам газетных артыкулаў давялося сутыкнуцца яшчэ з адным фактам: гледачы выходзілі з кіназалы, не даглядзеўшы да канца фільм, шчыра абураліся: «Няўжо гэтая звычайная парнушка — шэдэўр?!» У В. Мядзведзевай на гэта ёсць непарушны адказ: «Ну, не да ўсіх прабіўся. Бывае. Што зробіш: чужая культура і ёсць чужая. Ад гэтага яна, праўда нічога не губляе..Губляе той, хто наглуха закрыты для яе».

А С. Герасімава прастадушна раіць, што да сустрэчы з «другой культурай... трэба было б людзей падрыхтаваць». Са спадарынямі я зусім згодны. Трэба людзей рыхтаваць да ўспрымання іншай «культуры», а не прыніжаць і папракаць у няразвітасці. І лепш гэта рабіць сумленна і кампетэнтна, а не так, як спадарыні...

Па-першае, ніякай іншай, акрамя негатыўнай, рэакцыі ад удумлівага гледача і не трэба было чакаць, бо яму была паказана толькі копія кінаверсіі фільма Н. Ошымы «Імперыя пачуццяў» (яна доўжыцца амаль паўтары гадзіны). Грубы перамантаж асобных кадраў і эпізодаў фільма сказіў арыгінальную ідэю рэжысёра, «пасунуўшы» змест фільма ў бок чалавечай фізіялогіі, зглуміўшы філасофска-эстэтычны пласт арыгінала. А гэта, дарэчы, парушэнне аўтарскіх правоў. З гэтай нагоды нават «Звязда» з'едліва падкрэсліла: «нехта хацеў дагадзіць густам савецкіх гледачоў».

Па-другое, як і ў Дзяржаўным саюзным пракатным пасведчанні (ад 19 снежня 1991 г. за № 1818091), так і ў Дагаворы за 23 красавіка 1992 г. на права пракату фільма студыя «Арцель Ф» (дырэктар Буйніцкі А.), атрыманаму ёй ад студыі «Фора-фільм», агавораны тэрміны і ўмовы публічнага паказу копіі кінаверсіі фільма: «...правесці мерапрыемства на тэму «Грані дазволенага ў кіно» з дэманстрацыяй к/ф «Імперыя пачуццяў» у перыяд з 25 красавіка па 10 чэрвеня 1992 г. на тэрыторыі г. Мінска», «без права дэманстрацыі ў цэнтральных гарадскіх кінатэатрах».

Гільдыя кінакрытыкаў Саюза кінематаграфістаў Беларусі на сваім пасяджэнні 21 лютага 1992 г. таксама вырашыла: «Фільм паказваць. Абмежаванні: спецыялізаваная аўдыторыя (клубны паказ), акрамя людзей маладзей за 18 гадоў, вячэрнія сеансы. Старшыня Гільдыі кінакрытыкаў А. П. Бабкова».

А цяпер паглядзім, як жа студыя «Арцель Ф» выканала ўмовы свайго дагавора. Толькі па афіцыйна ўстаноўленых дадзеных дэманстрацыя «Імперыі пачуццяў» пачалася раней за абумоўлены тэрмін — з 13 красавіка ў ДК МТЗ. Паказваўся гэты, фільм і ў акруговым Доме афіцэраў, у ДК «Уручча», ДК МАЗа, кінатэатрах «Электрон», «Беларусь», «Дружба», «Перамога». Я ўжо не кажу пра сеансы, якія адбыліся ў раёнах і абласцях Беларусі. Прычым дадзенае «мерапрыемства» праводзілася без якіх-небудзь абмежаванняў умоў паказу, якраз так, як раіць у сваім артыкуле С. Герасімава: «...У прынцыпе, даросламу чалавеку можна глядзець усё...» А як жа дзеці? На гэта аглядальнік «Рэспублікі» рэзонна заўважае: «...глядзяць і дзеці, якія ведаюць відэарынак лепей за бацькоў. І тут проста натуральнае пачуццё чалавека, бацькоў, сям'і павінна альбо абмяжоўваць, альбо забараняць, а ў цэлым ахоўваць на ўсялякі выпадак сваё дзіця ад кепскага». Праўда, тут жа аўтар артыкула агаворвае тое, што «ў высокую свядомасць бацькоў» яна пакуль не верыць...

Гэта-ж пацвярджае ў сваім артыкуле «Паляванне на «касуху» («Советская Белоруссия», 19 мая 1992 г.) Е. Бондарава, характарызуючы «утверждающийся повсюду в кинематографе» «дикий, по существу безнравственный рынок», які «демонстрирует свое бесстыдство и агрессивность». Прычыны гэтага яна бачыць у «отсутствии какого-либо общественного контроля, индифферентности средств массовой информации к тому, какая «духовная пища» обеспечивает коммерческие интересы». І як вынік: «кинорепертуар перенасыщается кровавым и пошлым зрелищем».

Агульначалавечыя ісціны ляжаць у аснове фільма японскага рэжысёра Нагісы Ошымы «Карыда кахання». І мне вельмі шкада, што ні К. Разлогаў, ні мастацкі кіраўнік студыі «Арцель Ф» А. Карпаў, ні С. Герасімава, ні В. Мядзведзева не падзяліліся з гледачом сваімі глыбокімі ўражаннямі ад твора вялікага майстра, абмежаваўшыся, з аднаго боку, толькі канстатацыяй «японскай ментальнасці і

шу іранічную рацыю, амаль няма каму. Так, са здымкамі відэа не дужа цяжка асвойтацца, зразумець законы, па якіх яно ствараецца, і па першым часе выйсцем было б стварэнне на любым з аддзяленняў Акадэміі мастацтваў Беларусі маленечкага аддзялення з відэаўхілам. Альбо хоць спецкурс па відэа чытаць рэжысёрам ды аператарам...

— Пакуль жа, перапрашаю, самотна, а то й вусцішна рабілася мне падчас прагляду некаторых фільмаў «Белвідэацэнтра». Прыемна, што вы, даваючы, не саромеецеся паназаць сапраўдны стан рэчаў. Усцешна, што прымаеце ацэнку спачувальна-цвёрдую: так, стужкі пакідаюць уражанне павярхоўнасці, мітуслівасці, няпэўнасці аўтарскае думкі ці выявы, бывае, засмучаюць аўтарскімі каментарыямі. Ды, падобна, існуе нейкая адна вызначальная прычына гэткага безаблічнага шматгалосся...

— І прычына малапрыемная ды незразумелая недасведчанаму. Імя ёй: аплата творчай працы. Яна да гэтага часу залежыць, моцна перапрашаю, ад пагонных метраў стужкі. Усё астатняе пад увагу не бярэцца.

— Брак грошай, сроднаў, кадраў, — проста-такі праклятае трыадзінства. Шма-ат паспрыяе яно развіццю ды ўдасканаленню чаго б там ні было!

— Фінансаванне... Сказаць, што яно — недастатковае? Гэта ўжо хітраваць з самім сабою. Яно мізэрнае. Але ўсё-такі Міністэрства культуры ажыццяўляе яго! І было б несправядліва наракаць на міністэрства менавіта цяпер.

— Але ж у лепшых работах «Белвідэацэнтра» ненавязліва прабіваецца сведчанне занядбанасці нашай культуры, адчужанасці высокага мастацтва ад тых, хто мог бы яго цаніць, падтрымліваць, спавядаць. Прыгадаю ў гэтай сувязі фільм «Дабрахожыя» рэжысёра В. Врагава пра лёс горада Веткі ды ягоных мастацкіх скарбаў. Больш за тое. Стужкі цэнтра міжволі засведчылі занядбанасць, сплюжанасць ды й незапатрабаванасць нацыянальнага інтэлекту. У народзе пра такое кажуць: жыць чужым одумам...

— Цяжка ўстрымацца ды не пракаментаваць гэта чымсьці раздражнёным, маўляў, інтэлектуальная праца нашаю дзяржаваю аплачваецца бесспаромна нізка (надараецца, што спецыялістам і ў вочы кажуць, што ад іх прыбытку няма). Згадаю, як у часы, што сёння здаюцца ўжо даўнімі, я, скончыўшы карціну, мог спакойна жыць цэлы год, шукаючы чарговы варты сцэнарый. Сёння трэба ліхаманкава шукаць работу, — не самую вартую, не самую інтэлектуальную, не тую, якую магу зрабіць толькі я. А дадайце да нашых паўсядзённых праблем яшчэ і адсутнасць усялякай інфармацыі пра «Белвідэацэнтр»...

— З гэтых прычын я не спадзяюся і на хуткую папулярнасць цэнтра сярод суайчыннікаў. Дарэчы, бальшыня з іх калі яшчэ набудзе тэхнічнае прыстасаванне «відзік», што дасць магчымасць інтэлектуальна выбіраць. Здавалася, лагічна было б спадзявацца на падтрымку брата-тэлебачання. Але ў кулуарах доўга распавядалі гісторыю пра тое, як за кожную хвіліну эфіру шаноўныя калегі з тэлебачання запатрабавалі з цэнтра...

— Было, было... У якасці адчэпнага нам-такі далі так званы тэлетыдзень у сёлетнім красавіку. Тут сама магу згадаць і пра цяжар магутных падаткаў, які цісне на творцаў цэнтра да сёння...

— Але ж як у такіх умовах здымаць кіно... спакойнае? Ці ж не спакойнага асэнсавання, ці не спакою засяроджанасці бракуе вялікім ды малым экранам сёння?

— Вы яшчэ згадайце, што шмат у якіх сучасных стужках цэлы кірунак утварыўся — гвалту, здзеку, ляманту... Але мы і пра гэта здымаем. Простую хроніку падзей сучаснасці. Пакуль, скажу шчыра, яна не знітаваная ў нешта мастацкае, не асэнсавана, не даведзена да ладу. Можна сказаць, што на Белвідэа збіраюць свой гістарычны архіў (дарэчы, за ўласны кошт). Мастакі вылучаць з яго праз колькі часу вельмі важкую тэму — адраджэнскіх пераўвасабленняў, злачынстваў ды дабрачыннасці часу...

— Ваша новая відэасправа, як высвятляецца, прадметам найпільнейшае ўвагі робіць рэчы старыя як свет?

— Новая, старая... Будзем зыходзіць з таго, што відэа — мастацтва, а не тэхнічнае прыстасаванне. Аб'екты нашай пільнай увагі сапраўды старыя як свет, але новыя ў кожнай сваёй праяве. Новая, старая відэасправа, — шкада, чыніцца яна... па-старому.

Гутарыла Жана ЛАШКЕВІЧ.

культуры», а з другога, папрокамі ў глядацкім невуцтве.

І вось калі 9 і 10 чэрвеня дырэкцыя кінатэатра «Перамога» папрасіла мяне зрабіць невялікі ўступ перад паказам фільма «Імперыя пачуццяў», я з радасцю пакарыстаўся магчымасцю расказаць пра сваё ўспрыманне бачанага некалі ў Парыжы фільма Н. Ошымы. Спадзяваўся хоць чымсьці вярнуць гледачу тое, чаго ён не зможа ўбачыць у загадзя прадстаўленым на афішы «самым лепшым эратычным фільме ўсіх часоў і народаў». Мне зразумела было нецярпенне прыйшоўшага «пракаўтнуць малінку» гледача. Але ў той жа час я добра ўяўляў сабе магчымую псіхалагічную рэакцыю людзей, што глядзелі сурагат фільма японскага рэжысёра.

Назіраючы за рэакцыяй гледачоў, я ўсё больш пераконваўся ў пільнай неабходнасці тлумачэння складаных для ўспрымання фільмаў. На жаль, не разбураны яшчэ бар'еры ўзаемнай адчужанасці, якія раз'ядноўваюць не толькі розныя культуры, а і народы.

Ва ўмовах узрастаючай цікавасці да іншых жыццёвых укладаў і каштоўнасцяў, зусім натуральнае сёння імкненне чалавека больш глыбока спазнаць сваё «я», пашырыць межы свядомасці. І фільм Нагісы Ошымы дае нам магчымасць зазірнуць у святая святых чалавечай падсвядомасці, у складаны і крохкі свет адчуванняў і пачуццяў. Толькі варта пры гэтым помніць, што ўсходняя культурная традыцыя супрацьлеглая еўрапейскай, якая была арыентавана на змаганне з целам і сексам. Секс разглядаўся як самамэта. Традыцыя не звязвала яго з агульным станам духу. Саромелася бачыць у ім вышэйшае выяўленне творчасці, духоўнае пераўтварэнне. Без разумення гэтага немагчыма правільна ўспрымаць «Карыду кахання». Да таго ж дослед у сексуальных тонкасцях (яны ўласцівыя містычным культурам Усходу і пакладзены рэжысёрам у змястоўную тканіну фільма) проста карысны, бо мае універсальны характар.

Глядач мае права спытацца, што ж гэта за містычныя культуры Усходу, на аснове традыцый якіх і створаны гэты фільм?

Твор Н. Ошымы ўвабраў у сябе ўвесь вопыт старажытнейшых рэлігій свету: даасізму з яго ідэяй гармоніі жаночага («інь») і мужчынскага («янь») пачаткаў; індыізму, дзе прынцып сексуальнай асалоды трактуецца як дабро, як крыніца новага жыцця і дзе секс меў магічнае значэнне, раскрываў чалавеку ісціну Сусвету, спалучаючы яго пачуццёвасць з энергіяй і сіламі космасу. І ў большай ступені рыжысёр аддаў даніну разнавіднасці буддызму — тантрызму. Гэта вучэнне перадавалася толькі дасведчаным і дастойным.Яно хутчэй метад, які вядзе да атаясамлення самога сябе з найвялікшаю істотаю, а не філасофская сістэма або рэлігія.

Мужчынскі і жаночы пачаткі, спалучаючыся ў адну кроплю, утвараюць існае. Дзеля таго, каб спазнаць гэтае існае («Канцовая Ісціна»), трэба ўдасканальваць цела і дух шляхам розных рытуалаў, практыкаванняў, інтэнсіўнага перажывання прыемнага і непрыемнага. Усё гэта спрыяе вызваленню энергіі. А яна, у сваю чаргу, перамяшчаючыся ў космас, неабходна для новага духоўнага нараджэння. Такім чынам, космас — пастаянны працэс тварэння, а секс — яго найважнейшы сімвал. Пры гэтым цела і секс разглядаюцца як рух, а не як мэта, як найбольш глыбокая форма дачыненняў паміж «Я» і прыродай. А каханне, што ўзнікае, ёсць стан духу. Кожны такі акт кахання адлюстроўвае касмічны акт, а цела чалавека ўбірае ў сябе ўвесь Сусвет.

Безумоўна, багатая і складаная сімволіка тантрызму цяжка ўспрымаецца людзьмі, выхаванымі ў традыцыях нашай культуры. І ўсё ж хацелася б, каб глядач расцэньваў экранныя падзеі ды выявы, у тым ліку і сцэны палавых актаў, як найдалікатнае японскае мастацтва, заснаванае на буддыйскім каноне давядзення ўсяго да дасканаласці. Менавіта такі погляд на секс і цела памогуць яму адасобіцца ад трывіяльнасці сцэн палавога жыцця і ўзняцця да асэнсавання глабальных праблем быцця чалавека на зямлі. Даследуючы на экране анатомію пачуццяў ды жадобы, рэжысёр намагаецца знайсці меру адказнасці людзей за лёс адно аднаго, а таксама вырашыць пытанне, ці мае чалавек права на жыццё другога.

Сюжэт і кінематаграфічнае вырашэнне ў фільме Нагісы Ошымы ўяўляюць сабой арганічную еднасць, ствараюць асаблівую паэтычную атмасферу, якая ўспрымаецца гледачамі праз філігранныя душэўныя перажыванні герояў, дэталі гарадскога краявіду і інтэр'ераў, музычную і колеравую драматургію. Апошняе іграе важную метафарычную ролю ў кантэксце фільма, з'яўляецца своеасаблівым камертонам глядацкага ўспрымання.

Сказанага, думаю, досыць, каб зразумець адносіны рэспубліканскай экспертнай камісіі да фільма «Карыда кахання», што нічога агульнага не мае з указанай раней у публікацыях В. Мядзведзевай, С. Герасімавай, газеты «Звязда» прычынай «забароны» фільма Н. Ошымы.

Рашэнне экспертнай камісіі, як відаць з пратакола ад 2 чэрвеня аб «часовым прыпыненні публічнай дэманстрацыі на тэрыторыі Рэспублікі кінаверсіі фільма Н. Ошымы «Імперыя пачуццяў» у сувязі з неабходнасцю яго перарэгістрацыі і выяснення абставін яго з'яўлення на беларускім экране», прадыктавана імкненнем упарадкаваць і пакласці канец «дзікунскаму» і «агрэсіўнаму» кінематаграфічнаму разгулу апошняга часу.

Ужо тое, што ў рэспубліцы ёсць экспертная камісія, а таксама тое, што рыхтуюцца дакументы аб стварэнні Рэгістра кінавідэафільмаў і відэапраграм, спадзяюся, зможа паспрыяць таму, каб зрабіць беларускі відэа- і кінаэкран цывілізаваным.

Вячаслаў ГРЫБАЙЛА.

ВЫСТАВЫ

Усвядомленая гармонія супярэчнасці

Хтосьці можа палічыць, што прадстаўленае на гэтай выставе — для мастакоў крок назад, хтосьці ўбачыць тут адрыў ад стэрэатыпаў рэалізму, хтосьці — нармальную эвалюцыю творчасці.

Тое ж датычыць і нататак, якія мы прапаноўваем увазе чытачоў. Суб'ектывізм — у мастацтве рэч звычайная.

Замілаванне — вось тое пачуццё, з якім я пачынаю гэты артыкул. І не ведаю, з якім я яго скончу. Таму што, хоць мастацтвазнаўства і другасная з'ява ў параўнанні з мастацтвам, але ж «магічны крышталік» ёсць і ў нас, і далячынь праз яго распазнаецца гэтак жа цьмяна... Такім чынам — замілаванне, радасць душэўная і рэдкая. Жывапіс выдатны, акрамя таго, у карцінах прысутнічае розум і далікатнасць. Экспазіцыя выставы твораў Наталлі Залознай і Ігара Цішына стрыманая і годная. Кожны твор і кожная дэталь афармлення, зробленага мастакамі,— гэта сучасны «вялікі стыль». Так.

І. ЦІШЫН. «Інвентарны нумар».



Н. ЗАЛОЗНАЯ. «Зімовыя ўспаміны».

Гэта першая выстава ў Мастацкім музеі Беларусі з дабрачыннай праграмы «Новыя імёны». Наогул усё пачалося два гады назад, калі была распачата традыцыя выставак «На галерэі», і ў музеі ўпершыню за шмат гадоў з'явіліся так званыя «маладыя мастакі». (Вызначэнне гэта, безумоўна, недакладнае, сутнасць яго, магчыма, у тым, што ў жыцці кожнага мастака існуе перыяд, калі ён павінен працаваць на рэпутацыю, пакуль яна не пачала працаваць на яго). Наталля Залозная і Ігар Цішын, вядома, адносна «новыя імёны». Ён скончыў БДТМІ ў 1983 годзе, яна — у 1985, яны вядомы і дома, і ў бліжнім (Масква, Польшча), і дальнім замежжы (Германія, Францыя, ЗША, Ізраіль, Паўднёвая Карэя, Тайланд). Што натуральна — з'явіцца ў музеі зусім без рэпутацыі немагчыма. Наогул, з'яўленне ў музейнай калекцыі — гэта гарантыя высокай якасці твора. Так павінна быць, і мы да гэтага імкнуліся і імкнёмся, але ж... (Як усе здагадаліся, нам трымаць планку заўсёды высока перашкаджалі аб'ектыўныя прычыны, з якіх ці не галоўная —«Уродніч грошай не дае»). Але ж не будзем пра гэта, паглядзім «паверх дахаў». Дык вось — жывапіс выдатны. Гэта, найперш, пра Наталлю Залозную. Бо ў Ігара Цішына жывапіснасць выяўлена не так ярка і ўвогуле здаецца, што жывапіс для яго толькі сродак, а не мэта. Амаль кожны творца лічыць выдатным толькі сябе, ну і некаторых з сяброў. Таму мая думка: Наталля Залозная з ліку лепшых сучасных каларыстаў Беларусі— мабыць, будзе ўспрымацца як вельмі суб'ектыўная. І яшчэ. Яе жывапіс — ідэальнае ўвасабленне жаночага пачатку: вытанчанасць, багацце пачуццяў, мяккасць, далікатнасць, ледзь чутная іронія і самаіронія, пачуццё стылю і часу.

За сем гадоў пасля інстытута жывапіс мастачкі мяняўся часта і рашуча. Меланхалічны рэалізм «Выпадковага вальса» і «Пасля працы», разняволены дэкаратывізм «Вар'яцкага піцца гарбаты (амаль па Кэралу)». Потым нібы раптоўна з'явіліся карціны, што распачалі містычную плынь яе творчасці. Гэтая плынь прадстаўлена палатном «П'ета», але ёй яўна не хапае такога ж сакральнага атачэння. Хрысціянская тэматыка карцін Наталлі Залознай — гэта з'ява надзвычай цікавая спалучэннем відавочных змен. Паглыбляецца і ўдакладняецца тое, што ўжо некалі знайшлося. Бясспрэчна, ўдасканаленне і бачання, і мовы. Тое, што тры гады тому было чымсьці па-юнацку неакрэсленым, пераўтварылася ў мужную жыццёвую энергію, сарказм і іронію, выразныя пачуцці. У Наталлі ўсё на паўтонах, у Ігара — рэзкая светацень. Я перабольшваю? Ну вядома! Але тое, што яны відавочна, як рэдка бывае, ўвасабляюць у творчасці гармонію супярэчнасці, усведамляецца і самімі мастакамі. Таму эпіграф да выстаўкі — жартоўныя і ў той жа час вельмі сур'ёзныя «аўтапартрэты» Ігара і Наталлі.

Карціны Цішына, нягледзячы на несумненную сучаснасць, выклікаюць міжволі ў памяці творы мастакоў «Бубновага валета», «Аслінага хваста». Мабыць, падабенствам вельмі энергічных адносін з рэчаіснасцю. Таму мне падаецца, што жывапіс выконвае ў Цішына падлеглую ролю. Карціна для яго —акцыя, тэмпераментны дыялог са з'явамі, вобразамі, рэчамі, стэрэатыпамі мыслення. Калі ў Залознай «станоўчы герой» карціны — пяшчотная душа мастака, то ў Цішына — ягоная едкая любоў да свету, у якім мы жывём. Ён ачышчае з'явы ад міфаў — на іх жа карысць, яго любоў прайшла праз іронію, адрэфлектаваная. Убогі і незабыўны побыт нашага дзяцінства фігурыруе і ў афішы выстаўкі, і ў шэрагу работ. Нямногім адрозніваецца наш цяперашні побыт, але ж тады рэчаў было куды менш, і яны набывалі значнасць куды больш за намінальную. І мы — адгэтуль. Пры жадані можна на гэта паскардзіцца, але, напэўна, не мае сэнсу, тым больш, што якасць побыту выконвае вельмі адносную ролю; усё залежыць ад магчымасцей інтэрпрэтатара. (Хаця, вядома, добры побыт таксама нікому не перашкодзіў). І вельмі добра, і вельмі дарэчы, што тыя нашы ўражанні па-мастацку перажываюцца і ўвасабляюцца на такім узроўні. Гэта — мастацкае індывідуалізаванае ўсведамленне сябе пакаленнем. У вельмі шырокім дыяпазоне: ад жывапісу «Чырвонай ніткі», «Вестуноў», «Інвентарнага нумара» да пратакольных «Нюры», «Званкоў», «Нашага хімічнага гуртка».

В. ВАЙЦЯХОЎСКАЯ.

Яўгенія МАЛЬЧЭЎСКАЯ

●

Ходзім галоднымі мы
каля хлеба,
Выпіта намі грахоўнасці чаша.
Неба высокае, светлае Неба,
Ты нам даруй за
адступніцтва наша.
Неба высокае,
дар твой забылі —
Мовай чужою мы молімся Богу.
Славячы Госпада веліч і сілу,
Страцілі ў дзень свой
і Вечнасць дарогу.

Неба высокае,
Неба Уладара,
Ты нам даруй,
фарысеям фальшывым.
Тых, хто адрокся
ад Божага дара,
Бог не пачуе,
не зробіць шчаслівым.

●

Не час, не час
пра супакой і вечнасць,
Бог на зямлі
у брудзе і крыві,
Па кодэксах
распялі чалавечнасць.
Ілжэпрарокаў подлых узвялі.
У судны дзень я стану
на калені
І рукі працягну у небакрай,
І закрычу у роспачным маленні:
— О Божа, не даруй,
а пакарай.
Не варта я твайго выратавання,
Бо я жыла з грахамі і віной.
І ад майго труслівага маўчання
Чыніўся здзек над створаным
табой.
Бо ад маіх і страху, і гардыні
Плявалі часта бліжняму у твар,
І дратавалі чыстыя святыні,
І прадавалі душы, як тавар.
Мой прыйдзе час, малася,
не маліся;
На плошчы, на каленях упаду,
Каб толькі тых,
што Бога адракліся,
Судзілі не па страшнаму суду.

Расшчапленне

Заціскаю ў кулак сваю кволую волю...
З кім ісці па жыцці, чаму верна
служыць!
Адчуваю ажно да фізічнага болю,
Як ідзе расшчапленне уласнай душы.
І каханне маё, і пяшчоту жанчыны,
Як канём, здратаваў камісаркі уздым.
Дзеля светлага заўтра пакутнай Айчыны,
Я да торбы жабрацкай качуся зусім.
Адчуваю, што ўжо расшчапілася Слова,
Што застаўся пусты і траскучы набор:
Рэвалюцыя, партыя, перабудова,
Дэкларацыя, фракцыя ці дагавор.
Сталініст, дыктатура, платформа,
рэформы,
Дэмакраты, амбіцыі, мітынгі, з'езд,—
Гэта ўсё, што без сутнасці пэўнай
і формы,
Расшчапляе мае прызначэнне і змест.
Ды ўсё роўна да торбы мы коцімся
скопам,
І ў гурце бараноў мне не страшна зусім.
Што з таго, што паказвае пальцам
Еўропа:
— Паглядзіце, там зноў камісаркі
уздым.

●

Усе праблемы — не праблемы,
Бо веру ў Божую пячаць:
Арыштаваныя паэмы
Да часу толькі памаўчаць.

А потым — голас мой знямелы,
Які ўнутрана крычыць,
Прарвецца песняй набалелай
І ў сэрцах іншых загучыць.

І ў край наш Сын распяты прыйдзе
І верне страчаны нам слых,
І стане сорамна за тых,
Хто зневажаў яго і крыўдзіў.

●

Каму за боль яе балела,
За стан яе дзявоча-гнуткі!
Гандлююць імем Русі Белай,
Як нізкапробнай прастытуткай.

Гандлююць розныя хрыстосы,
Гандлююць лідэры ўсіх партый...
Не іх — народ мой ледзь не босы
Увагі і спагады варты.

Не іх! Ён сам вянец тварэння,
Хоць і нямы і без'языкі...
О Бог, пашлі уваскрашэнне,
Калі ты быў ці ёсць Вялікі.

«Адраджэнне—стратэгічная мэта апазіцыі»

(Пачатак на стар. 5).

— Выходзіць, што можна было спрыяць нацыянальнаму адраджэнню і ва ўмовах таталітарнай сістэмы?

— Безумоўна. І хто спрыяў, той і атрымаў. Возьмем для прыкладу Латвію і Літву. Дзве прыбалтыйскія краіны. У 1940-м годзе Латвія была мацнейшай і па эканоміцы, і па войску, і па менталітэце за Літву. Пасля вайны літоўцы, аднак, аказалі больш упартае супраціўленне саветызацыі сваёй краіны, чым латышы, каторыя з'ехалі за мяжу. І зараз латышоў у Латвіі крыху больш паловы насельніцтва...

Літоўцы ўступалі ў партыю не дзеля таго, каб слугаваць Маскве і камуністычнай ідэалогіі, а каб не дапусціць у партыю нелітоўцаў і тым самым заблакіраваць камандаванне з Масквы. У свой час я доўга вагаўся, уступаць ці не ўступаць у партыю, куды мяне настойліва запрашалі. У мяне не было якіхсьці ілюзій наконт таго, што гэта за партыя... Літоўскія сябры мне параілі: калі ты хочаш працаваць на культуру, на адраджэнне сваёй Беларусі, уступай у партыю. І сапраўды, зрабіць удалося шмат: колькі ўратавана ад разбурэння помнікаў, цэркваў, іншых храмаў. З дванаццаці год членства ў партыі дзевяць год я ўзначальваў партарганізацыю рэстаўрацыйных майстэрань. Колькі ні было праверак з ЦК, каб мяне зняць з сакратарства і выкінуць з партыі (асабліва калі я быў у складзе аргкамітэта БНФ), —цэкоўскія кантралёры сутыкаліся з пазіцыяй партарганізацыі, якая дружна выступала ў маю абарону. З цэлай арганізацыяй нельга было нічога зрабіць, і прысланыя цэрберы толькі разводзілі рукамі: ну і нацыяналісты тут сабраліся! Але такіх арганізацый у КПБ былі лічаныя адзінкі...

Беларусы, на маю думку, павінны будуць паставіць помнікі Аляксандру Чарвякову і Цішку Гартнаму, якія рабілі тое ж, што ў Літве пасля вайны рабіў А. Снечкус. Калі б іх не расстралялі ў 30-я гады, не рэпрэсіравалі, дык зараз у нас такіх праблем з культурай не было б, у нас, упэўнены, засталіся б і мова, і гістарычная свядомасць, і нацыянальная адукацыя. Мы мелі б такі самы ўзровень культуры, што ёсць у Летуве, а можа, й большы. Сталінскія рэпрэсіі выкасілі тых людзей, якія, будучы камуністамі, рабілі беларускую справу. На іх месца ў партыю прыйшлі альбо пасланцы з Расіі, альбо тутэйшыя янычары, нашчадкі якіх зараз згрупаваліся ў Савеце Міністраў і займаюць фактычна антыбеларускую пазіцыю.

— Скажыце, Алег Анатольевіч, якім жа чынам здолелі самаўсвядоміцца беларусамі, загарэцца ідэяй нацыянальнага Адраджэння ў 70-я гады вы і вашыя паплечнікі па апазіцыі, БНФ, «Грамадзе»? Якую ролю сыграла дзеля таго эміграцыя?

— У тым, што пачалося Адраджэнне, асноўная заслуга ўнутраных сіл. Беларуская эміграцыя ў адрозненне ад літоўскай не магла выступіць ініцыятарам Адраджэння, яна не стварыла такіх моцных цэнтраў і дасюль расколата. Канцэпцыя незалежнасці Беларусі сфарміравалася ў часы Уладзіміра Караткевіча і з яго дапамогай. Сама з'ява Караткевіча для Беларусі — гэта тое самае, што з'ява Сянкевіча для Польшчы альбо Данелайціса для Літвы. Калі ў нацыі ўзнікае такі пісьменнік, гэтая нацыя хутка мае стаць незалежнай. Гэта знак з будучага.

Выспяванню ідэі незалежнасці папярэднічалі аб'ектыўныя зрухі ў грамадстве. Мы атрымалі незалежнасць дзякуючы таму, што ўпершыню за 300 год займелі беларускі горад. Беларуская Народная Рэспубліка загінула, на маю думку, з тае прычыны, што ў 1918 годзе гарады Беларусі яшчэ не былі ўласна беларускімі. Самы «беларускі» горад Віцебск налічваў тады каля 30% беларусаў, а дамінавалі яўрэі, рускія, палякі. Такі ж стан назіраўся ў Вільні, Менску, іншых гарадах. Аднак, пасля апошняй знішчальнай вайны, мы ў другой палове XX стагоддзя нарэшце стварылі беларускія гарады.

— «Беларускія» па пашпартнай статыстыцы, але не культуры...

— ...«Беларускія» па генетычным базісе. Гарады ствараліся за кошт вёскі, вяскоўцаў, якія перасяліліся ў іх. Першае пакаленне вяскоўцаў, што асвойвала горад, падверглася татальнай русіфікацыі. Яны рабілі агромністыя высілкі, каб адцурацца ад «дзеравенскай» мовы і звычаяў. Напачатку беларуская культура ў горадзе зведала поўны дэкаданс: 60-я і першая палова 70-х гадоў — пік супроцьбеларускасці ў горадзе. Але затым у вяскоўцаў-гарадчукоў пачалі падрастаць дзеці, якія, атрымаўшы вышэйшую адукацыю і, дзякуючы Караткевічу, дапяўшы да гісторыі, сталі ўспамінаць, тое, што адпрэчылі ад сябе іх бацькі— мову, фальклор, мастацтва... Спрацаваў той псіха-генетычны фактар, што колькі б ты ні імкнуўся быць не самім сабой, кімсьці іншым, — усё адно такім не станеш, і праз пэўны час адторгнутая самасць абавязкова выйдзе на паверхню, замовіць свае правы....

— Такім чынам, нельга было самаўсвядоміцца без вывучэння і спасціжэння свае гісторыі?

— Ні ў якім разе. Ці маглі б здабыць незалежнасць літоўцы без гісторыі, хай нават яны яе ў многім прыдумалі?

— У літоўцаў былі цудоўна захаваны мова і адукацыя...

— Калі б не было гісторыі, не было б і мовы. Мова сама па сабе нічога не вызначае. Усё вызначае гістарычная свядомасць. Беларускае адраджэнне ў XIX стагоддзі пачалося з таго, што спаланізаваная беларуская шляхта пачала пісаць сваю гісторыю. Адзін з першых беларускіх гісторыкаў—Тэадор Нарбут, які на польскай мове напісаў «Гісторыю народа літоўскага», дзе супрацьпаставіў ліцьвінаў палякам і расейцам. На гэтых ідэях гадоў праз пяцьдзесят выхаваліся Францішак Багушэвіч, Янка Купала, Алесь Гарун... Мова будзе заставацца мёртвай, пакуль у народа не з'явіцца гістарычная канцэпцыя; не так істотна дзеля пачатку, на якой мове гэтая канцэпцыя будзе прапісвацца. Беларуская канцэпцыя пачала пісацца на польскай мове, многае затым было дапісана на рускай мове, але галоўнае—сутнасць напісанага. Кастусь Тарасаў, напрыклад, выдаў сваю кнігу «Погоня на Грюнвальд» па-руску, але яна выклікала большы эфект, чым некаторыя беларускія публікацыі...

— Бо па-беларуску мала хто чытае...

— Мова, на маю думку, вяртаецца толькі тады, калі прыходзіць гістарычнае самаўсведамленне. Натуральна, што шэдэўры літаратуры можна стварыць толькі на роднай мове. Мова-пасрэднік прыдатная толькі да пэўнага часу.

— Вы, Алег Анатольевіч, зважаеце на генетычны базіс Адраджэння, але ж існавала і сістэма-монстр, паліцэйская дзяржава, што трымала пад каўпаком інтэлігенцыю. Як жа яна, кволая нацыянальная інтэлігенцыя, здолела без дапамогі звонку, сваімі ўнутранымі сіламі дамагчыся прыняцця незалежнасці Беларусі?

— Кволая інтэлігенцыя не здолела б дамагчыся палітычнай незалежнасці дзяржавы. Аднак за Адраджэнне змагалася зусім не эліта, якая цалкам прадалася кіруючай сістэме і зараз ёй служыць, — а дробная шляхта інтэлігенцкая, калі можна так сказаць: мастакі — не сябры Саюза мастакоў, архітэктары без званняў, гісторыкі без ступеняў... У Літве, паўтараю, карціна была адваротнай, там быў адзіны фронт змагання за незалежнасць, разыходжанні існавалі хіба па метадах змагання.

Змены ў БССР сталіся магчымымі таму, што асноўная маса гарадскога насельніцтва, беларускага па паходжанні, маўкліва падтрымала незалежнасць і не выступіла супраць пераўтварэнняў. Акрамя таго, нам вельмі дапамагла такая фармальная акалічнасць, як членства ў ААН. Што гэта дапаможа нам здабыць незалежнасць, я падсвядома здагадваўся раней. Калі б не было членства ў ААН, калі б БССР існавала толькі як частка СССР, дык мы са сваёй аслабленай ментальнасцю маглі б і не ўзняцца... Расія пасля распаду Саюза магла б тут жа заявіць прэтэнзіі на «Северо-Западный край» як новую правінцыю Расіі. Увогуле, калі б не было БССР, беларусы наўрад ці захаваліся б як нацыя: нас бы Расія асімілявала гэтак жа, як былі асімільваны беларусы Смаленшчыны. Так што ўсё, што робіцца ў гісторыі народа, не робіцца выпадкова, а мае сваё гістарычнае значэнне.

— Як жа тады зразумець негатыўную пазіцыю ўрада адносна нацыянальнага адраджэння, яна таксама мае свой сэнс?

— Цяперашнюю кіруючую сістэму ў Беларусі задавальняе знаходжанне пад пратэктаратам Расіі. Кіруючай большасці поўная незалежнасць не патрэбна, бо пры ёй яна не застанецца пры ўладзе. І дзве дзяржаўныя мовы ім патрэбны дзеля таго, каб не вучыць беларускай мовы, захаваць і надалей сваю неадукаванасць. Бо калі адно толькі справаводства будзе цалкам пераведзена на беларускую мову — з пратэктаратам будзе назаўжды пакончана. Зараз мы маем класічную сітуацыю пратэктарату. Самае галоўнае — колькі гэтая сітуацыя будзе доўжыцца. Усё залежыць ад таго, як пройдзе рэферэндум, і хто прыйдзе да ўлады.

— На развітанне дазвольце пацікавіцца, як вам працуецца на новым месцы, у будынку са змрочнай гісторыяй, нядобрай славай (былым будынку ЦК КПБ. — Ю. З.). Ці няма псіхалагічнага дыскамфорту?

— Спачатку дыскамфорт адчуваўся. Першыя два тыдні было вельмі цяжка, бо нядобра ўплывала адмоўнае біяполе.

— ?

— Так. Але потым, калі я пераабсталяваў пакой, павесіў у ім дзяржаўны герб, карціны помнікаў гісторыі і культуры, аздобіў інтэр'ер, — то змянілася і біяполе. (У рабочым пакоі Алега Трусава стаіць прыгожы букет з сухіх кветак, зроблены, па словах уладальніка, адной з лепшых мастачак Польшчы. — Ю. З.).

— Вам падаюць бутэрброды з навай?

— Не, харчаванне за свой кошт.

— Ці маеце целаахоўніка?

— Ахоўнікі ёсць толькі ў С. Шушкевіча. Хоць папрозы мне, ва ўсякім разе, бываюць, і на мітынгах, і па тэлефоне рознае кажуць, пагражаюць дачцэ-школьніцы... Непрыемных момантаў хапае. Але няма часу падаваць у суд, больш дзейсны для мяне сродак змагання — прэса, радыё, тэлебачанне. Пасля маіх артыкулаў і фельетонаў мае апаненты і непрыяцелі надоўга замаўкаюць.

— А не было настальгічных момантаў, думак, каб вярнуцца ў навуку?

— Не было, таму што з навукі я ніколі не выходзіў, увесь час працую. За час апошняга адпачынку, напрыклад, правёў раскопкі Фары Вітаўта ў Гродне, у гэтым годзе ў сааўтарстве падрыхтаваў дзве манаграфіі. Так што палітыка зусім не перашкаджае мне займацца навукай.

— Што ж, дзякуй за гутарку і мужнасці вам, Алег Анатольевіч!

КУЛЬТУРА

Гары, гары, мая «Звязда»...

«Вучыцеся добра — будзеце працаваць у «Звязде». Гэты жартоўны наказ студэнтам ад прафесара БДУ, былога звяздоўца Б. Стральцова згадваўся на юбілейнай вечарыне газеты, што адбылася ў Доме літаратара. Нікога са сваіх былых супрацоўнікаў не забыла «Звязда», і ўсе яны дружна прыйшлі на яе 75-годдзе. Як сярод віншавальнікаў, так і ў зале былі людзі дзяржаўныя, вядомыя, а ў канцэрце —спевы, сконі, пародыі, фокусы і нават міні-сеанс экстрасенса. Цёпла прынялі гледачы маленькіх артыстаў ансамбля «Зорачка», а таксама раманс «Гори, гори, моя звезда». У сваім слове галоўны рэдактар У. Наркевіч, адышоўшы ад святочных канонаў, ад імя калектыву папрасіў прабачэння ва ўсіх, каго «Звязда» ў сумнавядомыя часы не падтрымала. Кайцеся — і вам даруецца...

Фота Я. ПЯСЕЦКАГА.

Хто ён, стыпендыят фонду?

На пасяджэнні прэзідыума Беларускага фонду культуры падведзены вынікі конкурсу на атрыманне стыпендыі імя Уладзіслава Галубка. Яго пераможцам стаў артыст народнага тэатра Краснапольскага раённага Дома культуры Юры Мотрычаў.

Таленавіты самадзейны артыст выконваў самыя разнастайныя ролі: штурмана бамбардзіроўшчыка Грышука («Узлёт» А. Дударава), беларускага селяніна Максіма Кутаса («Прымакі» Янкі Купалы), хітрага прайдохі Кузьмы («Незвычаныя пацыенты» А. Махнача)... Усяго ўдзельнічаў у 15 спектаклях і шматлікіх відовішчах і народных гуляннях.

Любоў да тэатра, да творчасці аўтакранаўшчык мясцовай «Сельгастэхнікі» Ю. Мотрычаў перадае сыну Антону. Дзесяцігадовы хлопчык прымаў удзел у спектаклях «Узлёт», «Пары», «Стогны душы».

Дагэтуль дынастыя Мотрычавых у Краснаполлі лічылася працоўнай. Хочацца спадзявацца, што ў недалёкім будучым яе назавуць і акцёрскай.

В. К.

ТЭАТР

«Лялька»: позірк у будучыню

27 верасня спектаклем «Дзед і жораў» па п'есе Віталя Вольскага распачаў сёмы тэатральны сезон тэатр «Лялька» з Віцебска. На пачатку лістапада самых маленькіх запросяць на прэм'еру спектакля «Церам-церамок» паводле вядомай казкі С. Маршака, якую пераклала на беларускую мову Марыя Баравік, а на тэатральную — рэжысёр Віктар Клімчук, сцэнограф Ганна Сідарава, кампазітар Алег Залётнеў. Сакавік наступнага года мусіць пазначыцца прэм'ераю дыдактычнай драмы ў стылі школьнага тэатра 18 стагоддзя «Загубленая душа, альбо Пакаранне грэшніка» па матывах славутага твора Яна Баршчэўскага «Шляхціц Завальня»... На пастаноўку запрашаны галоўны рэжысёр Магілёўскага лялечнага тэатра Алег Жугжда. Мабыць, на самы канец сезона прыпадзе спатканне з героямі казкі Р. Кіплінга «Цікаўны слонік», вырашанай у стылі хатняга, пакаёвага тэатра.

Ю. ІВАНОЎСКІ.

Перадусім — адметнасць рэпертуару

Мінскі абласны тэатр лялек «Батлейка», што ў Маладзечне, распачаў свой трэці сезон 2 кастрычніка, па сутнасці, прэм'ераю (першы паказ спектакля адбыўся летам), назва якой — «Хохлік». Гісторыю казачна-верагодных дачыненняў Хохліка ды Карузліка, якія высветліліся пасля з'яўлення ў іхняй лясной хаціцы Дзяўчынкі, распавёў для гледачоў драматург Сяргей Кавалёў з рэжысёрам Галінай Карбаўнічай і акцёрам Ірынай Камышавай, Уладзімірам Уладыкам ды Леанідам Сідарэвічам. Да бясспрэчных вартасцяў казкі можна аднесці нетрадыцыйнае стаўленне драматурга да дзіцячай аўдыторыі, якое перадусім падзяляе рэжысёр, ды дакладны ўзроставы адрас — ад пяці да сямі гадоў. Прыемна было даведацца, што тэатр «Батлейка» плануе ў сёлетнім сезоне некалькі самых нечаканых прэм'ер самых арыгінальных п'ес — адметнасць рэпертуару мусіць зрабіцца першым радком у візітоўцы маладзечанскага калектыву.

ЛІТКУР'ЕР

Сустрэча са знакамітым пісьменнікам

Па запрашэнні Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» на Беларусі гасцюе выдатны беларускі паэт, празаік, эсэіст Масей Сяднёў.

13 кастрычніка ў Доме літаратара (вул. Фрунзе, 5) ладзіцца сустрэча са спадаром Сяднёвым, пачатак а 18 гадзіне. Сардэчна запрашаем!

Рада ЗБС «Бацькаўшчына».

Гістарычная памяць

Творчасці маладых аўтараў было прысвечана чарговае пасяджэнне секцыі літаратуры для дзяцей і юнацтва. Абмеркаваны кнігі Міхася Ткачова, Міхася Чарняўскага і Вячаслава Стомы.

Асабліва зацікаўленая размова адбылася /аб творчасці вядомага беларускага вучонага і грамадскага дзеяча Міхася Ткачова і кандыдата гістарычных навук Міхася Чарняўскага, якія шмат зрабілі ў асвятленні далёкага мінулага нашага народа. Абмеркаванне выйшла за межы звычайнага разгляду мастацкай вартасці твораў гэтых аўтараў — яно закранула надзённую і хвалюючую тэму гістарычнай памяці і нацыянальнай свядомасці беларусаў. Аднадушна было адзначана: такія кнігі вельмі патрэбны моладзі, бо яны дапамагаюць адчуць гістарычную значнасць здзейсненага продкамі. Пра гэта гаварылі Артур Вольскі, Васіль Зуёнак, Сяргей Законнікаў, Генадзь Каханоўскі, Павел Місько, Яраслаў Пархута і іншыя выступоўцы.

М. Ткачоў, М. Чарняўскі і В. Стома рэкамендаваны ў члены Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Я. ІВАНОЎ.

МУЗЫКА

Сапраўднае паломніцтва

А інакш і не скажаш пра тое, што дзеелася 1 кастрычніка ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Гэта быў Міжнародны дзень музыкі, і па даўняй традыцыі філармонія адкрывала новы канцэртны сезон. Акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі на чале з маэстра Віктарам Дуброўскім прадставіў дыхтоўную праграму: Трэцюю сімфонію С. Рахманінава, Фартэпіянны канцэрт № 3 Л. Бетховена (саліст — даўні сябра мінскіх меламанаў, сусветна вядомы Мікалай Пятроў), «Франчэску да Рыміні» П. Чайкоўскага... Натхнёнасць музыкантаў, аншлаг у зале, увага замежных гасцей, «жывая» трансляцыя ў тэлеэфір, — усё гэта надало Міжнароднаму дню музыкі ўрачыстасць сапраўднага свята. Назаўтра яно прадоўжылася: наш госць піяніст М. Пятроў падарыў слухачам віртуозную сольную праграму. Сезон пачаўся, наперадзе новыя сустрэчы з музыкай самай рознай: ад арыстакратычнай старадаўняй на фестывалі «Адраджэнне беларускай капэлы» — да спантаннай сённяшняй на «Днях джазу» ў Мінску...

Ізноў — прэм'ера!

Калі на пачатку новага сезона праходзіў урачысты збор трупы, дырэктар Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі Беларусі С. Косцін звярнуў увагу прысутных на тое, пра што ў цяперашніх умовах установы культуры звычайна маўчаць,—на вытворча-фінансавыя паказчыкі. Яны ж надзіва высокія. Да 1 жніўня цалкам выкананы адавы план. Добрая палова спектакляў праходзіць з аншлагам. Цікавасць гледачоў уплывае і на цікавасць да тэатра сучасных мецэнатаў, а ўсё разам дабратворна ўздзейнічае на ўнутрытэатральныя справы. З'явіліся новыя пастаноўкі, адметныя акцёрскія работы, прыйшлі ў трупу маладыя салісты С. Лугава, А. Ісаеў, У. Пятроў... Каб акцёрскі хлеб не здаваўся такім ужо горкім (хтосьці не-не ды параўноўвае аклады вадзіцеляў гарадскога транспарта ды прыёмшчыц у пральнях з куды больш сціплымі заробкамі «зорак» аперэты), сваю падтрымку мастацтву абяцаюць спонсары. Сярод іх мінскія фірмы «Мілавіца», «Алеся», завод імя Вавілава, аб'яднанне «Осмій» і інш. Калектывы-спонсары купляюць пастаянныя месцы ў зале на ўвесь сезон. Апроч таго, фінансуюць дабрачынныя акцыі (паказ спектакляў для дзяцей-інвалідаў). Дзякуючы спонсарскай падтрымцы ўдалося захаваць стабільную цану білетаў на спектаклі для дзяцей: ва ўмовах, калі даражэе ўсё, наведванне тэатра для маленькіх нашых грамадзян будзе справай даступнай: 2—4 рублі за білет. І не трэба саромецца, што спажыва духоўная танней за марожанае: у такіх умовах апынулася культура ў нашым грамадстве...

Намеснік міністра культуры У. Рылатка, віншуючы трупу з адкрыццём сезона, выказаў спадзеў, што тэатр зробіць усё, каб на ягонай сцэне найчасцей гучала беларуская мова. Кожнаму артысту наканавана ўсвядоміць, што праграма беларускага адраджэння — не проста даніна сённяшняму дню, што гэта глыбокі працэс, які ўсіх нас заклікае далучыцца да гэтай праграмы, падтрымаць яе.

А тым часам зноў адбылася прэм'ера: 3 кастрычніка з аншлагам прайшоў мюзікл Д. Германа «Хэло, Долі!». Рэжысура В. Цюпы, музычны кіраўнік і дырыжор А. Сасноўскі, мастак У. Жданаў, танцы ў пастаноўцы Н. Дзячэнкі ды яе англійскай калежанкі Д. Нолан. На здымку Д. Нолан у цэнтры, з акцёрамі В. Шабунем (злева) ды Г. Казловым. Апошнія штрыхі перад прэм'ерай...

Фота У. ШУБЫ (БЕЛІНФАРМ).

Чатыры дабрачынныя канцэрты

Іх наладзіў на Беларусі рок-гурт з Нямеччыны «Frantic club». Выступалі нашы госці з мінскімі гуртамі «Крама» ды «Уліс» у Гродне, Лідзе, Слоніме, у Мінску. Правесці канцэрты дапамог спонсар — фірма «Дайнова».

П. ГАРДЗІЕНКА.

Праз тры зямлі...

Цымбальны аркестр «Юнацтва», грае на свяце 750-годдзя горада Гельдэрна. Фота У. ВІТЧАНКІ.

Пашыраюцца кантакты Саюза музычных дзеячаў Беларусі з няўрадавымі музычнымі арганізацыямі Германіі. Сёлета ў ФРГ пабываў цымбальны аркестр «Юнацтва», якім кіруе дацэнт Беларускай акадэміі музыкі кампазітар Генадзь Ермачэнкаў. З поўначы на поўдзень краіны, праз тры зямлі — Паўночны рэйн-Вестфалія, Бадэн-Вюртэмберг ды Рэйнланд Пфальц — пралёг маршрут канцэртных выступленняў цымбалістаў. Гралі яны і ў фешэнебельных залах, як на сусветна вядомым курорце Бадэн-Бадэн, і ў культавых будынках, і на гарадскіх святах, і на вясковых пагуляннях. Гучала класіка, творы беларускіх кампазітараў, апрацоўкі народных песень. Віртуознасць, майстэрства цымбалістаў, тэмперамент дырыжора захаплялі слухачоў. «Феерыя, ф'юрыоза», — пісалі нямецкія газеты. Аркестр жа атрымліваў прапановы наконт будучых візітаў у Германію.

ДРУК

«Наша Ніва», № 8

Выйшаў з друку чар-нумара — артыкулы говы нумар віленскай беларускай газеты «Наша Ніва». Чытачам прапануецца дэбют двух новых аўтараў выдання — гэта Мэва Марон і Крыс Лонг — спецыялісты па ірландскай тэматыцы з ангельскага горада Брэкнэл. Іх атрыкулы «Ліст з Бэлірашу» і «Ванэса на мемарыяльнай дошцы» багатыя на параўнанні ірландскай і беларускай культур. Змешчана таксама эсэ Х. Л. Борхеса «Ірландыя». Спаміж іншых публікацый Юрася Шаўцова пра хрысціянскія канфесіі на Беларусі і Алеся Чобата пра сутнасць беларускага кансерватызму, ёсць эсэ Уладзіміра Арлова — пра Берлін. З літаратурных твораў друкуюцца апавяданні Невядомага Аўтара і А. Э. По, вершы А. М. і Шарля Перо. Ёсць шмат лістоў, дзённікаў, нататак ды іншых твораў у эпісталярным жанры. Апытанне «НН» гэтым разам прысвечана беларускім асаблівасцям эстэтыкі кахання.

«Беларуская думка», № 9

У раздзеле «Спадчына» аб'яднаны шэраг публікацый, якія асвятляюць розныя аспекты духоўнасці, вяртання да вытокаў: «Лёс лагойскага музея» С. Анучіча (пра братоў-археолагаў Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў), «Адмірал з Клятнога» У. Глушакова (пра адмірала І. Хурса), «Слова паэта клікала ў бой» М. Жыгоцкага (Якуб Колас у гады вайны).

«Культура і адукацыя» — гэта роздум-парады прарэктара Магілёўскага педінстытута імя А. Куляшова І. Мартынава «Выхаванне прыгажосцю», развагі В. Барысевіча «На раздарожжы...» (пра лёс вясковых бібліятэк), пытанні моўнай культуры разглядаюцца ў артыкуле Т. Бандарэнкі «На якой мове гаворым?..».

Змешчаны вершы М. Танка, прадстаўлены пастаянныя раздзелы «Духоўны свет», «Паліталогія», «Мемуары» і іншыя.

Пасмяёмся разам з... Жыгімонтам

Леў Казлоў — гісторык, мае навуковую ступень кандыдата. Але ў дадатак ён яшчэ і чалавек, які і ў самых важных падзеях умее бачыць і смешнае, і кур'ёзнае.

Гэтым смешным і кур'ёзным, заўважаным ім у навуковых крыніцах, ён вырашыў падзяліцца з іншымі. Атрымалася кніга «З дазволу караля вялікага князя» толькі што выпушчаная выдавецтвам «Полымя».

Наколькі аўтар прытрымліваецца фантаў, сведчыць назва першага раздзела — «Усмешкі між летапісных радкоў». А далей ідуць раздзелы: «Прыправа да гуманізму», «Дасціпны люд паспаліты», «Ад Яся да Стася», «Што дазволена Радзівілу» і іншыя.

У. Няклаеў, які напісаў прадмову да кнігі, адзначае: «З мінулым трэба развітвацца смеючыся», — парада агульнавядома, але слушная.

АНОНС

На экране... рок-«міна»

10 кастрычніка ў 17.50 у мінскім кінатэатры «Кастрычнік» студыя «Фобос. С.» прадставіць на суд гледачоў сваю новую работу — музычны фільм «B/asted» («Мінёр») маладога рыжёсёра Ніка Грэба. У фільме гучыць рок-музыка Аляксандра Растопчына, гітарыста з «Песняроў», а песні выконвае Валерый Дайнека. У праграме таксама выступленне рок-групы «Зіндан».

Спявае Іван Тамашэвіч

Лаўрэат трох конкурсаў, заслужаны артыст Беларусі, Барытон Івана Тамашэвіча сёння можна пачуць і ў эфіры, і ў канцэртных аўдыторыях. Шчаслівы лёс артыста? Драматычны лёс... Быў час, калі гэтага даравітага спевака не прымалі ў кансерваторыю толькі таму, што ён — невідушчы... Але мяняўся час, мяняліся акалічнасці, і справядлівасць у рэшце рэшт перамагла: І. Тамашэвіч стаў прафесійным спеваком, узмужнеў ягоны талент, дадалося і творчых клопатаў — Іван Мікалаевіч ажыццяўляе мастацкае кіраўніцтва музычнага аб'яднання Рэспубліканскага таварыства інвалідаў па зроку. 12 кастрычніка адбудзецца сольны канцэрт спевака ў зале Беларускай акадэміі музыкі. У суправаджэнні піяністкі Н. Максімавай ды віяланчэлісткі В. Парадзізавай прагучаць творы вакальнай класікі: М. Глінкі, П. Чайкоўскага, Р. Шумана...

Пачатак а 19-й гадзіне.

Радзім ГАРЭЦКІ

РАССТРЭЛ Максіма Гарэцкага

ЯК ВЯДОМА, Максім Гарэцкі 19.VII. 1930 г. быў арыштаваны ў Менску, а 10.IV.1931 г. асуджаны па так званай справе «Саюза вызвалення Беларусі» да высылкі на 5 год у Вятку (потым г. Кіраў), дзе адбыў тэрмін пакарання да 1935 г. Затым працаваў настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў сярэдняй школе г. Кірава (былая Пясочня) Заходняй (потым Смаленскай, а зараз Калужскай) вобласці. Тут 4 лістапада 1937 г. ён зноў быў арыштаваны, а 5 студзеня 1938 г. асуджаны.

На многія заявы, якія рабіла жонка М. Гарэцкага — Леаніла Чарняўская — у розныя інстанцыі і гарады, нарэшце 1 лістапада 1939 г. (прайшло 2 гады пасля арышту), праз Камендатуру НКУС г. Кірава (раней г. Вятка), быў атрыманы вусны адказ аб тым, што Максім Гарэцкі памёр 20 сакавіка 1939 г. у пас. Важаэль (Комі АССР). На запыт у Важаэль, ад чаго памёр М. Гарэцкі, адказу не было...

Толькі пасля смерці Сталіна, у час так званай «хрушчоўскай адлігі», паўстала магчымасць узняць пытанне аб рэабілітацыі пісьменніка, бо ў яго невінаватасці ніколі не сумняваліся ні яго родныя, ні большасць знаёмых ды, я думаю, і многія супрацоўнікі НКУСа, якія некалі судзілі вялікую колькасць бязвінных...

3 студзеня 1957 г. дачка М. Гарэцкага — Галіна — паслала заяву ў Пракуратуру СССР з просьбай аб пасмяротнай рэабілітацыі бацькі. 17 лістапада гэтага ж года Вярхоўны Суд БССР перагледзеў справу: «постановление от 10 апреля 1931 г. в отношении Горецкого Максима Ивановича отменено и делопроизводством прекращено за недоказанностью обвинения». Аб гэтым рашэнні 17 верасня 1958 г. была атрымана адпаведная даведка. Але поўнай рэабілітацыі няма, месца і прычына смерці невядома, таму Галіна Максімаўна зноў і зноў піша заявы... 7 лютага 1959 г. прыйшла даведка: «...постановление Тройки УНКВД по Смоленской области от 5 января 1938 года в отношении Горецкого Максима Ивановича... отменено и дело о нем производством прекращено за отсутствием состава преступления».

На афіцыйны запыт з г. п. Важаэль было атрымана паведамленне, што ў спісках зняволеных М. Гарэцкага не аказалася. Здавалася, зусім абарвалася апошняя нітачка ў пошуках месца яго смерці. У «Пахавальнай», якую выдалі Галіне Максімаўне ў 1958 г. у Ленінградзе, сказана толькі, што М. Гарэцкі памёр 20 сакавіка ад крывазліцця ў мозг. Такую дату смерці пісьменніка можна прачытаць ва ўсіх даведніках, энцыклапедыях, падручніках і іншых працах. Але гэтая даведка — яшчэ адзін здзек сістэмы з яе ахвяр, бо такі час і месца смерці былі чарговай хлуснёй...

З дапамогай Генадзя Лавіцкага і Алеся Вераса (КДБ Беларусі), якім выказваю шчырую падзяку, я меў магчымасць азнаёміцца са справай № 13036. Яна была заведзена на Максіма Гарэцкага ў сувязі з яго арыштам у г. Кіраве у 1937 г., а ў маі 1992 г. па запыту КДБ Беларусі прыслана з г. Калугі Упраўленнем Міністэрства бяспекі Расійскай Федэрацыі па Калужскай вобласці.

Іду ў КДБ Беларусі. Вялікі будынак з магутнымі калонамі па праспекце Францішкі Скарыны. Масіўныя дзверы цяжка адчыняюцца, і ахоплівае трывога і нейкае хваляванне... Але страху няма. Уяўляю, чамусьці кожны раз па-рознаму, але заўсёды з жудасцю і страхаццём, малюнак, як прыводзілі ў падобны суседні будынак майго тату, дзядзьку і тысячы іншых пакутнікаў у тыя гады... Стараюся ўявіць іх стан і пачуцці, і холад прабягае па спіне... Іду па калідорах і думаю, а раптам пачуецца: «Грамадзянін! Тварам да сцяны!» Але, слава Богу, не! Ветлівыя падцягнутыя хлопцы і больш сталыя людзі, большасць у цывільным. Некаторыя вітаюцца, хаця і не ведаюць мяне (як у вёсцы), а гэта так дзіўна і вельмі прыемна. Як добра, што зараз няма той навалы дзяржаўнага гвалту, таго дзікага самадурства і бясконцага страху! Толькі за гэта можна пацярпець усе тыя нягоды, якія прынесла нам перабудова, і дзякаваць за тое, што яна ўсё ж прыйшла...

Уважліва праводзілі ў пусты кабінет нейкага начальніка, які павінен быў пайсці з працы, бо цяжкасці сучаснага часу закранулі і КДБ: скарачэнне штатаў і інш. Пакідаюць мяне ў тым кабінеце аднаго. На сценах, як і ў іншых памяшканнях, партрэты Ф. Дзяржынскага і Ю. Андропава, — адзіных (апрача гэкачэпіста Кручкова) кіраўнікоў гэтай службы, якія не былі расстраляны, памерлі сваёй смерцю, і, відаць, засталіся кумірамі не толькі былых, але і сучасных супрацоўнікаў КДБ.

Перада мной справа № 13036 «по обвинению гражданина Горецкого Максима Ивановича по ст. 58 п. 10, ч. 1 УК РСФСР. Начато 3 декабря 1937 г., окончено 22 декабря 1937 г.» Чаму такія даты пачатку і заканчэння, зусім незразумела, бо пачалася яна значна раней і закончылася пазней. Звычайная папка з кардону шэра-жоўтага колеру з пяццю нумарамі далейшых архіваў і апошні з іх — П-9470. У суправаджальнай паперы адзначана, што ў справе няма лістоў 1—6 і 15—16. І праўда іх няма! Адзін з супрацоўнікаў КДБ Беларусі, які перадаваў мне папку, гэта тлумачыць тым, што такія памылкі могуць быць пры перадачы з аднаго архіва ў другі ці пры згубе некаторых дакументаў. Але Таццяна Процька — гісторык, якая ўжо некалькі гадоў займаецца архіўнымі справамі такога толку і якая прысутнічала пры гамонцы, тут жа вызначыла: «Нехта хоча схаваць сляды!»

У справе 60 лістоў, у тым ліку і 8 згінуўшых. Найбольш стары па часе дакумент (ліст 10) — даведка аб заканчэнні адбыцця ссылкі М. Гарэцкага. Гэта — галоўны дакумент высланага, без якога нікуды... Даведка зроблена на дрэннай паперы са школьнага сшытка і выдадзена М. Гарэцкаму ў Кіраве начальнікам «УО УГБ НКВД по Кировскому краю» 21 ліпеня 1935 г. «...В том, что он отбывал меру Социальной защиты в г. Кирове, и освобожден 21-го июля 1935 года по отбытии меры Соцзащиты. Видом на жительство служить не может. При утере не возобновляется». Гэтым закончылася ссылка ў Вятку (Кіраў), дзе Максім Гарэцкі спачатку працаваў землякопам, потым чарцёжнікам, тэхнікам-каштарыснікам. У Вятцы год жыў адзін, а потым, з чэрвеня 1932 г., разам з сям'ёй (жонка і двое дзетак — Галя і Лёня). Жыццё было цяжкае. Каб пракарміць сям'ю, прыходзілася многа працаваць і часта браць працу дамоў. Але не займацца літаратурай ён не мог і аднекуль знаходзіліся час і сілы, каб апрацоўваць «Віленскіх камунараў» (у 1934 г. паслаў рукапіс у выдавецтва ў Менск), пісаў рускі варыянт «Виленские воспоминания».

Л. Чарняўская ва ўспамінах «Памятка» («Полымя», 1990, № 1, с. 170—176) піша: «Жылося цяжка. Працавалі мы абое, многа, а дастатку не было. Стамляліся, нерваваліся... Суседзі па доме (двухпавярховым) адносіліся да нас добра, нават з паважаннем. У Вятцы прызвычаіліся да палітычных ссыльных. Ніхто не забараняў сваім дзецям гуляць і дружыць з Галяй і Лёнем. Такія ж адносіны былі да іх у школе. Але для Максіма становішча ссыльнага было маральна цяжкім. Штотыдзень ён хадзіў на рэгістрацыю ў камендатуру. Балюча калола сваё прозвішча ў спісках лішэнцаў у часе выбараў у мясцовыя Саветы...

Найбольш балела Максіму тое, што колькі ні прасіў, не мог атрымаць дазвол з'ездзіць у наведкі да бацькоў на Беларусь.

...Маці ніяк зразумець не магла: не сядзіць жа сын у вастрозе, ходзіць вольна, жыве з сям'ёй, працуе, нават часам грошы ім пасылае, а ўсё не едзе. Чакала, чакала і не дачакалася. Падняла цяжкі кошык з бульбай, надарвалася і памерла ў пачатку сакавіка 1935 года. Якім вялікім горам была гэтая смерць для Максіма.

...Нарэшце ён атрымаў пашпарт. Можна было падацца бліжэй да бацькаўшчыны, бліжэй да межаў Беларусі. Ехаць у Мінск шукаць там работы ён не адважыўся, бо ведаў адносіны некаторых пісьменнікаў да сябе. Аповесць «Віленскія камунары» ён паслаў у выдавецтва значна раней, але ніякага адказу не меў».

У канверце (ліст 37 справы) ляжыць гэты пашпарт, выдадзены 22 ліпеня 1935 г. і сапраўдны на тры гады. Тут жа «Личная книжка запасного Рабоче-Крестьянской Красной Армии», дзе сказана, што М. Гарэцкі — «рядовой, род войск — артиллерия, должностная квалификация — разведчик».

У жніўні 1935 г. М. Гарэцкі паехаў у Смаленск. Там атрымаў накіраванне (ліст 18 у справе), якое напісана ад рукі на невялікім кавалку паперы ў клетку са школьнага сшытка і датавана 31.VIII. 1935 г. «Заведующему Песочинским РОНО. На основании Вашей личной договоренности с тов. Горецким М. И. направляем его в Ваше распоряжение для использования в качестве учителя Песочинской средней школы. Зам. зав. школьным сектором» (подпіс няясны). На накіраванні стаіць рэзалюцыя «Зачислить в среднюю школу с 1.IX. 35 г.» Так ён стаў настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў сярэдняй школе гар. пасёлка Пясочня (пазней г. Кіраў).

Жонка пісьменніка ўспамінае: «Максім напісаў мне, каб мы рыхтаваліся да пераезду. Я і пачала патрошку збірацца, але, як на тое ліха, цяжка захварэла на дызентэрыю. ...Выклікалі тэлеграмай Максіма... У школе яго чакалі, ён забраў з сабою Лёню... У Маскве на вяземскі цягнік спазніліся. Заначавалі ў Уладзіміра Іванавіча Пічэты. Ён і жонка вельмі гасцінна прынялі Максіма з Лёнем, добра частавалі іх». Акадэмік Пічэта таксама адбываў ссылку ў Вятцы і сябраваў з М. Гарэцкім. Незадоўга перад ад'ездам апошняга яму дазволілі пераехаць у Маскву.

Як успамінае Галіна Гарэцкая («Наша сям'я». Максім Гарэцкі. Успаміны, артыкулы, дакументы. Мінск. «Мастацкая літаратура». 1984. С.21—58): «Школа была недалёка ад дому, на той жа вуліцы Леніна, бліжэй к цэнтру пасёлка. У самым цэнтры — чыгуналіцейны завод і заводскі клуб. Перад нашым домам раслі ў адзін рад некалькі старых высокіх таполяў. За двором і агародамі пачынаўся балоцісты лес. З другога боку пасёлка, каля завода, — вялікае возера. Навокал лясы. Рынак быў блізенька ад нас, па сцяжынцы ад калодзежа ўлева.

Мама пасля цяжкой хваробы часова не працавала. Бацька меў многа ўрокаў у школе, чытаў лекцыі па літаратуры ў заводскім клубе і чырвонаармейцам у ваенкамаце, вёў заняткі па лікбезу... Як мог не забываўся на выспу Патмос: пісаў «Камароўскую хроніку»... Арганізаваў літаратурны гурток. Сорак два вучні ўваходзілі (спісак захаваўся). Стараўся зацікавіць вучняў гісторыяй іх роднага краю».

Л. Чарняўская: «З новага 1936 г. пасёлак Пясочня быў перайменаваны ў раённы горад Кіраў Заходняй вобласці. Так і трапілі мы з Кірава абласнога ў Кіраў раённы. Адчувалі мы сябе тут вельмі адзінока. Максім нават не меў часу заводзіць знаёмства з сем'ямі настаўнікаў, не ведаў, ці захочуць яны знацца з былым ссыльным».

Улетку 1936 г. М. Гарэцкі разам з дачкою наведаў Багацькаўку.

Г. Гарэцкая: «18 чэрвеня а сёмай гадзіне сонечнай раніцы прыехалі ў Смаленск. Пайшлі ў горад. Падняўшыся на гару, ішлі па роўнай вуліцы, злева ўсцяж тратуара зрэдку зялёныя дрэвы. Насустрач групкамі і па адным чырвонаармейцы. Некаторыя мне падмігваюць: «Гэй, курносая!» Глянула сарамліва на бацьку, а ён ідзе справа побач, стройны, дужы, і ўсміхаецца. У сінім шавіётавым касцюме, белай летняй фуражцы. Вышэй сярэдняга росту быў, вочы карыя, даволі вялікія, хоць і глыбокія. Усмешка прыгожая, добрая. Сорак тры гады было яму, а мне пятнаццаць».

З Багацькаўкі М. Гарэцкі на адзін дзень завітаў у Мінск, каб даведацца аб лёсе рукапісу «Віленскіх камунараў». Але была нядзеля і ён нікога не пабачыў, апрача Алеся Вечара, якога выпадкова сустрэў на вуліцы, і вярнуўся ў Кіраў у прыгнечаным настроі...

Г. Гарэцкая: «22 ці 23 жніўня 1936 года бацька, ужо з Лёнем, зноў прыехаў у Малую Багацькаўку. Мусіць, у тое лета запісаў ён «Камароўскі парад» — пералік усіх трыццаці пяці двароў у вёсцы і кароценькія звесткі аб гаспадарах і сем'ях іх».

У кастрычніку ў госці на некалькі дзён прыехаў брат Гаўрыла Гарэцкі з жонкай, які к гэтаму часу вызваліўся з ссылкі (Беламорска-Балтыйскі камбінат). Браты не бачыліся больш за 6 гадоў. Гамонкам не было канца. Радасць вялізная! Л. Чарняўская: «Гэта была адзіная радасная падзея ў тагачасным нашым жыцці!»

Г. Гарэцкая: «Увосень 1936 года грыбы добра раслі. Бацька і Лёня прыносілі іх поўнымі кошыкамі, а мама саліла, сушыла, марынавала, смажыла... Дапамагала яна бацьку як магла ў яго працы: правярала вучнёўскія сшыткі, дапамагала рыхтаваць патрэбны матэрыял для ўрокаў. Пераклала маці на беларускую мову яго апавяданне «Дедушка».

Набліжаўся 1937 год — сумнавядомы як год найбольшага ўздыму сталінскіх рэпрэсій. Раслі страх, недавер адзін да другога, нават да самых блізкіх сяброў, квітнелі даносы... Асабліва цяжкае становішча склалася ў былых ссыльных, бо яны адчувалі, як цёмныя хмары ходзяць над імі. Многія людзі стараліся быць далей ад іх, не ведаць іх (раптам трапіш у ранг тых, хто мае «сувязь з ворагам народа»), некаторыя, наадварот, надта цікавіліся мінулым. Былі створаны так званыя «тройкі», якія надзяляліся асобымі паўнамоцтвамі і выносілі канчатковыя прыгаворы.

У справе (ліст 17) — дакумент пад грыфам «Совершенно секретно» ад 9 студзеня 1937 г., які пасланы са Смаленска ад НКУС па Заходняй вобласці:

«Начальнику Кировского РО УНКВД лейтенанту Госбезопасности тов. Карасеву. Предлагаем немедленно исполнить наш № 7524/5 от 16.XII.36 г. о Горецком.

Нач. 4 отдела УГБ ст. лейтенант Гос. безоп. (Малыгин)

Нач. 5 отделения 4 отдела УГБ лейтенант Гос. безоп. (Левинсон)

Ужо ў канцы таго ж месяца (28.1. 1937 г.) па тым жа адрасе ад тых жа начальнікаў ідзе папера (ліст 20): «В четвертый раз просим исполнить наш 4524/5 от 16.XII. 36 г. о Горецком. Несвоевременный ответ по такому важному делу мы расцениваем, как Вашу оперативную немощь. Если Вы не в состоянии выполнить наше задание в отношении Горецкого, сообщите, мы выделим оперативного работника на место, который это сделает».

У чым сэнс «нашага 7524/5 от 16.XII. 36 г.» (нумар у другой паперы — 4524/5, відаць, памылковы), можна толькі здагадвацца. Таксама застаецца невядомым, чым выкліканы гэтыя загады. Разгадка, можа, у тых знікнуўшых лістах 1—6?

Наступная па часе выканання папера (ліст 7) — гэта пісьмо з рэдакцыі газеты «Правда» ад 19.III.1937 г. пад грыфам «секретно» на адрас Абкома ВКП(б) тав. Румянцаву за подпісам члена рэдкалегіі Бегавога.

«Пересылая Вам письмо Васильева П. П. «Киров, Западной обл., Ленина, 78), сообщаем, что устно Васильев рассказал следующее.

В средней школе в Кирове, где работал Васильев в качестве преподавателя математики и физики в январе 1937 г. на вечере памяти Ленина докладчик преподаватель литературы Горецкий М. И. назвал троцкистско-зиновьевскую банду оппозицией и сказал, что в нашем обществе еще имеется эксплоатация человека человеком.

Что имеется такая эксплоатация говорил на этом же вечере в вводном слове член ВЛКСМ — преподаватель истории Азаров (члены партии — в том числе парторг школы Якушенко — на вечере не присутствовали).



Горецкий сказал еще, что страной руководила оппозиция и только теперь избавились от этого руководства. Он — в прошлом белорусский националист, недавно вернувшийся из ссылки.

Ученики в школе делают контрреволюционные надписи. На плакате о вечере памяти Ленина написали: вход 1 руб. (В 1935 г. в школе был случай «расстрела» портретов вождей из рогатки).

Отдел школ обкома, получив сигнал обо всем этом из «Правды», переслал материал в райком, и последний поручил расследовать дело культпропу райкома Савельеву, который одновременно является преподавателем истории в той же школе.

Горецкий продолжает работать в школе».

З «Памяткі» Л. Чарняўскай можна даведацца: «З'явіўся новы чалавек ў школе — настаўнік Васільеў. ...Памятаю, што прыйшоў ён да нас. Я пачаставала яго чаем, а ён азіраючы нашу ўбогую мэблю, запытаўся: «Што, у вас усё канфіскавалі?» Відаць, ён чуў аб нейкай рэпрэсіі ў адносінах да Максіма, а тактам не вызначаўся...

У канцы студзеня 1937 года ў школе меліся адзначыць дзень памяці Уладзіміра Ільіча Леніна. Дырэктар даручыў Максіму зрабіць даклад на ўрачыстым школьным вечары. Дырэктар, прачытаўшы напісаны даклад, ухваліў яго. На вечары вучні ўважліва слухалі. Але праз некаторы час дырэктар выклікаў да сябе Максіма Іванавіча і паказаў яму карэспандэнцыю, пасланую Васільевым у «Известия». Там чорным па беламу было напісана, што выкладчык літаратуры М. І. Гарэцкі, былы ссыльны, якога прыцягвалі да судовай адказнасці па 58 арт., і тут не спыняе варожай дзейнасці, што ў сваім дакладзе на ўгодках памяці У. І. Леніна Гарэцкі няправільна асвятляў рэвалюцыйныя падзеі, мала ўвагі аддаваў Сталіну. ...Дырэктар, малады камуніст, сумленны чалавек, адказаў у рэдакцыю газеты, што настаўнік М. І. Гарэцкі ў сваім выступленні нічым не адступіў ад даклада, праверанага ім, дырэктарам, ...і без таго прыгнечаны сваім становішчам Максім Іванавіч устрывожыўся».

Лісты 8—9 справы — «Докладная записка учителя средней школы Васильева П. П.». Яна напісана ад рукі чарнілам, але невядома, калі і каму адрасавана. Улічваючы зваротны адрас («Москва, Леонтьевский 4 дом учителя общежитие»), можна адзначыць, што «запiска» напісана пасля таго, калі Васільеў ужо не жыў ў Кіраве. З яе можна даведацца, што Васільеў пачаў працаваць у школе з кастрычніка 1936 г., што ён «неоднократно ставил вопрос перед директором и партийной организацией школы... об улучшении политико-просветительской работы...»

А далей ён пісаў: «В прошлом, задолго до моего приезда, в школе имели место такие контрреволюционные хулиганства, как расстрел портретов вождей... в школе имел место следующий возмутительный факт... В своем докладе Горецкий допустил ряд грубейших выпадов против партии и родины. Из отдельных частей его речи вытекало, что до 1936 г. наша родина находилась под руководством «оппозиции» — так мягко он именовал банду убийц, агентов гестапо, троцкистско-зиновьевскую мразь. ...Я написал в «Правду», что мне было поставлено в вину, когда же заметка была передана в Обком ВКП (б) для расследования.

Расследование проводил главный виновник злополучного вечера т. Савельев, который, как позднее сообщил Азаров, проверил тезисы Горецкого.

Выяснилось, что М. Горецкий известный белорусский националист, недавно отбывавший наказание за контрреволюционную деятельность. Чем закончилось расследование мне неизвестно: меня сняли с работы».

Супастаўленне дат розных дакументаў паказвае, што «наш 4524/5 от 16.XII.36 г.» быў дадзены яшчэ да вечара памяці У. Леніна, які адбыўся ў студзені 1937 г. Дакумент «в четвертый раз просим исполнить наш 4524/5 от 16.XII.36» пасланы 28.I.37., гэта значыць адразу пасля вечара. Але і той і другі, відаць, не былі выкліканы «заметкай» Васільева аб вечары і пісьмом «Правды». Значыць, нейкі штуршок быў зроблены раней — ці тым жа Васільевым, які прыйшоў у школу ў кастрычніку 1936 г., ці, можа, яшчэ кім-небудзь.

Праўда, у той час, хутчэй за ўсё, дзейнічала такая ўстаноўка, якая ішла ад самога Сталіна, што не трэба было і асаблівых «штуршкоў», каб пасадзіць і пакараць любога чалавека. Асабліва гэта тычылася былых ссыльных. Аб такіх абставінах таго часу сведчыць нядаўна надрукаваны ў «Известиях» (№ 135 ад 11 чэрвеня 1992 г.) артыкул аб рассакрэчванні асабістага архіву «вождя народов» «Иосиф Сталин: «Виновных судить ускоренно. Приговор — расстрел». Як сведчыць газета, «...на сотнях документов рукой вождя начертаны резолюции — «арестовать, расстрелять». Прынамсі у якасці прыкладу прыведзены адказ Сталіна на пісьмо са Смаленска ад 26. VIII.37 г. выконваючага абавязкі сакратара Захабкома Каротчанкава аб тым, што ў Андрэеўскім раёне Спецкалегія аблсуда «приступила к слушанию дела контрреволюционной банды вредителей, орудовавшей в сельском хозяйстве района». На наступны дзень ад сакратара ЦК Сталіна атрыманы адказ: «Советую приговорить вредителей Андреевского района к расстрелу, а о расстреле опубликовать в местной печати». Таму былі даносы ці не былі — вынік быў бы аднолькавы: дабіралі незагінуўшых у мінулыя гады «недабітых» «ворагаў народа».

Але вернемся да нашай справы.

Яшчэ ўзімку 1937 г. да Гарэцкіх прыехаў пагасцяваць Максімаў бацька, якому ўжо было за 80, але ён меў ясны розум і добрую памяць. Пісьменнік удакладняў свае запісы да «Камароўскай хронікі», распытваючы бацьку пра старадаўняе жыццё.

Г. Гарэцкая: «Тата запісваў ад яго пра службу ў паноў. Засталіся невялікія чарнавікі апавяданняў, напісаных на аснове дзедавых успамінаў і дзіцячых уражанняў бацькі: «Голубая кровь», «Кобылёшка», «Предводитель дворянства Рындин», «Лёксочка», «Хиромант».

Л. Чарняўская ўспамінае: «Летам Галю выправілі ў Багацькаўку, Лёня паехаў у піянерлагер. Максім накіраваўся ў Смаленск. Падаў заяву ў педінстытут, каб дазволілі здаць экстэрнам экзамены на атрыманне дыплома аб сканчэнні інстытута. Хоць меў ён свае навуковыя працы, гэта не лічылі за закончаную вышэйшую адукацыю. Са Смаленска паехаў у Маскву, зайшоў да Пічэты, але адразу ўбачыў, што сустрэлі яго насцярожана, сцюдзёна. Не пакрыўдзіўся і не здзівіўся — такі быў час».

Г. Гарэцкая: «У канцы лета тата прыехаў за мною ў Малую Багацькаўку. Прыходзілі пагаманіць з бацькам вяскоўцы. У садзе дзедавым пад яблыняй-бярозаўкай, недалёка ад ліпкі, каля сцяжынкі, што вяла ад сянніцы к рамчакам, зрабіў калісьці тата невялікі столік і дзве лавачкі. Цяпер любіў пасядзець тут, пагаманіць з бацькам сваім, гасцямі».

Л. Чарняўская: «...Дома пераглядаў «Виленские воспоминания»...

...Калі Лёня прыехаў з піянерскага лагера, Максім хадзіў з ім у лес па грыбы, купаўся ў возеры.

...Пачаўся новы навучальны год у школе. І зноў закруцілася кола: урокі, падрыхтоўка да іх, заняткі ў лікбезе, лекцыі па літаратуры ў ваенкамаце. ...трывога не пакідала Максіма Іванавіча. Думаў, што будзе з сям'ёй. Параіў мне падаць на развод, шукаць працы ў Смаленску або вярнуцца ў Кіраў-Вятку. Я толькі пакруціла галавой: ні ў Смаленск, ні ў Вятку ахвоты ехаць не мела».

Г. Гарэцкая: «...У Пясочні ў гэты год дастаў тата скрыпку, збіраўся купіць яе. Іграў зрэдку свае мелодыі-імправізацыі, багацькаўскія песні, а на балалайцы — варыяцыі на мелодыю «Горные вершины спят во тьме ночной» і інш. На скрыпцы ён таксама цудоўна іграў».

«У адзін з першых дзён лістапада бегла я па сцяжынцы са школы дамоў. Насустрач ішоў бацька. Параўняўшыся, з пяшчотаю ў голасе прамовіў: «А чыя ж гэта птушачка так шыбуе?» І пайшоў далей. У тыя ж дні ўбачыла яго на кухні, ля акна. Стаяў, глядзеў засяроджана на вуліцу і мяне падазраў. Па другой старане вуліцы ішла мама. «Запомні, — сказаў,— яна святая!» — і паўтарыў: «Святая!»

Лёня ўсё да бацькі туліўся, тата пра нешта жартаваў з ім».

Л. Чарняўская: «...Прыслала ў канцы кастрычніка пісьмо Лара Гарэцкая. Паведамляла: «Гурык пайшоў з дому. Цяжка і страшна». Страх і цяжар зваліліся і на нас. А што рабіць? Максім, як і раней, хадзіў на працу ў школу, вучыліся дзеці. Хаця не быў упэўнены, што для яго самога абыдзецца ўсё добра, ён думаў, як ратаваць брата. Напісаў ліст Сталіну. Прасіў разабрацца ў справе Гаўрылавага арышту.

...Максім перагледзеў усю сваю карэспандэнцыю. Нічога ў ёй не было такога, што магло б каму пашкодзіць. Але, успомніўшы, як насцярожана размаўляў з ім Пічэта, знішчыў яго пісьмы. ...І раней ...пазбягаў пісаць пра свае сустрэчы з Купалам, Коласам, Бядулем, маладнякоўцамі, узвышаўцамі. Лічыў сябе заплямленым пасля 1930 года і не хацеў рабіць прыкрасць другім».

І нездарма быў такі настрой у Максіма Гарэцкага, бо ўжо ў гэты час, у канцы кастрычніка 1937 г., выходзіць папера (ліст 25):

«Постановление

1937 года Октябрь 27 дня г. Смоленск

Я, начальник Кировского РО УНКВД сержант Гос. безопасности Быстров, рассмотрев материал на гражданина:

Горецкого Максима Ивановича, 1893 г. рождения, уроженца Малая Бочатьковка, Мстиславского р-на, БССР, по национальности белорус. В 1922 г. арестовывался польскими властями, перебежчик. Судимый к 5 годам лишению свободы за участие в контрреволюционной организации белнацдемов, образование имеет высшее, работает учителем средней школы в гор. Кирове.

Принимая во внимание, что он подозревается в антисоветской деятельности, а поэтому руководствуясь ст. 145 УПК —

Постановил:

гр-на Гурецкого Максима Ивановича арестовать и содержать под стражей гор. Сухиничи.

Нач. Кировского РО
сержант госбезопасности
(Быстров).

«Согласен». Нач. 3 отдела УГБУНКВД
с/о ст. лейтенант госбезопасности
(Эстрин).

У левым кутку паперы: «Утверждаю пом. нач. 3 отдела УГБУНКВД С/О капитан госбезопасности (Викторов)» і лічба 24.X.37 (чамусьці ранейшая, чым у самой пастанове). Наўскос чарнілам напісана: «Арест санкционирую 31.X.37 г.» і незразумелы подпіс.

Адначасова сяржантам Быстровым была падрыхтавана «Справка на арест Горецкого М. И.» (ліст 26), у якой прыводзіліся прыблізна тыя ж звесткі, што і ў пастанове. Яна была «утверждена 26.X.37 г.» капітанам Віктаравым і зноў наўскос тым жа почыркам: «Арест санкционирую. 31.X.37 г.»

2 лістапада 1937 г. пад грыфам «совершенно секретно» ў г. Кіраў быў адпраўлены дакумент (ліст 19): «Начальнику РО УНКВД с/о сержанту госбезопасности тов. Быстрову. Согласно прилагаемого постановления произведите арест Горецкого Максима Ивановича. О исполнении немедленно сообщите. Следственное дело оформите по линии 3-го отдела. Следствие ведите на месте.

Пом. нач. 3 отдела УГБУНКВД с/о
лейтенант госбезопасности
(Федосеенко)».

Як у гэтых дакументах, так і ў далейшых дзівіць неахайнасць іх саставлення, вялікая колькасць граматычных памылак. Відаць, спраў было шмат, спяшаліся. Як бачым, замест Богатьковка — Бочатьковка, Горецкого — Гурецкого...

З кастрычніка Быстроў (подпіс не расшыфраваны, але па параўнанні відаць, што гэта ён) падпісвае на бланку замест начальніка УНКВД З/в ордэр (ліст 27): «Выдан сотруднику УГБ НКВД З/о Прудникову на производство обыска и арест гр-на Горецкого М. И.»

Ужо ў ноч з 3 на 4 лістапада ўпаўнаважаны Прудзікаў разам са сваімі памагатымі Сябекіным і Куракіным у прысутнасці дырэктара школы Азарава склаў «Протокол обыска» (ліст 28), напісаны простым алоўкам. Пералічана, што «при обыске обнаружено для доставления Кировский р/о следующее:

1) Личная переписка на 282 листах (Двести восемьдесят двух листах), подшитые в 5-ти сшитках

2) Конвертов от личной переписки из под полученных писем 42 шт (сорок два) подшиты в один сшиток

3) Паспорт на имя Горецкого М. И. сер. ГЕ № 139204

4) Воинская книжка на имя Горецкого М. И.

5) Справка Городецкого о отбытии срока».

Унізе пратакола рукой Максіма Іванавіча напісана: «Претензий на производство обыска мною заявлено не было, но считаю, что взяты материалы, которые не могут быть названными «обнаруженные для доставления в НКВД».

Л. Чарняўская (1990) успамінае: «Пачатак лістапада. Кароткія, туманныя дні. І вось у такую цёмную ноч пастукалі ў акно. Стук уначы. Першы раз мы пачулі яго 19 студзеня 1922 года, калі Максіма арыштавалі па загаду дэфензівы і пасадзілі ў Лукішскую турму. Другі раз у ліпені 1930 года ў Мінску. Гэты арышт даў высылку ў Вятку. А гэта трэці раз!

Увайшлі чатыры чалавекі... Запалілі святло. Былі ветлівыя. Прагледзелі і забралі частку рукапісаў, перапіску. Лісты Якуба Коласа да мяне Прудзікаў з уклонам падаў мне, не ўзяў і паштовак, што пасылаў Максім з Вяткі мне ў Мінск на Заслаўскую вуліцу. Забралі ліст Марыі Дзмітрыеўны, жонкі Коласа, да мяне ў Вятку. Ліст да Сталіна Максім разарваў папалам, пачуўшы стук у акно. Паглядзелі — і не ўзялі. На стале ляжала паперка з адрасам настаўніка з раёна, які абяцаў збіраць этнаграфічны матэрыял. Калі аператыўнікі разглядалі рукапісы, Максім улічыў момант, скамечыў паперку і кінуў у попельніцу. Дырэктар Азараў паглядзеў скоса і нічога не сказаў. Выгляд у яго быў сумны.

Напісалі пратакол. Развіталіся. І ён пайшоў спакойны з выгляду, але Лёня ўспамінаў пазней, будучы на ленінградскім фронце, развітальны погляд бацькі.

Пачало днець. Раніца была шэрая, золкая. Дзеці пайшлі ў школу. З якім настроем яны сядзелі на ўроках, можна ўявіць сабе. Вучні ведалі ўжо, што іх настаўнік арыштаваны, але ў адносінах да Галі і Лёні трымаліся тактоўна, нічога не пыталіся. Я прыбіралася дома. Трэба сказаць, што нічога раскідана не было. Я паклала на месца рукапісы, фатаграфіі, якія не забралі. Задумалася, што далей рабіць.

Калі дзеці прыйшлі са школы, я сабрала перадачу: ручнік, бялізну — і панесла ў будынак міліцыі. У тую ноч сутарэнне там значна папоўнілася новымі людзьмі. Перадачу дзяжурны спачатку не хацеў узяць, нарэшце згадзіўся, і прынёс запісачку ад Максіма. Ён прасіў прынесці яму лыжку, кубак, трохі цукру, два сшыткі, карандаш. Калі выходзіў з дому, запэўнілі, што нічога з сабой браць не трэба, усё дадуць. А выйшла, што есці не было чым, піць не было з чаго. На другі дзень я прынесла ўсё, што прасіў, яшчэ хлеба і булак.

Вокны, правільней, адтуліны ў падвале, выходзілі на двор. Жонкі арыштаваных прапанавалі свае паслугі — піляваць дровы — і ў перапынку работы падыходзілі да вакенцаў. У мяне не хапіла смеласці пайсці ў двор. Баялася пашкодзіць, спадзявалася, што хутка Максім вернецца дамоў, у школу. Але другія казалі: невядома, як што павернецца. Прыемна было, што суседзі нашы Мішуткіны прыхільна, як і раней, адносіліся да нас.

Зайшла са школы настаўніца Даброва, нібы па малако да Мішуткіных, спынілася ў прахадным калідорчыку, пыталася, што ў нас чуваць. Казала, што дырэктара выклікаў следчы. Ён вярнуўся сумны, нават заплакаў з жалю. Але ўсё ж у нас не гасла надзея,што ўсё абыдзецца. Максім прасіў прысылаць яму кніжкі: «Паэмы» Пушкіна, «Граматыку» Багародзіцкага. Значыцца, і ён спадзяваўся на лепшае».

(Заканчэнне будзе).

СХІЛІЛІ СЦЯГ НАД МАГІЛАЙ

Слова прамаўляе Мікола КУПАВА.
Фота В. САВІЧА.

З кастрычніка ў Талачыне на гарадскіх могілках адбылося адкрыццё помніка на магіле Лявона Баразны (1929—1972). Ушанаваць памяць мастака, што трагічна загінуў 20 год назад, прыехалі з Мінска (са сталіцай была звязана большая частка ягонага жыцця) сябры, аднадумцы, паслядоўнікі Лявона Цімафеевіча. Тут былі і тыя, хто добра ведаў яго пры жыцці, і тыя, для каго гэты мастак — асоба ў пэўнай ступені легендарная. Л. Баразна свядома працаваў на беларускае Адраджэнне ў тыя часы, калі карыстанне роднай мовай за межамі кватэры было падставай для абвінавачвання ў нацыяналізме з адпаведнымі высновамі адносна кар'еры і нават, як сведчыць трагічная смерць мастака, самога жыцця «нацыяналіста». Л. Баразна — аўтар шэрагу грунтоўных доследаў па народным мастацтве. Кожны свядомы беларус абавязкова хоць раз гартаў ягоны альбом «Гравюры Францыска Скарыны» — адзін з лепшых узораў мастацтвазнаўчай і навуковай Скарыніяны.

На адкрыцці помніка выступілі М. Купава, Я. Кулік, Р. Барадулін, У. Конан, Г. Сокалаў-Кубай, аўтар помніка В. Янушкевіч, іншыя.

Сябры схілілі над магілай Лявона Баразны бел-чырвона-белы сцяг — сімвал Бацькаўшчыны, якой мастак аддаў свае сілы, талент, любоў.

В. БОГУШ.

АБ'ЯВА

БЕЛАРУСКАЯ
ОРДЭНА ДРУЖБЫ НАРОДАЎ
АКАДЭМІЯ МУЗЫКІ

аб'яўляе конкурс

на замяшчэнне пасад
прафесарска-выкладчыцкага
складу (для тых, хто мае
мінскую прапіску):

кафедра фартэпіяна
старшы выкладчык—1;
кафедра канцэртмайстарскага майстэрства
дацэнт—1;
кафедра кампазіцыі
загадчык кафедры (узрост не старэй за 65 гадоў)—1;
кафедра драўляных духавых інструментаў
старшы выкладчык (флейта)—1;
кафедра струнных народных інструментаў
старшы выкладчык (цымбалы)—1;
кафедра баяна-акардэона
дацэнт (баян)—1;
кафедра аркестравага дырыжыравання
дацэнт—1;
кафедра спеваў
старшы выкладчык—1;
кафедра філасофіі
старшы выкладчык—1;
кафедра аркестравага дырыжыравання
(педагагічны факультэт Беларускай акадэміі музыкі ў г. Магілёве)
дацэнт —0,5.

Тэрмін падачы заяў—адзін месяц з дня апублікавання. Заявы і дакументы, згодна Палажэнню аб конкурсах, накіроўваць на імя рэктара на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30. Даведкі па тэл.: 27-49-42; 26-06-70.

Праўленне Беларускага фонду культуры глыбока смуткуе з нагоды заўчаснай смерці члена прэзідыума Фонду культуры, акадэміка Акадэміі навук Беларусі Мікалая Васільевіча БІРЫЛЫ і выказвае спачуванні родным нябожчыка.

Саюз пісьменнікаў Беларусі выказвае глыбокае спачуванне пісьменніку, намесніку галоўнага рэдактара часопіса «Нёман» Генадзю Бубнаву з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці БАЦЬКІ.

Рыгор БАРАДУЛІН

КАТАСТРОФЫ

Строфы ката́

Да гаспадыні

І я да болю
Рады застоллю,
Як песні рагочуць
Недзе пад столлю:

Гаспадынька гладка,
Гэта ж наша матка.
Частуй гасцей,
Каб бывалі часцей.

І паўтараю
За гаспадыняю,
Вяду адну з ёй
Такую лінію:
Дай Бог гасця,
А каля гасця і я...

Яно ж і муляр,
Муруючы печы мур,
Як і я,
Асалодліва муркаў:
— Мур-мур.
Печ мая цвярдыня,
На печы
Добрыя рэчы.
Мая заступніца —
Гаспадыня.
У хаце кумна,
У хаце тлумна.
А гаспадыня, дарэчы,
Ганяе мяне й кляне,
Не думаючы,
Што без мяне
Ёй будзе сумна.

Да кошкі

Кату без кошкі,
Як місцы без лыжкі,
Як сабаку без блошкі,
Як курцу без задышкі —
Невыносна,
І трэба нос
На
Ветры трымаць
І ў сквар і ў люць,
Каб пачуць,
Як патыхае марцам.
Трэба сябе ў мурбе
Падбадзёрыць гарцам
Не першака,
А малака,
Пажадана сырадою.
Марцаваць дык марцаваць —
Гарцаваць лепей
З кошкай рудою,
Бо, як гаспадар прыгаворвае,
Чым рыжэй, тым даражэй.
Марцаваць ільга здорава
І на двары,
І на каптуры,
І за каморaю,
А найлепш — на гарышчы.
Хай скразняк у хвастах,
Як салавей у кустах,
Свішча!
У любой эпохі
Адпаведна цёмныя лёхі.
Якая эпошка,
Такая й кошка.

Да мышкі

Ці розніца тая,
Хто каго акаляе!
Кот вырастае,
А мышка малая.
Не цярплю пацукоў,
Бо вылегчаць з ходу ката.
З сівых вякоў
Мышка — адна любата.
Шустрыя камячкі —
Хвастатыя малюпаткі.
Смачныя ў іх кумпячкі,
Салодкія ў іх лапаткі.
Пакуль недзе ў куце
Скрабецца мышына,
Кот сядзіць сцішана,
Сам у сваіх жа вачах
Расце.
На кожным бяжку
Пілнуе мышку бяда.
А ў ката ў кіпцёрах
Забываецца мышка
І гора, і страх.
Кату
Мышку-сірату
Да слёз шкада.
Кату даспадобы вышкі,
Бо на вышках
У сваіх зацішках
І кошкі, і мышкі.

Строфы ка́та

Да пятлі

Каб помніла чалавецтва
І ўранні, і ўвечары,
Што яно ўсяго
Толькі тля,
Для таго
І выдумана пятля.
Асабліва намыленая
Да шыі прыхільная.
Хто каго на каго
І чаго нацкоўвае.
А яна ўсіх прымірае,
Казытліва шэпчучы:
«Прымі, раю!»—
Пятля пяньковая.
Першае слова было,
А пасля —
Пятля.
Хто яе завязаў,
Дабро ці зло!
Хай дойдуць словы
Не толькі да вашых вушэй,
Думнік і недарэка:
Пятля адвеку вышэй
За чалавека.

Да сякеры

Сякера
Не звыкла вагацца,
Бо ў сякеры
Вера
Паганца.
Сякера ведае меру,
Не адмяраючы сем разоў,
Сячэ толькі раз.
Не розніць ні гузоў, ні тузоў,
Ні рыз, ні рас.
Ёй роўныя ўсе
Дабрадзеі і гады,
Армады і ўрады.
І над кім яе
Кат занясе,
Таго і ўпадабае.
Сякеры не перашкода
Нагода любая.

Над кожным лёс
Немінуча занёс
Сякеру
Вясёлую ад бліскучага
Ашчэру.

Да плахі

У плахі
Характар цвярды.
Апошнія крыкі,
Як тыя манахі,
Без гуку
На ёй пакідаюць сляды.
Што можа і ўразіць плаху,
Дык гэта сіла размаху,
Калі галава адпадае,
Адчуўшы ўдар.
Плаха цярплівая —
Яна галадае,
Чакае,
Калі згадае
Пра яе гаспадар.
Страхі
Уцякаюць ад плахі.
І толькі адчаю
Спадзеі яна пазычае.
Чым цвярдзей, тым надзейней
Сваха
Дубовая бокам
Сватае з урачоным змрокам.
За што ёй вырак такі
Суровы,
За што пра яе
Галовы
Загадзя думаюць блага,
Не разумее плаха.

КАЗКІ ПЕРАБУДОВЫ

Калі ў 1986 годзе М. С. Гарбачоў аб'явіў свой намер перабудаваць наша грамадства, людзі задумаліся: «А што мы пабудавалі?» Спрэчкі не сціхаюць і сёння. Камуністы кажуць, што ім не хапіла да канчатковай пабудовы развітога сацыялізму 500 дзён. Мінула куды больш, а робіцца ўсё горш. Адзін гумар. Пара нешта рабіць.

Аўтар.

Вячаслаў ПІЛІПЧЫК

Лама

Усё пачалося проста і традыцыйна. Пабраўся вучоны кібернетык з дзяўчынай-радыёфізікам. Гісторыя канца сямідзесятых гадоў не выдзеліла б гэты шлюб, каб не адна акалічнасць. Муж і жонка моцна кахалі адзін аднаго, але пастаянна спрачаліся на жыццёвыя і навуковыя тэмы. Высновы іх часта былі процілеглыя і не давалі падстаў прыйсці да згоды. Як сапраўдныя навукоўцы, яны пачалі шукаць выхад. Раіліся з калегамі, знаёмымі. Нарэшце вырашылі: трэба пабудаваць вылічальную машыну, якая па адной праграме будзе ўлічваць усе наяўныя аргументы і выдаваць справядлівае рашэнне. Ідэя захапіла ўсіх. Акрамя мужа і жонкі, хадзілі ў магазін сябры і знаёмыя, прыхоплівалі што лішняе з работы, са сметніка нумарнога завода. Цяпер пры сустрэчы толькі і гаворкі было пра высокачастотныя транзістары, тунельныя дыёды, параметроны, фотарэзістары, платы. Дома, на кухні, паялі, эксперыментавалі, дапасоўвалі вузлы і нарэшце зрабілі тое, што было задумана. Машына атрымалася на славу. Магла яна чытаць і запамінаць усё, пакуль гэта было патрэбна. Калі перайсці на інжынерную тэрміналогію, то машына мела алфавітны ўвод-вывад і пашыраную знешнюю памяць, куды пераводзіла ўсю атрымліваемую інфармацыю. На пісьмова пастаўленыя пытанні прынтар друкаваў адказы на паперы з абазначэннем парадкавага нумара, праграмы і даты. Хацелася, канешне, задаваць пытанні і атрымліваць адказы адразу голасам, але машыне дзеля гэтага прыйшлося б выконваць да дзесяці мільярдаў аперацый у секунду і мець іншую элементную базу. За такую праблему толькі нядаўна ўзяліся японцы. Згадзіліся на тое, што ёсць.

Спачатку назвалі яе Лабыма — лагічная бытавая машына. Жанчынам гэта не падабалася: імя, як у кабылы. Нехта прапанаваў назваць Элка — электронная карова. Таксама не прайшло. Вырашылі ўрэшце назваць проста Ламай — лагічнай машына. Мужчыны трохі ўдасканалілі знешні выгляд. Галаву зрабілі, як у егіпецкай прынцэсы Неферціці,— з вачыма-фотаэлементамі і аздобай-вентылятарам. Уся Лама мела форму жанчыны, якая сядзіць у мяккім крэсле. Працэсар і пашыраная памяць былі змантіраваны пад крэслам, прынтар — ззаду, у апорнай спінцы крэсла.

Калі ўсе нацешыліся знешнім выглядам, Ламу перанеслі з кухні ў залу і пачалі працэс навучання. Спачатку далі прачытаць некалькі граматык, потым — энцыклапедыі, кнігі па гісторыі, эканоміцы, сацыялогіі. За тыдзень Лама перабірала да пяцідзесяці тамоў. Муж і жонка, дарэчы, пакінулі спрачацца і замучыліся, падаючы і адносячы кнігі. Дапамаглі інжынеры з нумарнога завода. Яны зрабілі робата, які ездзіў па пакоі на колцах, браў з паліцы і клаў кнігі Ламе на калені. Тая сама брала іх у рукі і чытала.

Першымі займелі выгаду практычныя суседкі. Яны нанеслі кніг па дамаводстве, кулінарыі, кансерваванні. Дзеля атрымання аптымальных рэцэптаў па ўсіх кулінарных праблемах давялося ўдасканаліць праграму аналізу. Цяпер Лама выкідвала спрэчныя і неверагодныя рэчы, а потым падводзіла вынікі. Лама стала ўсеагульнай любіміцай. У суседзяў з'явіліся новыя выразы: Лама сказала, Лама лічыць, Лама думае. Адначасова з'явіліся і хваробы: У Ламы прабіла дросель стабілізатара, у Ламы сеў транзістар. Ад наведвальнікаў не было адбою. Кожны нёс дадому надрукаваны адказ на сваё пытанне. Калі папера стала дэфіцытам, прыйшлося ўрэзаць інтарэсы суседзяў.

Першы збой атрымаўся, калі суседскі сын-школьнік разбіў чайнік з дарагога сервіза. Маці раскрычалася і патрабавала ўсыпаць. Довады бацькі і сына, што зрабіў ён гэта незнарок, не дзейнічалі. Прыйшлося зрабіць дыпламатычны ход: спытаць Ламу. Тая адказала двума пытаннямі: «Колькі каштуе чайнік з сервіза і адкуль у кватэры ўзяўся школьнік?» Усе доўга спрачаліся. Асалавелага школьніка адправілі спаць, а Ламу жанчыны вырашылі азнаёміць з медыцынскай і сексуальнай літаратурай.

Другі збой арганізаваў былы абсальвэнт Вышэйшай партыйнай школы. Пасля аднаго з выступленняў генеральнага сакратара ён прынёс Кароткі курс гісторыі КПСС. Гэтую кнігу далі прачытаць Ламе і спыталі, як прасіў абсальвэнт, што там няправільнае. Лама праз нейкі час адказала, што ў праграме партыі камуністаў няма маральнай асновы, таму ўсе яе дзеянні маюць негатыўны змест. З-за адсутнасці маралі гэтая партыя змарнавала жыцці каля сарака мільёнаў грамадзян. У барацьбе за абсалютную ўладу камуністы пазбаўлялі жыцця нават сваіх таварышаў. На якіх трыццаць год гэта стала нормай. Хрысціянская царква за семнаццаць вякоў знішчыла толькі семнаццаць мільёнаў ва ўсім свеце. А тут столькі — за такі кароткі час у адной дзяржаве! Абсальвэнт згадзіўся і даў пачытаць Навейшы курс гісторыі КПСС з крытыкай культу асобы, валюнтарызму, праграмай перабудовы і зноў захацеў уведаць, ці ёсць перспектывы ў камуністаў. Лама, доўга не думаючы, адказала, што ў злачынцаў сярод сумленных людзей ніколі не будзе перспектыў. Чалавек абурыўся: «Дык што, я таксама злачынец? Не, тут нешта вы падстроілі!» Гаспадарам стала ніякавата, вырашылі больш не кранаць палітычных праграм. Але неўзабаве зноў прыйшлося.

Неяк Беларускі народны фронт абвясціў мітынг. Надвор'е было ветранае, інтэлігенты заспрачаліся, ісці ці не ісці. Жанчыны прапанавалі спытаць у Ламы. Тая трохі пашумела і калі ёй дадаткова растлумачылі праграму БНФ, зноў спытала, што дасць мітынг. Ёй адказалі: «Гэта старадаўняя традыцыя, якая дазваляе выпрацаваць патрабаванні людзей да ўрада, пачуць розныя думкі і інтарэсы». Лама параіла выбраць прадстаўнікоў і даць наказ, яны зробяць гэта лепш і хутчэй. Ёй зноў сказалі, што такіх прадстаўнікоў ужо даўно выбралі, але яны не робяць тое, што трэба. Лама ўдакладніла: «У вас дзейнічае Вярхоўны Квазісавет, які не адпавядае інтарэсам людзей. Што з ім рабіць? Англічане, французы і немцы даўно гэта зрабілі, паразганялі каралёў, кайзераў і іх парламенты». Ёй адказалі, што ў нас зрабілі тое самае, але стала яшчэ горш. Як вырашыць праблему без крыві? Тая зноў выдала пытанне: «Хто трымае ўладу ў рэспубліцы сёння?» Ёй прынеслі кучу газет, часопісаў, нават «Правду» «Политический собеседник». Раздабылі тэлефонныя давед. нікі ЦК КПБ і Савета Міністраў за апошнія пяць гадоў. Далі пачытаць склад сённяшняга ўрада і Вярхоўнага Савета. Лама прыйшла да высновы, што ва ўрадзе дзейнічаюць адны і тыя ж людзі, называюцца яны толькі інакш. Гэты мадэрнізаваны ЦК КПБ праводзіць ранейшую палітыку з карупцыяй, пакланеннем Маскве і абрабаваннем народа. Трывалыя граніцы з мытняй, сваё войска, прыватная ўласнасць на зямлю, самастойна дзеючы парламент наўрад ці калі будзе. Лама ўпарта рэкамендавала французскі ці ангельскі варыянт перабудовы.

Усе паслухалі яе і панеслі, хаця і са спазненнем, тую інфармацыю на мітынг. Там вырашылі арганізаваць рэферэндум. Цяпер варта задумацца кожнаму, што нас чакае.

ЛіМ

Заснавальнікі:
САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
І МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах
Друкарня «Беларускі Дом друку».

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61; намеснік галоўнага рэдактара — 33-25-25; адказны сакратар — 33-19-85; аддзел публіцыстыкі: Міхась ЗАМСКІ — 33-19-65; аддзел пісьмаў і грамадскай думкі: Марыя ГІЛЕВІЧ — 33-19-85; аддзел літаратурнага жыцця: Алесь МАРЦІНОВІЧ — 33-24-62; аддзел крытыкі і бібліяграфіі: Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ — 33-22-04; аддзел літаратуры: Юрась СВІРКА — 33-22-04; аддзел музыкі: Святлана БЕРАСЦЕНЬ — 33-21-53; аддзел тэатра, кіно і тэлебачання: Жана ЛАШКЕВІЧ — 33-21-53; аддзел выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў: Пётра ВАСІЛЕЎСКІ — 33-24-62; аддзел навін: Віталь ТАРАС — 33-19-65; Юрась ЗАЛОСКА — 33-22-04; аддзел мастацкага афармлення: Уладзімір ТАБУШАЎ — 33-44-04; фотакарэспандэнт Уладзімір ПАНАДА — 33-24-62; бухгалтэрыя — 26-86-40.

Пры перадруку просьба спасылацца на «ЛіМ». Рукапісаў рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з думкамі і меркаваннямі аўтараў публікацый.

Нумар падпісаны ў друк 8.10.92 г. у 18.10.

Галоўны рэдактар Мікола ГІЛЬ.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Анатоль БУТЭВІЧ, Анатоль ВЯРЦІНСКІ, Андрэй ГАНЧАРОЎ (нам. галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Лілія ДАВІДОВІЧ, Міхась ДРЫНЕЎСКІ, Алесь ЖУК, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Юрась СВІРКА, Рычард СМОЛЬСКІ, Уладзімір СТАЛЬМАШОНАК, Віктар ТУРАЎ.

Адказны сакратар Барыс ПЯТРОВІЧ.

Індэкс 63856 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Тыраж 18068 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12